Віцебскі сшытак

ГІСТАРЫЧНЫ НАВУКОВА-ПАПУЛЯРНЫ АЛЬМАНАХ


6.

2019



Віцебскі сшытак

6. 2019



EYSA SAŁASIFYSZONA

HISTORYAS

SWATAS

WACA UN JAUNA

ISTODIUMA

AR MELI ŁATWISKU

NU

WINA BAZNICKUNGA

SARAKSTIEYTA.

W MOHILEWIE

w Drukarni J. W. J. X. Biſkupa

Białoruſk: Łacinſkiego.

Фундатары часопіса:
Моніка Банькоўскі-Цюліг (Швейцарыя),
Лідзія Леднік (Беларусь)

ГІСТАРЫЧНЫ НАВУКОВА-ПАПУЛЯРНЫ АЛЬМАНАХ

РЭДАКТАР
Людміла ***ХМЯЛЬНІЦКАЯ***

АЎТАР ІДЭІ ВОКЛАДКІ
Андрэй ***ВЯРЭНІЧ***



На беларускай і рускай мовах

vicebski.sshytak@tut.by

Выдаецца з 1995 года. Усяго выйшла шэсць нумароў

ЗМЕСТ

Войцех БАБЕРСКІ

З ГІСТОРЫІ КАСЦЁЛА БЕРНАРДЗІНЦАЎ У ВІЦЕБСКУ

При въезде в Витебск русский человек, в особенности едущий из внутренних губерний и незнакомый с западным краем, невзирая на представляющуюся взору его прекрасную панораму города, испытывает какое-то тяжкое, необъяснимое чувство. Пред ним белеет множество храмов Божьих, вознося златые кресты свои к небу... душа рвется к молитве... рука вздымается, чтобы сотворить крестное знамение... глаза ищут православный храм... но, увы! Римская архитектура скрывает его, и путник впадает в раздумье – где он: в православной ли России или в католической Польше? <…> Хорошо еще, если путник въехал в город не в тот час вечера, когда обычный раскатный звон костельного колокола оглашает город своим густыми и мерными звуками, а то он непременно назвал бы Витебск городом польским.

Александр Сементовский. Витебск.
Статистический очерк. 1865[1].

Згаданае меркаванне пабожнага сакратара губернскага статыстычнага камітэта не было адзіным. Горад, якім амаль стагоддзе кіравалі царскія чыноўнікі, зменены ў нацыянальных і канфесійных адносінах, захапляў і дражніў незвычайным нагрувашчваннем помнікаў сакральнай барочнай лацінскай, "рымскай" архітэктуры, што ўспрымалася як атрыбут чужой культуры і нацыянальнай свядомасці[2]. Недзе там, у ваколіцах Віцебска і Веліжа, праходзіла мяжа, якая падзяляла два розныя ўспрыманні і архітэктурныя іканасферы. У памятным 1812 г. да яе даходзілі на-

[1] *Сементовский А.М.* Витебск. Статистический очерк // Памятная книжка Витебской губернии на 1865 год. СПб., 1865. С. 123 – 124. Тагачасныя міжканфесійныя стасункі не павінны былі выклікаць неспакою: на самой справе ў 28-тысячнай супольнасці амаль палову складалі яўрэі, аднак 10 тысяч жыхароў служылі царкве і ў тры разы перавышалі лічбу католікаў; у такой жа прапорцыі знаходзілася веданне рускай і польскай моў. Рэпрэсіі пасля паўстанняў істотна змянілі прапорцыі ў кузні мясцовай эліты – славутай Аляксандраўскай гімназіі, дзе пасля 1863 г. лічба праваслаўных вучняў упершыню перавысіла лічбу католікаў.

[2] На працягу ўсяго аднаго няпоўнага стагоддзя, паміж Паўночнай вайной і напалеонаўскай кампаніяй, у Віцебску было пабудавана 35 святынь. Ажно 24 з іх былі мураваныя, палову з іх складалі пабудовы манументальныя, трохнефавыя. Правінцыяльны Віцебск меў тады не больш за 12 тысяч жыхароў, і ні адзін, нават значна большы і дынамічны ў архітэктурных адносінах асяродак Рэчы Паспалітай, не мог пахваліцца падобнай будаўнічай дынамікай.

[3] *Lejeune L.-F.* Memoirs of Baron Lejeune. Vol. II. Chapter V (http://www.napoleonic-literature.com/Book_26/Chapter_05.htm).

[4] *Жданов М.* Путевые записки по России в двадцати губерниях. СПб., 1843. С. 175.

[5] Рэпін набыў Здраўнёва ў траўні 1892 г. і перабудаваў паводле ўласнага праекта. Маляўнічая драўляная віла з вежаю згарэла ў 1994 г. і праз 6 гадоў была рэканструявана. Зараз тут знаходзіцца музей.

[6] *Шагал М.* Моя жизнь. Пер. с фр. Н.С. Мавлевич. М., 1994. С. 6. Мастак перабраўся з прадмесця Пескавацік у новы дом на Пакроўскай вуліцы ў Задзвінні.

палеонаўскія салдаты, якія апісвалі "радасныя панарамы, шматлікія касцёлы і вялізныя кляштары". "Калі 29 ліпеня я вярнуўся ў Віцебск, – успамінаў мастак Луі-Франсуа Лежон, – мяне надзвычай зачаравала маляўнічае палажэнне горада, які вырас над берагамі Дзвіны. Ранейшы агляд праз дым і полымя меў нейкую грозную веліч; зараз святло пагоднага дня ўзбагаціла яго лініямі і колерамі, што сустракаліся ўсё радзей падчас далейшага маршу да далёкіх раёнаў Поўначы"[3].

Захапленне і зачараванне асаблівасцямі горада падзялялі і знакамітыя расіяне. "Этот ландшафт есть один из лучших, виденных мною во время путешествия. <…> Архитектура церквей, большей частью католических, изящна, великолепна", – пісаў Міхаіл Жданаў, аўтар выдадзенага ў 1843 г. даведніка па 20 расійскіх губернях[4]. Вялікі мастак Ілля Рэпін, які ў 1892 – 1896 гадах праводзіў летнія месяцы на сваёй дачы Здраўнёва ў 15 кіламетрах на поўнач ад Віцебска, сталіцу губерні называў "рускім Таледа"[5]. Да мастацкіх асацыяцый адсылае нас самы славуты сёння віцяблянін Марк Шагал (Мошэ Сегал). У юнацкіх успамінах, прысвечаных "малому Парыжу", ён дзяліўся ўражаннем, якое аказаў на яго цэнтр, куды ён трапіў з прадмесця: "Вокруг церкви, заборы, лавки, синагоги, незамысловатые и вечные строения, как на фресках Джотто"[6].

"Город показался мне древним и не русским, – прызнаваўся малады герой аўтабіяграфічнай аповесці Івана Буніна, які даехаў у горад над Дзвіною зімой 1889 г. – Там,



Канвент бернардзінцаў у Віцебску на карце "Provincia Lituana Ord. S. Francisci O. Sdm Observationes…" (мал. Гірш Ляйбовіч, каля 1770 г.). MABR, сігн. К–779



Выгляд рынку з-пад ратушы. Акварэль Юзафа Пешкі. 1802 г.
Злева направа: крамы, касцёл і кляштар бернардзінцаў, царква і кляштар базыльянак, калегіум і касцёл езуітаў, Уваскрасенская царква ("Рынкавая"), крамы (заходняе крыло). Зборы LNBAN-WM, сігн. 215543

на вокзале в Витебске, в этом бесконечном ожидании поезда на Полоцк, я испытал чувство своей страшной отделенности от всего окружающего, удивление, непонимание". Пісьменнік, распавядаючы пра чужароднасць, меў на ўвазе не толькі выгляд натоўпу, які сунуўся па галоўнай вуліцы і ўключаў "полных девушек, наряженных с провинциальной еврейской пышностью. <…> За ними, но скромно, отдельно шли молодые люди, все в котелках, но тоже с пейсами, с девичьей нежностью и округлостью восточно-конфетных лиц, с шелковистой юношеской опушкой вдоль щек, с томными антилопьими взглядами". Самае вялікае ўражанне на Арсеньева-Буніна аказалі "высокие, в одно слитые дома с крутыми крышами, с небольшими окнами, с глубокими и грубыми полукруглыми воротами в нижних этажах", а перад усім – вечаровы візіт у касцёл Св. Антонія, "желтый костел с двумя звонницами", які адзіны быў пакінуты католікам у цэнтры горада, і там гучаў арган[7].

Старажытная бернардзінская святыня і кляштарныя гмахі выконвалі ролю ўсходняга крыла рынку на Узгор'і (каля Ратушнай плошчы), суадносячыся з фасадам Уваскрасенскай царквы і галерэяй бліжэйшых крам. Калі глядзець з моста праз Віцьбу, яны ўтваралі правую кулісу эфектнай урбаністычнай сцэнаграфіі трапецападобнай плошчы, што строма ўзносілася ад ракі ў накірунку да ратушы. Дзвесце гадоў без перапынку яны служылі католікам, формай і функцыяй адзначаючы прысутнасць польскай супольнасці[8]. Таксама сярод аматараў даўніны і гісторыкаў мастацтва згаданая форма ўзбуджала цікавасць сваёй адметнасцю. Увага звярталася на разлегласць фасада і прапорцыі будынка, якія адрознівалі іх ад стромых, ажурных канструкцый, распаўсюджаных у познебарочнай сакральный архітэктуры Вялікага Княства Літоўскага. Семянтоўскі сцвярджаў, што "вообще, наружность его [касцёла Св. Антонія – *перакл.*] имеет весьма много общего с другими храмами Витебска, но притом отличается некоторою тяжестию"[9], а, каментуючы малюнак Аляксандра Мінята, рэдактар "Tygodnika Powszechnego" (1884) дзяліўся меркаваннем, што будынак "сваёй вонкавай структурай нагадвае касцёл Св. Крыжа ў Варшаве, у чым лёгка пераканацца з першага погляду"[10]. Гарызантальнасць бернардзінскага касцёла падкрэслівала таксама Алена Квітніцкая, якая ў форме вежаў і завяршэння ўбачыла рысы "віленскага барока"[11]. Паўтарыўшы яе меркаванне,

[7] *Бунин И.* Жизнь Арсеньева. СПб., 2004. С. 314 – 315. Кніга была напісана ў 1927–1933 гг. і садзейнічала атрыманню пісьменнікам Нобелеўскай прэміі ў 1933 г.

[8] У другой палове XIX ст. палякі ўтваралі ў Віцебску адносна невялікую (каля 10 %), але актыўную і прыкметную групу жыхароў. Іх можна было сустрэць у адвакатуры і рамёствах, сельскагаспадарчых і крэдытных таварыствах. Яны арганізоўвалі выставы, аматарскія прадстаўленні, канцэрты і чытанні. Польскі элемент запаўняў два пакінутыя католікам касцёлы (Св. Антонія і Св. Барбары), сустракаўся ў найлепшым у горадзе гатэлі, які належаў швейцарцу Генрыху Хрысціяну Бразі, а, кажучы дакладней, у кандытарскай майстроў Жана і Альберта (Jana Ziomka i Albera Gede), якія прыбылі з Варшавы і ў якіх можна было набыць пышныя "кракаўскія", "варшаўскія", "люблінскія" і "пулаўскія" піроржныя, а таксама пагартаць якую-небудзь з чатырох падпісных польскіх газет. Вялікім аўтарытэтам карыстаўся Сігізмунд Юркоўскі, "кароль віцебскай фатаграфіі" і вядомы ў Еўропе вынаходнік шчыліннага затвора, які з 1866 г. увекавечваў прыгажосць горада. Стараннем братоў Цеханавецкіх з'явіўся першы гарадскі вадаправод і сучасная служба пажарнай аховы. З пачатку XX ст. важнае месца ў мастацкім жыцці займаў Вацлаў Бубноўскі, вучань Матэйкі, вядомы дэкаратыўнымі працамі ў варшаўскіх касцёлах, а таксама Канстанцін Змігродскі – скульптар-сімваліст, захавальнік музея Віцебскай архіўнай камісіі. Рухавіком польскага жыцця быў адвакат Вацлаў Федаровіч, сябра-карэспандэнт Кракаўскай Акадэміі мастацтваў, калекцыянер старапольскіх і беларускіх помнікаў. Яго зборы, дапоўненыя творамі мастацтва і нумізматыкай, прывезенымі з Вільні інжынерам Антоніем Брадоўскім, далі магчымасць стварыць краязнаўчы музей, які быў адчынены ў 1918 г. у будынку ратушы. Побач са звычайнай працай у Віцебску таксама надараліся больш відовішчныя выпадкі. Нагодай для іх былі, між іншым, візіты Элізы Ажэшкі, арганізаваныя яе прыяцелькай Тэрэзай Чарвінскай, уладаркай адной з польскіх бібліятэк.



Выгляд рынку ад езуіцкага моста. Фрагмент акварэлі Юзафа Пешкі. 1802 г. Злева направа: Уваскрасенская царква ("Рынкавая"), ратуша, касцёл і кляштар бернардзінцаў (за імі – гаспадарчыя будынкі з двухпавярховым свірнам). Зборы LNBAN-WM, сігн. 215544

Тамара Габрусь прыпісала аўтарства касцёла архітэктару Юзафу Фантане III, якога абвясціла, разам з Янам Крыштафам Глаўбіцам, самым выдатным прадстаўніком згаданага накірунку і, абапіраючыся на мастацкія вартасці, тую ж самую атрыбуцыю аднесла і да суседняй Уваскрасенскай царквы – славутай "Уваскрэсенкі"[12].

Муры касцёла Св. Антонія зніклі з паверхні зямлі 55 гадоў таму назад, падзяляючы лёсы іншых віцебскіх святынь. Адносна вялікая колькасць нявыкарыстаных архіўных і іканаграфічных крыніц дазваляе вызначыць акалічнасці іх з'яўлення[13].

Драўляныя пабудовы

Фундатар кляштара, віцебскі ваявода Ян Антоній Храпавіцкі (герба Газвада)[14], паходзіў з сям'і, звязанай з горадам з паловы XVI ст., яна традыцыйна падтрымлівала мясцовы кальвінізм. Яго прадзед, харужы віцебскі Фёдар, атрымаў значныя ўладанні ў часы ваяводы Стэфана Збараскага. Яго дзед, харужы віцебскі Іван, валодаў домам у Ніжнім замку за царквой Св. Пятніцы (1595)[15]. Бацька будучага ваяводы, стольнік віцебскі Крыштаф, меў на Узгор'і вялікую юрыдыку, а таксама двор у Верхнім замку. У шэрагу замкавых умацаванняў зна-

---

[9] *Сементовский А.М.* Витебск. Статистический очерк. С. 193.


[10] Tygodnik Powszechny. 1884. № 33. S. 221.

[11] *Квитницкая Е.Д.* Приемы формирования торгово-административного центра Витебска в XVIII в. // Архитектурное наследство. 1974. №. 22. С. 142.

[12] *Габрусь Т.В.* Мураваныя харалы. Сакральная архітэктура беларускага барока. Мінск, 2001. С. 239 – 241.

[13] Вялікую ўдзячнасць выказваю праф. Анджэю Бетлею, праф. Ежы Кавальчыку, паням Вользе Кукуні і Святлане Адамовіч, пану Уладзіміру Дзянісаву за дапамогу ў зборы і пошуку копій архіўных матэрыялаў. Літаратуру, якая тычыцца гісторыі канвенту, сабраў айцец Каэтан Грудзіньскі: Witebsk. У кн.: Klasztory bernardyńskie w Polsce w jej granicach historycznych. Pod red. ks. Hieronima Wyczawskiego. Kalwaria Zebrzydowska, 1985. S. 440 – 441.





Фасад і план першага паверха бернардзінскіх будынкаў.
Абмеры 1839 г. з РДВГА, ф. 349, воп. 8, спр. 1433, арк. 10, 12.
Рэпр. паводле Габрусь 1998. С. 95 – 96



Рынкавая плошча. Фота 1867 г.

ходзілася Храпавіцкая вежа[16]. Стольнік меў пяцёра сыноў, якія паспяхова перайшлі ў каталіцызм. Ян Антоній зрабіў гэта ў студзені 1637 г. ля магілы св. Антонія ў Падуі, чым, відаць, можна вытлумачыць выбар патрона для віцебскай святыні. Падобна на тое, што адначасова з Янам змяніў веру і яго родны брат Францішак, які праз год у Вільні ўступіў у ордэн бернардзінцаў і ўжо як дэфінітар і правінцыял (Малапольска-Літоўскай правінцыі) стаў ініцыятарам фундацыі над Дзвіною[17].

Перад гэтым у Віцебску з'явіліся францысканцы. Яны прыбылі хутка пасля адыходу маскоўскіх войск (1667) з канвента ў недалёкім Сянно[18] і пасяліліся ў камяніцы (lapidae), што называлася Пятравічанка, або Пятроўская, якая была ўзведзена ў 1647 г. на Узгор'і ва ўсходнім крыле рынку бурмістрам Пятровічам[19]. Уладкавалі ў ёй сціплую капліцу і, відаць, планавалі закласці канвент, аднак плацдарма ўтрымаць не ўдалося, уладар бліжняй юрыдыкі пасля параднага ўезду ў сталіцу ваяводства (1671) ужо меў выразна акрэсленыя намеры ў адносінах да маладога аскалёпка францысканскага ордэна. Працэс эксмісіі францысканцаў, распачаты ў нунцыятуры, цягнуўся як

[14] У 1646 – 1653 гг. Ян Храпавіцкі (як падкаморы смаленскі) клапаціўся пра аднаўленне замка ў Смаленску. Пасля 1661 г. удзельнічаў у перамовах, якія скончыліся трактатам у Андрусаве. У 1669 г. стаў віцебскім ваяводам (першым у родзе сенатарам) і пасля ўрачыстага ўезду ў горад (5.II.1671) усталяваў парадкі пасля маскоўскай акупацыі. Крыніцай яго біяграфіі з'яўляюцца мемуары, гл.: Jan Antoni Chrapowicki. Dyaryusz wojewody witepskiego Jana Antoniego Chrapowickiego jako przyczynek do dziejów z czasów Jana Kazimierza, Michała Wiszniowieckiego i Jana Sobieckiego, królów polskich. Wyd. Józef Rusiecki. Warszawa, 1845; Jan Antoni Chrapowicki. Diariusz. Cz. 1 – 2. Oprac. Andrzej Rachuba i Tadeusz Wasilewski. Warszawa, 1969–1988; Ryszard Mienicki. Chrapowicki Jan Antoni // Polski Słownik Biograficzny. T. 3. 1937. S. 437 – 439.

[15] Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской, хранящиеся в Центральном архиве в Витебске (далее – ИЮМ). Т. 20. Витебск, 1890. С. 505, 509.

[16] *Сапунов А.* Витебская старина. Т. 1. Витебск, 1883. № 155: Инвентарь всего е. к. в. города Витебска с принадлежащими ему некоторыми доходными статьями, списанный дворянином Ярошем Мацкевичем, 1641 года, ноября 2 дня, при даровании Магдебургского права. Храпавіцкую вежу сярод умацаванняў Верхняга замка фіксуе таксама вядомы "Чарцёж горада Віцебска", выкананы расіянамі ў 1664 г.



Касцёл Св. Антонія і былы кляштар бернардзінцаў. Акварэль Напалеона Орды. Каля 1875 г. Нацыянальны музей, Кракаў. III-r.a. 4125

мінімум ад пачатку 1675 г. і скончыўся летам наступнага года. Афіцыяльная інтрамісія бернардзінцаў адбылася 8.IX.1676 г.[20] Складзенае на тры дні раней "Апісанне капліцы" дае магчымасць азнаёміцца са станам уладання ордэна, якое знаходзілася паміж вуліцай Вялікай Рынкавай і ракой Віцьбай. Адсюль можна даведацца, што падвальная святыня мела шэсць акон і музычныя хоры з дрэва. За выключэннем алтарнай менсы і лавак начынне ў ёй адсутнічала. З боку вуліцы яна суседнічала з дзвюма крамамі. Паміж камяніцай і ракой знаходзіліся вялікі двухпавярховы свіран і агарод, усё заняпалае і занядбанае[21].

Сейм, які засядаў у Варшаве, пацвердзіў фундацыю ваяводы 14.I.1677 г.[22] У дакуменце, які быў датаваны тым самым годам, Храпавіцкі згадваў ужо ўзведзеныя касцёл і кляштар, а таксама акрэсліваў межы пляцаў, што былі набыты паводле вячыстага права і ахвяраваны канвенту. Бернардзінцы атрымалі вялікі кавалак Узгор'я, які расцягнуўся паміж Віцьбай і вуліцай Вялікай, пачынаючы ад езуіцкага млына і моста на поўдні ажно да царквы Св. Мікалая на поўначы[23]. Дакумент не браў пад увагу карысці, якая палягала на знаходжанні канвента ля гандлёвага пляца, дзе ад веку канцэнтравалася гарадское жыццё.

[17] Францішак Храпавіцкі (1614 – 1683) быў гвардыянам у Друі, Будславе, Слуцку і Глуску, захавальнікам у Вільні (1671–1674) і, нарэшце, правінцыялам (1677–1680). Гл.: Ks. Kamil Kantak. Franciszkanie polscy. T. II. 1517–1795. Kraków, 1938. S. 161–162. Яшчэ адзін брат ваяводы, стольнік віцебскі Дамінік, быў дабрадзеем калегіума віцебскіх езуітаў і пахаваны ў іх касцёле. Гл.: ИЮМ. Т. 21. № 97. С. 310 (тастамент ад 5.IX.1655). Брат Юзаф (памёр у 1684 г.), віцебскі харужы і падваявода, яшчэ ў 1673 г. заставаўся кальвіністам. Гл.: *Marzena Liedke.* Szlachta ruska Wielkiego Księstwa Litewskiego a reformacja. Cz. 1 // Białoruskie Zeszyty Historyczne 18. 2002. S. 41 – 43. Храпавіцкія былі звязаны з Віцебскам таксама ў XIX ст. Брыгадзір Храпавіцкі здаваў горад арміі Напалеона. Міхал Пётр Храпавіцкі пасля паўстання 1863 г. быў начальнікам шляхты.

[18] Заснаваны ў 1608 г. канвент у Сянно быў самай ранняй пляцоўкай францысканцаў на паўночнаўсходніх землях Рэчы Паспалітай. Наступныя фундацыі – Лукомль (1636), Дзісна (1640), Полацк (1648), Орша (1680), Губін (1714), Серафін (1762) і Сакольнікі (1771) – утваралі разам з ім Полацкую кантрату Літоўскай правінцыі.

[19] Mokslų Akademijos Centrinės Bibliotekos Rankraštynas (Вільнюс, далей – MABR), 43 – 23205, к. 8: Кантракт на ўзвядзенне трох дамоў у Віцебску віцебскім бурмістрам Пятровічам (1647).

Суседства давала бернардзінцам сталы прыбытак ад арэнды гандлёвых плошчаў. Апроч таго ў арэнду здаваўся абшар, які спускаўся да ракі з поўдня і ў XIX ст. насіў назву "Падлогі".

Першыя драўляныя пабудовы, узведзеныя ў 1676 – 1677 гг., сталі ахвярай пажару, які знішчыў Узгор'е ў верасні 1680 г. Яшчэ перад смерцю ваяводы (1685) быў адноўлены фундуш на пляц і ўзведзены новыя драўляныя будынкі[24]. Яны пратрымаліся да 28.IX.1708 г., калі па загаду Пятра I калмыцка-казацкая экспедыцыя пусціла з дымам "усе замкі і горад, ратушу і крамы, Узгор'е, Заручаўе і Задунаўе, чатыры касцёлы і дванаццаць цэркваў <…>"[25].

Пасля Паўночнай вайны бернардзінцы знаходзіліся пад патранатам сям'і Шапак-Хатольскіх, якія загадалі хаваць сябе ў ордэнскай крыпце. Войскім віцебскім Міхаілу і Эльжбеце з Мянчынскіх (у першым шлюбе Сапезе) манахі былі абавязаны ўзвядзеннем чарговай драўлянай святыні. У 1730 г. яны атрымалі ад іх гарадскую юрыдыку і квоту ў 6000 злотых, брат жа войскага, стражнік віцебскі Вацлаў Шапка, і яго жонка Марыяна з Багамольцаў ахвяравалі кляштару 2000 злотых і даходы з маёнтка Холхал[26]. Аб форме драўляных касцёлаў нам нічога не вядома. Можна толькі дапусціць, што, як і ў іншых бернардзінскіх канвентах, у Віцебску таксама былі ўсталяваны прыпынкі Крыжовага шляху[27]. Святыня, узведзеная Шапкамі і асвечаная біскупам, суфраганам віленскім Ежы Анцутам 18.VIII.1731 г.[28], не прастаяла доўга. Катастрофа, якая здарылася праз няпоўныя два гады падчас прац па яе аздабленні, выйшла далёка за межы кляштара. Летапісец занатаваў, што "року 1733, траўня 31, у актаву Божага

[20] Нацыяльны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ), 1781 – 26 – 1407, арк. 6: Дакументы, даўгавыя запісы і занатоўкі Віцебскага кляштара ксяндзоў бернардзінцаў (1820). Выгнаныя францысканцы яшчэ 6 гадоў пасля эксмісіі вялі спрэчку з ваяводам у Віленскай кансісторыі, нунцыятуры і нават у Рыме. "Адмова францысканцаў ад ўсялякіх прэтэнзій на камяніцу" адбылася ў 1682 г.

[21] Archiwum Prowincji oo. Bernardynów (Кракаў, далей – АРВ), S-wit-1: Akta klasztoru bernardynów w Witebsku. S. 373 – 374: Апісанне пасля ад'езду ксяндзоў францысканцаў капліцы і будынкаў, што да яе належаць, у Віцебску (5.X.1676).

[22] НГАБ, 1781 – 26 – 1407, арк. 6 – 7.

[23] АРВ, S-wit-1, k. 1 – 2: Акт фундацыі кляштара бернардзінцаў у Віцебску (1676). "<…> Пачаўшы ад ракі Віцьбы насупраць запруды і млына ў вялебных ксяндзоў езуітаў Віцебскага калегіума, ідучы вуліцай, якая раней называлася Гавегнай, а зараз нанова з панамі мяшчанамі горада Віцебска мяжуючая, недалёка ад моста з замка віцебскага Ніжняга да віцебскага Узгор'я, праз горад пабудаванага, <…> на вуліцы Вялікай, якая ўгару паміж крамамі ідзе, ідучы па правым баку з камяніцай (выключаючы некаторыя гарадскія крамы з месцамі і зямлёю пад тымі крамамі) ажно да дамоў і пляцаў без агародаў віцебскіх мяшчан юрыдыкі метрапаліта: Пятра Пятровіча рымара і за ім Шчаснага Ляўданскага, дамы і пляцы якіх ля вуліцы. За іх дамамі ззаду пляцы ажно да самай ракі Віцьбы ў права ўзяўшы маё, канвенту вялебных айцоў бернардзінцаў належаць. І тут заканчваецца мяжа з пляцам, які раней называўся Шаркоўскім злотніцкім, а зараз [належыць] вялебнаму веліжскаму святару Самуэлю Ангілеўку, на гэтым пляцы і царква Св. Мікалая заснавана <…>".

[24] НГАБ, 1781 – 26 – 1407, арк. 6 адв. – 7: Фундуш Я.А. Храпавіцкага з абмежаваннем набытых ім пляцаў (25.IX.1685).

[25] "Хроніка горада Віцебска", напісаная Міхалам Панцырным і Стэфанам Аверкам. У кн.: Полное собрание русских летописей (далей – ПСРЛ). Т. 32. М., 1975. С. 21 об.; *Сапунов А.* Витебская старина. Т. 1. С. 466. Апроч Віцебска ў верасні 1708 г. атрад пад камандаваннем капітана Салаўёва і маёра Шышкіна спаліў таксама Мінск, Магілёў, Оршу, Мсціслаў, Быхаў і Дуброўну.

[26] АРВ, S-wit-1. S. 81: Тастамент Вацлава Шапкі (18.VII.1730); S. 89 – 90: Завераная копія запісу Міхала Шапкі (1731); S. 97, 105, 117, 133, 159: Чарговыя версіі тастамента яго жонкі Эльжбеты з Мянчынскіх, складзеныя ў 1730 – 1737 гадах; НГАБ, 1781 – 26 – 1395, арк. 58 (Акт візітацыі ад 15.X.1818); НГАБ, 1781 – 26 – 1411, арк. 52 (Акт візітацыі 22.X.1823).

[27] НГАБ, 1781–26–1407, арк. 6 адв.: Канстытуцыя Бенедыкта XIV на свята шляху Крыжа Святога пры прыпынках (3.III.1727).



Касцёл Св. Антонія і былы будынак кляштара бернардзінцаў. Фота пачатку XX ст.

Цела, горад Віцебск, рынак, крамы і цэрквы загарэліся ад вялебных айцоў бернардзінцаў, якія рабілі арган і зайгралі на ўвесь свет”[29]. Яшчэ адна летапісная рэляцыя дакладна акрэслівае вынікі той палымянай “музыкі”: “У 1733 годзе, у чацвер 31 траўня Пан Бог пакараў агнём. Пачалося ад бернардзінцаў з касцёла, і царква Рынкавая Уваскрасенская і Увядзенская і Падзвінне і крамы спаліў і царкву Саборную, і дамы я[снавяльможнага] п[ана] Лыткі, я[снавяльможнай] п[ані] Лагошынай і я[снавяльможнага] п[ана] Габрыеля Аверкі і вяльм[ожнага] ягамосці пана Ежы Лускіны, усіх дамоў 200 <…> ажно да самага канала”[30]. Катаклізм апісала нават варшаўская прэса[31]. Пасля яго бернардзінцы знайшлі часовае ўкрыццё за Віцьбай, у калегіуме езуітаў[32].

Будаўніцтва касцёла

Фундатарам мураванага касцёла быў падкаморы віцебскі Казімір Саковіч, “вялікі прыяцель ягамосці пана ваяводы [Марцыяна Агінскага]”[33], які жыў у той час у яго доме на Ніжнім замку[34]. Бернардзінцам ён дапамагаў яшчэ раней (1728, 1733)[35]. Апроч таго быў дабрадзеем віцебскіх і віленскіх езуітаў, а перад усім аршанскіх трынітарыяў, якім у 1725 – 1735 гг. фінансаваў будаўніцтва мураванай святыні, стварыўшы ў яе крыпце сямейны маўзалей[36]. Жаданне пабудаваць касцёл бернардзінцаў (у падзяку за невядомую ласку) падкаморы пацвердзіў у тастаменце, напісаным 20.II.1736 г.: “Касцёл ягамосцяў ксяндзоў бернардзінцаў віцебскіх у імя св. Антонія, калі б мне самому не прыйшлося вымураваць паводле майго

[28] Kuryer Polski. 1731. Nr. XC. S. 387 – 388: Карэспандэнцыя ад 22.VIII.1731. Быццам бы ў верасні 1731 г. біскуп Анцута асвяціў у Віцебску таксама мураваны касцёл езуітаў і драўляны касцёл дамініканцаў. Год асвячэння быў важнай датай для літоўскіх бернардзінцаў. Адлучаныя ад малапольскіх, яны ўтварылі ўласную правінцыю, якая налічвала 27 кляштараў.

[29] “Хроніка горада Віцебска”. С. 24.

[30] Biblioteka PAU w Krakowie (далей – BPAU), rkps. 3143: Прывілей горада Віцебска. Арк. 277.

[31] Kuryer Polski. 1733. Nr. CLXXXV. S. 441: Карэспандэнцыя з Магілёва (20.IV.1733).

[32] *Stanisław Załęski T.J.* Jezuici w Polsce. T. IV. Cz. 3. Kraków, 1905. S. 1417.

[33] Kuryer Polski. 1731. Nr. LXXVIII. S. 339: Карэспандэнцыя з Віцебска (30.V.1731).

[34] Саковіч атрымаў дом ад ваяводы, які аддаваў перавагу пражыванню ў прыгарадных Лукішках або ў недалёкім Марцыянаве. Перад смерцю адпісаў яго свайму хрэсніку Тадэвушу Агінскаму. Гл.: ИЮМ. Т. 18. № 65. С. 337 – 354: Тастамент Марцыяна Агінскага (15. VII.1744).

[35] НГАБ, 1781 – 26 – 1407, арк 7: Легат Казіміра Саковіча (40 дукатаў або 600 рублёў) на адпраўленне бернардзінцамі імшы ў Тадуліне (6.IX.1728); АРВ, S-wit-1. S. 257 (Сумы, ахвяраваныя бернардзінцам у 1728 і 1733 гг.).

жадання, пакідаю на тое даўгавую распіску яснавяльможнага ягамосці пана Аляксандра Пацея, падчашага ВКЛ на чатыры тысячы талераў бітых, пазыкаю ад мяне ўзятых. <…> Калі б здароўе жонкі [Тэклі Ганны з Лярскіх, дачкі суддзі аршанскага] дазволіла ўпрыгожыць віцебскі мураваны бернардзінскі касцёл, на які прызначаецца дэклараваная мною фундацыя, тады прашу прызначыць ёй на гэта маёнтак Дрычалукі [Dreczułki]”[37].

Некаторыя будаўнічыя працы пачаліся яшчэ пры жыцці падкаморага, які памёр неўзабаве пасля складання тастамента (17.X.1736 г. і быў пахаваны ў Оршы). Пад гэтым годам гарадскі летапісец занатаваў, што “касцёл пачалі мураваць ксяндзы віцебскія бернардзінцы ў самым рынку, у горадзе Віцебску”. У наступным годзе кляштарная каса папоўнілася сумай у 1400 талераў бітых, якую віцебскія радцы вярнулі гвардыяну Юзафу Міхлерскаму (магчыма, за арэнду пляцаў і крамаў)[38]. Магло б падацца, што будоўля распачалася паспяхова (аб чым згодна пішуць усе аўтары), аднак знаёмства з іншымі крыніцамі схіляе да думкі, што, напэўна, прыспешаны смерцю фундатара, пачатак будаўніцтва мог мець характар выключна сімвалічны. Бо будоўля пачалася толькі на шэсць гадоў пазней, калі з’явіўся архітэктар і былі зроблены новыя праекты.

Імпульсам да пачатку будаўніцтва стаў шлюб ваяводы Марцыяна Агінскага, які пасля смерці сваёй трэцяй жонкі ажаніўся са згаданай удавой-падкаморынай Тэкляй Ганнай Лярскай, якая ўжо два разы была замужам, у першым шлюбе за Галінскім, у другім – за Саковічам. У дом Агінскіх яна прынесла фундатарскія абавязкі ў адносінах да бернардзінцаў. 10.II.1742 г. новая жонка ваяводы і яе апекуны, пасынак Тадэвуш



Фасад касцёла Св. Антонія. Паштоўка каля 1910 г.

Агінскі (на той час пісар літоўскі) і пісар земскі віцебскі Казімір Гурка, заключылі ў Вільні кантракт з “Юзафам Фантанай, архітэктарам Яго Каралеўскай Міласці”, які абяцаў скончыць будоўлю касцёла “паводле дадзенага ад сябе абрысу” і “фундатарцы толькі аддаць ключы пасля заканчэння” (Дадатак I)[39]. Паводле кантракта малады, на той час дваццацічатырохгадовы архітэктар браў на сябе вярбоўку “ўсіх патрэбных на будоўлі рамеснікаў”, затое інвестар дэкляраваў забяспечыць усе патрэбныя матэрыялы. За панесеныя выдаткі і асабістую працу Фантане абяцана было выплаціць 3000 талераў (1000 талераў бітых па кантракце, а належная сума выплочвалася часткамі ў адпаведнасці са станам фінансавання будоўлі). Згадвалася пры гэтым адказнасць за “новазакладзеныя падмуркі”, таму варта дапусціць, што да таго часу іх яшчэ цалкам не вывелі[40]. Зрэшты, не толькі змест умовы прымушае ўдакладніць прадстаўленую летапісцам дату пачатку

[36] У Оршы Саковіч узяў на сябе абавязкі фундатара пасля стрыечнага брата, суддзі гродскага трокскага Адама Уладзіслава, які загінуў у 1717 г. у тарнагродскай канфедэрацыі. Пабудаваная святыня адсылала да касцёла ў падвіленскім Трынопалі і ў плане прадстаўляла аддаленае эха мацярынскага San Carlino. Грунтоўна перабудаваны на сабор, храм прастаяў да 1957 г.

[37] АРВ, S-wit-1. S. 23 – 34: Выпіска з гродскіх кніг тастамента Казіміра Саковіча (16.III.1736). Выканаўцамі тастамента Саковіч прызначыў свайго хрэсніка Тадэвуша Агінскага (на той час старосту перавальскага) і пісара земскага віцебскага Казіміра Гурку.

[38] Хроніка горада Віцебска. С. 24 – 24 адв., 36 адв.



Завулак на паўночным баку касцёла. Карціна Марка Шагала. Віцебскі базар. 1917 г. Метраполітэн Музеум, Нью-Йорк

будоўлі. Так, у 1742 – 1744 гг., ужо пасля прадстаўлення новага праекта, чарговы гвардыян, айцец Адрыян Себасціянскі, “для патрэбы мураванага касцёла вялебных айцоў бернардзінцаў, які нанова фундуецца <…>, з-за недахопу месца для будоўлі <…>, без чаго будаўніцтва касцёла не можа быць фундавана”, набываў шматлікія “памежныя пляцы ў Верхнім Радзе” (гэта былі невялікія надзелы, якія не перавышалі 6 х 4,5 віленскія локці, гэта значыць, каля 4 х 3 метры), дабіваючыся “моцы на тым грунце закласці касцёл і будаваць без ніякай ад нікога перашкоды”[41].

Першая частка грошай была выплачана Фантане 24.І.1743 г., і працы, відаць, пачаліся вясною[42]. У 1744 – 1747 гг. пры пасрэдніцтве гвардыяна Себасціянскага і кіраўніцтве ваяводы архітэктар атрымаў “згодна кантракту” са скарбу Тэклі Агінскай

[39] Падобна на тое, што ў тым самым 1742 г. Юзаф Фантана быў заняты іншым заказам ваяводы Марцыяна Агінскага – санктуарыем у Бялынічах. Гл.: *Boberski W.* Maryjne sanktuarium karmelitów w Białyniczach. Architektura i sztuka Białoruskiej Częstochowy // Sztuka kresów wschodnich. T. 6. Pod red. Andrzeja Betleja i Piotra Krasnego. Kraków, 2006. S. 94 – 154. Пра архітэктара Юзафа Фантану “віцебскага” гл. таксама: *Boberski W.* Fontana Józef (1716 – ok. 1772). [W.]: Allgemeines Künstler-Lexikon. Bd. 42. München – Leipzig, K. G. Saur, 2004. S. 127 – 128; *Boberski W.* Dzieje fary w Witebsku i jej architektoniczne przemiany // Sztuka kresów wschodnich. T. 4. Pod red. Andrzeja Betleja i Piotra Krasnego. Kraków, 1999. S. 33 – 60; *Boberski W.* Późnobarokowa cerkiew katedralna w Witebsku i jej rzymski pierwowzór // Biuletyn Historii Sztuki 62. 2000. Nr. 1 – 2. S. 105 – 152; *Boberski W.* Architektura kościoła i kolegium jezuitów w Witebsku // Roczniki Humanistyczne KUL. T. 50. 2002. Z. 4. S. 323 – 366; *Boberski W.* Kresowe Toledo // Na Poważnie. Miesięcznik o Polsce, historii i kulturze. 2012. Nr. 1 – 2. S. 110 – 113.

[40] АРВ, S-wit-1. S. 43: Кантракт, заключаны ў Вільні з Юзафам Фантанай на заканчэнне пабудовы касцёла. 15.XII.1744 г. дамова ўпісана ў віцебскія гродскія кнігі ў прысутнасці крайчага літоўскага і падваяводы віцебскага Мікалая Антонія Рэута; гл.: АРВ, S-wit-1. S. 47 – 50.

[41] ИЮМ. Т. 18. № 55 – 61. С. 300 – 328.

[42] “<…> атрымаў ад Богу вялебнага ягамосці ксяндза Адрыяна Себасціянскага па моцы кантракта першую частку ў суме тысячу талераў, у чым падпісваюся, Юзаф Фантана” (24.І.1743); “Таксама на другі год выбраў згодна кантракта на будаўніцтва касцёла <…> суму ў двесце семдзесят сем талераў бітых” (20.X.1744) – уласнаручныя допісы архітэктара на копіі кантракта, гл.: АРВ, S-wit-1. S. 49 – 50.

[43] АРВ, S-wit-1. S. 43 – 44, 55 – 56, 58 v; гадавыя выплаты, звычайна ў колькасці 300 талераў бітых, Фантана атрымліваў праз пасрэдніцтва харужага Бжэзінскага (1745), генеральнага камісара ўладанняў ваяводы Марцыяна Агінскага Міхала Кушлеўскага (1746 – 1747), кс. Міхлерскага (1747) і ад кс. рэктара (1747).

адпаведна меншыя выплаты, якія склалі суму ў 2562 талеры бітых[43]. 10.IX.1747 г. "на плату рамеснікам, што працуюць на будаўніцтве касцёла вялебных ягамосцяў ксяндзоў бернардзінцаў", ад Міхала Кушалеўскага, эканома Тэклі Агінскай, 50 талераў бітых атрымаў не Фантана, а нейкі "Людвік Флядрыскі" – быць можа, майстар, які кіраваў працамі[44]. Летам 1749 г. праца ля муроў набліжалася да канца. Архітэктар асабіста закупіў тады шасцісажневыя бярвенні для завяршэння даху[45] і штотыдзень праводзіў разлікі не толькі з муршчыкамі і памочнікамі, але таксама з цеслярамі, шклярам і кавалём[46]. Разам выдаткі на выканаўцаў у 1743 – 1749 гг. наблізіліся да дэклараванай у кантракце сумы 3000 талераў бітых.

Пасля смерці ваяводы Агінскага (1750)[47] тэмп прац выразна зменшыўся. Удава не заўсёды выконвала абавязацельствы і нават сама, "маючы пільную патрэбу ў грошах", задаўжала кляштару[48]. Нарэшце яна пакінула Віцебск і ўступіла ў кляштар брыгітак у Гродне. Нягледзячы на тое, што ўжо пад канец 1748 г. канвент атрымаў папскі прывілей на "адзін алтар са штодзённым адпустам"[49], а ў 1752 г. пасля вераснёўскага пажара віцебскіх замкаў "ягамосці ксяндзы езуіты і дамініканцы ў ягамосцяў ксяндзоў бернардзінцаў мусілі праводзіць набажэнствы"[50], ні ў 1755 г., што згадваўся ў візітацыях як дата заканчэння святыні, ні нават падчас кансекрацыі, выкананай 4.XII.1768 г. суфраганам "Белай Русі", эксфранцішканцам Феліксам Тавяньскім, інвестыцыя не была да канца рэалізавана[51]. Магчыма, гэта адбылося толькі ў палове 70-х гадоў XVIII ст. Першымі гадамі пасля падзелу Рэчы Паспалітай варта было б датаваць узвядзенне верхніх ярусаў вежаў і шчыта фасада. Прычыны спазнення, а таксама акалічнасці аднаўлення будоўлі падрабязна апісаў свайму правінцыялу гвардыян Эрык Бабятыньскі ў лісце, напісаным 3.IX.1780 г.:

"З боку былой ваяводзіны, а зараз Богу вялебнай брыгіткі трэба бачыць, што такую маем справу: светлай памяці ваявода прадпісаў ёй будоўлю, тады падкамаранка, якая была абавязана і мела шмат магчымасцяў, люба касцёл вымуравала, але не скончыла і не ўладкавала, бо пакінула без вежаў і фасада, і так гэты не скончаны касцёл стаяў 40 гадоў [падобна на тое, што гвардыян адлічвае гэты тэрмін ад моманту закладкі вуглавога каменя ў 1736 г.]. Толькі калі я ў першы раз у мінулых гадах стаў у Віцебску гвардыянам [пасля 1768 г.], маючы прыкрасць ад яснавяльможнага пана Жабы [відаць, размова ідзе пра суддзю гродскага віцебскага Мікалая Гераніма], які вымаўляў, чаму нічога каля касцёла, або заканчэнне яго не пачынаецца за тыя грошы, што вяльможны пан Жаба першы даў некалькі гадоў таму ў колькасці 700 талераў бітых, я пісаў да Богу вялебнай згаданай брыгіткі і на падставе выказанага тастамента прасіў, каб хоць бы зрабіла ласку дадаць, бо што я з тымі 700 талерамі зрабіў бы. Выглядае на тое, што Богу вялебная брыгітка была

---

[44] APB, S-wit-1. S. 53.

[45] APB, S-wit-1. S. 58 v. Капа такіх бярвенняў каштавала 12 талераў бітых, іх абцёсванне і апрацоўка – 4 талеры бітых, дастаўка – 3 талеры бітых.

[46] APB, S-wit-1. S. 57 – 58: 15 распісак Юзафа Фантаны (15.V – 27.VII.1749).

[47] У лютым 1751 г. Марцыян Агінскі спачыў у маўзалеі роду ў фундаваным ім касцёле езуітаў у гонар св. Юзафа (буд. 1713 – 1731) – самым ранніх помніку барочнай сакральнай архітэктуры ў Віцебску. Гл.: *Boberski W.* Architektura kościoła i kolegium jezuitów… S. 323 – 366.

[48] APB, S-wit-1. S. 231 – 232: Тэкля Агінская пазычыла 1250 талераў бітых пад заклад маёнтка Курына (1751).

[49] НГАБ, 1781 – 26 – 1407, арк. 6 адв.: адпуст Бенедыкта XIV (31.XII.1748).

[50] MABR, 43 – 23752: ліст віцебскага дэкана Казіміра Лукашэвіча (13.VIII.1752).

[51] НГАБ, 1781 – 26 – 1395, арк. 58 – 58 адв. (акт візітацыі ад 15.X.1818); НГАБ, 1781 – 26 – 1411, арк. 52 (акт візітацыі ад 22.X.1823); НГАБ, 1781 – 26 – 1407, арк. 6 адв. Канвент двойчы атрымліваў папскія адпусты: 6.IX.1757 г. ад Бенедыкта XIV і ўжо перад кансекрацыяй, 22.IX. 1768 ад Клеменса XIII, гл.: APB, sygn. 102 і 113.



Касцёл Св. Антонія з боку прэзбітэрыя. Дрэварыт Саламона Юдовіна. 1923 г.

схільная даць на дапамогу ў заканчэнні касцёла тысячу талераў бітых, але яснавяльможны пан Юдыцкі гэта ёй адраіў, ці, дакладней, ад гэтага ахвяравання адвёў. І яна, не дапамагаючы скончыць касцёл, яшчэ пытаецца, якія мы маем аблігацыі [даўгавыя паперы] за кошты, пакладзеныя на касцёл. Аднак ніводнай аблігацыі ясны пан падкаморы не пакінуў. Аблігацыя нябожчыка ж выконваецца, бо кожны аўторак спяваецца імша за наданне чатырох тысяч злотых рускіх. Хутчэй Богу вялебная ясна пана брыгітка паводле тастамента павінна скончыць касцёл, як і вярнуць нам польскіх злотых 14.474 і 18 грошаў, што на заканчэнне выдадзены. Яснавяльможны пан Юдыцкі, яе ўнук [Яўхім, палкоўнік войскаў польскіх і расійскіх], нібы згаджаючыся, каб яго бабулі не зрабіць прыкра, абяцаў на будоўлю 2000 злотых; выдаў толькі тысячу, а другую і не думае”[52].



Касцёл Св. Антонія з боку прэзбітэрыя. Фота каля 1930 г.

Будаўніцтва кляштара

Паколькі на спадчыннікаў фундатара не заўсёды можна было разлічваць, бернардзінцы шукалі іншых дабрадзеяў[53]. Будаўнічую касу папаўнялі грошы, атрыманыя за арэнду і продаж пляцаў, што належылі канвенту. Калі касцёл накрылі дахам, з’явілася магчымасць падумаць пра ўзвядзенне кляштара. 20.III.1753 г. кантракт на яго будаўніцтва з Юзафам Фантанай заключыў новы гвардыян айцец Лукаш Дамброўскі ў прысутнасці сіндыка, крайчага літоўскага і падваяводы Мікалая Антонія Рэвута (Дадатак 2)[54]. Інвестыцыя распачалася яшчэ той самай вясною з паўднёвага боку касцёльных муроў і ажыццяўлялася коштам ордэна, які на гэты раз забяспечваў не толькі матэрыялы, але таксама і рамеснікаў. Архітэктару, які прадставіў уласны праект, даручаўся выключна нагляд за будоўляй, што павінна была скончыцца праз два гады. Атрымаўшы па кантракце ўсю суму ў 200 талераў бітых, Фантана ў выпадку “аддалення ад гэтай будоўлі” абавязваўся асабіста выбраць і аплаціць “такога субалтэрна, які б гэтую будоўлю мог дасканала скончыць”[55]. Пра падрабязнасці прац нічога невядома, апроч

[52] АРВ, L–12. S. 701.

[53] Найбольшыя сумы ў гатоўцы, нерухомасці або працэнтах ад даходаў канвенту ахвяравалі: Канстанцыя Булгакава (25 талераў бітых у 1742 г.), Тэадора Латэцкая (пляц на Задзвінні ў 1752 г.), Міхал Лазіцкі (100 талераў бітых у 1753 г.), Абундацыя Целыкоўская, жонка скарбніка navaградскага (30 талераў бітых у 1763 г.), Міхал Чэшковіч (300 рублёў у 1775 г.), Геранім Чапліц (250 рублёў на Тулаве ў 1779 г.), Пётр Цэлесцін Храпавіцкі, брыгадзір расійскіх войск і сіндык кляштара (у 1806 г. забяспечыў 2000 рублёў на Сялютах); гл.: АРВ, S-wit-1. S. 183 – 230; НГАБ, 1781 – 26 – 1407, арк. 6 адв. – 7.

[54] АРВ, S-wit-1. S. 63: Кантракт з Юзафам Фантанай на будаўніцтва кляштара (20.III.1753).



Былыя касцёл і кляштар бернардзінцаў з паўднёва-ўсходняга боку. Фота каля 1944 г.

таго, што будаўніцтва, верагодней за ўсё, не ўдалося скончыць у прызначаны тэрмін. Яшчэ ў 1760 – 1761 гг. па распараджэнні правінцыяла Вінцэнта Сапліцы, які страчваў цярпенне, чарговы гвардыян Руфін Федаровіч прадаў непатрэбныя грунты, "вымагаючы сумы на заканчэнне распачатага кляштара"[56]. Не выключана, што размяшчаліся манахі тады не пры галоўным гмаху, а ў вялікім комплексе гаспадарчых пабудоў, што знаходзіліся бліжэй да моста.

Убранства касцёла

Усталяванне вежаў на мурах касцёла супала з пачаткам прац па яго ўпрыгожванні. 6.VIII.1749 г. Фантана падпісаў у Марцыянаве кантракт з ваяводам Марцыянам Міхалам Агінскім на выкананне галоўнага алтара і пышнага табернакля (Дадатак 3)[57]. Умова выглашала суму ў 600 талераў бітых, якая выплочвалася часткамі, авансам за працу. Абедзве мураваныя структуры з калонамі Фантана абяцаў зрабіць "паводле пададзенага ад сябе плана" і зацверджанага ваяводам "прадстаўленага абрысу". Архітэктар павінен быў не толькі знайсці рамеснікаў, але таксама выдаткаваць уласныя грошы на матэрыялы. Тэкст, які каментуе малюнкі, абмяжоўваецца агульнымі словамі. Апісваецца прысценная двух'ярусная канструкцыя, аздобленая ляпнінай, гіпсавымі статуямі і анёламі, а таксама пазалочанымі капітэлямі, фестонамі, гербамі і "фіглятурамі каля абраза" св. Антонія. Структура табернакля павінна была мець форму архітэктурнай перагародкі, расцягнутай на ўсю шырыню прэзбітэрыя і аддзяляючай манаскі хор ад нефа касцёла. Над менсай і даразахавальніцай адчынялася, відаць, перспектыва на алтар у завяршэнні апсіды. Нягледзячы на дэклараваную паспешнасць ("найхутчэй, наколькі можа

[55] У паперах канвента знаходзім цікавую біяграфічную акалічнасць, якая з'яўляецца чарговым сведчаннем сямейных сувязяў Юзафа Фантаны "віцебскага". У лютым 1750 г. ён абяцаў бернардзінцам выплаціць 100 талераў, запісаных яго братам Каралем, якога належыць ідэнтыфікаваць як аднаго з двух сыноў, што памерлі бяздзетнымі, Юзафа Фантаны "варшаўскага": Каралем Антоніем Гаспарам (нар. 5.I.1721) або Каралем Дамінікам Якубам (нар. 25.VII.1724). APB, S-wit-1. S. 62; "Асігноўка грошай для віцебскіх бернардзінцаў па распараджэнні пана брата майго Караля Фантаны" (14.II.1750).

[56] Бернардзінцы прадалі, між іншым, "пляц пры Вострай Спаскай гары" мешчаніну Паўлу Турыне за 130 талераў бітых (14.XI.1760), гл.: APB, S-wit-1. S. 239 – 240; пар. ИЮМ. Т. 19. № 6. С. 63 – 67. Праз год іншыя грунты на Узгор'і яны збылі Андрэю Праскуновічу, гл.: ИЮМ. Т. 19. № 18. С. 106 – 109 (25.VII.1761).

[57] Lietuvos Valstybes Istorijos Archyvas (Вільня, далей: LVIA), 1177 – 1 – 3389.



Вялікі алтар у гонар св. Антонія, 1749 – 1753 гг. Праект Юзафа Фантаны. Справа – атлар Беззаганнага Зачацця Панны Марыі, 1757 – 1758 гг. Архітэктар Людвік Яздоўскі. Фота каля 1900 г. Са збораў IS PA

быць, тыя працы прыспешыць”), выкананне дамовы значна спазнілася. Яго не дачакаўся памерлы праз год ваявода, а таксама гвардыян Себасціянскі, што ад пачатку ажыццяўляў нагляд за бернардзінскай будоўляй. Амаль на тры гады пазней, 20.III.1753 г., Фантана з нагоды заключэння кантракта на будаўніцтва кляштарнага будынка прадставіў яго наступніку, айцу Дамброўскаму, страхоўку на заканчэнне вялікага алтара яшчэ да надыходу восені, а ў выпадку невыканання абавязацельстваў дазваляў са сваіх уладанняў дабівацца вяртання тых 600 талераў бітых. Пра структуру табернакля дакумент ужо не згадваў, відаць, ад яго адмовіліся (Дадатак 4)[58]. Трэба меркаваць, што ў 1755 г., які згадваецца як дата заканчэння касцёла, бернардзінцы маглі адпраўляць набажэнства пры галоўным алтары св. Антонія, таму што неўзабаве пачаліся працы над іншымі элементамі аздаблення[59].

У 1756 – 1758 гг. ля цэнтральнай аркі паўсталі дзве наставы, падобныя як блізняты. Іх выканаўцам быў “магістр мулярскага мастацтва” Людвік Яздоўскі, прысланы два гады назад з Вільні ў Віцебск для кіравання будаўніцтвам віцебскай фары (паводле праекта Юзафа Фантаны)[60]. У сярэдзіне 1756 г. ён падпісаў кантракт з пісарам земскім Ігнацiем Качаноўскім на ўстанаўленне з боку Евангеліі алтара са штучнага мармуру ў гонар Пана Езуса Укрыжаванага (Дадатак 5)[61]. Умова тычылася алтарнай наставы “на два ярусы, а калі не хопіць месца, то на адзін” (хутчэй за ўсё, дакладнага праекта не было),

[58] АРВ, S-wit-1. S. 67 – 70: Страхоўка ягамосці пана Фантаны на заканчэнне Вялікага Алтара (20.III.1753).

[59] НГАБ, 1781 – 26 – 1395, арк. 58 – 58 адв. (акт візітацыі ад 15.X.1818); НГАБ, 1781 – 26 – 1411, арк. 52 (акт візітацыі ад 22.X.1823). Ужо ў 1752 г., пасля пажару, які знішчыў тэрыторыю Ніжняга Замка, “ягамосці ксяндзы езуіты і дамініканцы ў ягамосцяў ксяндзоў бернардзінцаў мусілі праводзіць набажэнствы”. Гл.: *Boberski W.* Architektura kościoła i kolegium jezuitów… S. 338.

[60] Гл.: *Boberski W.* Dzieje fary… S. 38 – 39. Людвік Яздоўскі прыбыў у Віцебск 4.VIII.1754 г. разам з канонікам Янам Дамінікам Лапацінскім, каб кіраваць будоўляй фары. Ажно да яе заканчэння (1762) ён вяртаўся кожную восень да жонкі Крысціны, якая жыла ў Вільні. У лістападзе 1754 г. у яго нарадзіўся сын Юзаф Андрэй, хросным якога быў вядомы стукатар (майстар па апрацоўцы стуку – штучнага мармуру) Ян Хедля (LVIA 604 – 10 – 9: Liber Baptistorum Eccelsia Parochialis Vilensis Sancti Joannis ab Anno 1747 ad Annom 1774 inclusive, к. 124, запіс № 388). Задакументаваная за дзесяцігоддзе дзейнасць Яздоўскага ў Віцебску, напэўна, не вычэрпвае спіс яго прац. Інтрыгуе паведамленне пра Людвіка Яздоўскага – аднаго з фундатараў касцёла бернардзінцаў у Тэльшах на Жмудзі (1762 – 1765). Спонсары гэтай інвестыцыі, між іншым, добра вядомыя, можна дапусціць, што згаданая асоба выступала там у іншай ролі. Гл.: *Maciej Wołonczewski.* Biskupstwo Żmujdzkie. Tłum. Maurycy Hryszkiewicz. Kraków, 1898. S. 173.

[61] АРВ, S-wit-1. S. 71 – 73: Кантракт з Людвікам Яздоўскім, магістрам мулярскага мастацтва, на алтар Пана Езуса (20.VI.1756).



Друя, касцёл бернардзінцаў, галоўны алтар і табернакль, 1764 – 1767 гг. Архітэктар Антоніа або Даменіка Паракка (?). Фота каля 1930 г. Са збораў IS PAN

выглашала суму ў 160 талераў бітых і была рэалізавана ў канцы года. Апроч згаданай сумы фундатар браў на сябе шматлікія абавязкі. Ён дастаўляў матэрыялы (цэглу, вапну, чорны гіпс, "золата да залачэння і атрымання жылак, а таксама промняў", дрэва для рыштаванняў), а таксама абразы (у галоўным полі знаходзілася скульптурная фігура Укрыжаванага, вышэй – абраз, які прадстаўляў Пературэнне). Звыш таго ён гарантаваў памочнікаў муляра, харчаванне ў бернардзінцаў для аднаго муляра, а таксама самога Яздоўскага "пры пачатку гіпсавання, мармуравання і шліфавання, ажно да заканчэння". Сам жа майстар абяцаў закупіць белы гіпс (цікава, што высылалі за ім тры фундатарскія падводы ажно да Вільні) і фарбы. Каларыстыка ва ўмове была вызначана дакладна: "Колер мармуру ва ўсім алтары павінен быць зялёны бірузовы з іншымі, толькі не чырвонымі фарбамі злучаны, а па мармуры маю даць для аздобы залатыя жылкі, як ва ўсіх мармурах". Пад канец працы выплаты з касы фундатара праз пасрэдніцтва гвардыяна Дамброўскага атрымлівалі муляры Лазаровіч (5 талераў бітых) і Яцэвіч (2 талеры бітыя) – што некалі замянялі майстра Людвіка на будоўлі фары, а таксама мастак Сазэк (3 талеры бітыя)[62].

Праца Яздоўскага атрымала прызнанне, калі 15.IX.1757 г., называючыся архітэктарам, ён падпісаў у Гарадку дамову на выкананне другой наставы пры арцы, прысвечанай Беззаганнаму Зачаццю Панны Марыі (Дадатак 6)[63]. Замоўленую працу ён скончыў у час, у верасні 1758 г.[64] Кантракт быў амаль такі ж самы, як і папярэдні, толькі ў гэтым выпадку фундатар, генерал літоўскай артылерыі Антоні Салагуб (яго прадстаўляў камісар уладанняў, абозны браслаўскі Станіслаў Клот), палічыў за лепшае дадаць 100 талераў і багатую выплату натурай, чым быць уцягнутым у дастаўку матэрыялаў і вярбоўку выканаўцаў. Звязана гэта было, можа быць, з прафесійнай эмансіпацыяй Яздоўскага, які дапрацаваўся да ўласнай майстэрні. У 1760 г. ён меў з гэтай нагоды непрыемнасці, таму што працаваў не ў цэху, "ніякай павіннасці ў месце Яго Каралеўскай Міласці Віцебску не складаючы". У абгрунтаванне позвы цэхмайстар мулярскага і ганчарнага цэху Пётр Гудзізевіч сцвярджаў, што Яздоўскі,

[62] АРВ, S-wit-1. S. 74: Распіскі за частковыя выплаты і разлікі падвыканаўцаў (ад 6.VII.1756).
[63] АРВ, S-wit-1. S. 75: Кантракт на алтар Беззаганнага Зачацця Панны Марыі (15.IX.1757).
[64] АРВ, S-wit-1. S. 76: восем распісак за атрыманне грошай ад Людвіка Яздоўскага.



Алтар Беззаганнага Зачацця Панны Марыі, 1757 – 1758. Архітэктар Людвік Яздоўскі. Мантаж В. Баберскага

“парушаючы прывілеі найяснейшых каралёў польскіх, нададзеныя тутэйшаму месту, прыехаўшы для працы ў места Яго Каралеўскай Міласці Віцебск як архітектар, не трымаючыся архітэктуры, намовіўшы тутэйшых і прышлых муляраў, сам разам са сваімі таварышамі ў месце па дамах панскіх шляхецкіх, гарадскіх, яўрэйскіх коміны, камінкі, печы складае <…>”. Вырак гродскага суда, які адхіліў скаргу, варты цытавання: “Пастанаўляем, каб муляры, як тутэйшыя, што ў месце жывуць, так і тыя, што да места прыехалі, якія кельмай зарабляюць, выключна да цэха належалі <…>, а ягамосць пан Людвік Яздоўскі, таму што архітэктурай, а не кельмай зарабляе, значыць і згаданую яго працу вольны рабіць бясплатна”[65]. Такім чынам у абліччы права спраўдзілася бліскучая прафесійная характарыстыка муляра, дадзеная амаль на два гады раней вельмі зычлівым да яго віцебскім дэканам Казімірам Лукашэвічам, які прадставіў наступную рэкамендацыю: “Людвік <…> шчыра, праўдзіва працуе, не напіваецца ў рабочыя дні, часу не губляе і іншых да працы заахвочвае[66]. Людвік добры чалавек, калі б толькі не быў упарты і шмат пра сябе ў мастацтве не думаў, бо архітэктонікі не ведае. Загадаеш яму, і ён пільнаваць будзе, каб дакладна прытрымліваўся абрысу <…> і за ўсім наглядаў”[67].

Праз дэкаду пасля Яздоўскага ў кляштары віцебскіх бернардзінцаў з’явіўся нейкі Ян Азялевіч, які з выхваленнем

[65] НГАБ, 1709 – 1 – 23 (Віцебскі гродскі суд, 1760 – 1761), арк. 79 – 80: Дэкрэт у справе мулярскага цэха з панам Яздоўскім (10.III.1760).

[66] MABR, 43 – 23752: ліст ад 6.X.1754.

[67] MABR, 43 – 23752: ліст ад 6.VII.1755. Кс. Лукашэвіч бараніў Яздоўскага ад гневу Фантаны, які “ўбачыў шмат рэчаў, што патрабуюць папраўкі, а Людвіка не было, тым скончыў, што калі б не ішла размова пра кошты, то ён загадаў бы зруйнаваць мансарду”. Гл.: *Boberski W.* Dzieje fary… S. 38.

[68] Знаходжанне гвардыянаў на пасадах звычайна практыкавалася з погляду на існуючыя будоўлі. Сведчаннем актыўнага будаўнічага руху ў 60-х гг. XVIII ст. у Літоўскай правінцыі бернардзінцаў з’яўляюцца лісты, дасыланыя з Рыма кардыналам-пратэктарам (Carl Cavalehin) правінцыялам (Антонію Гняўчынскаму, ФранцішкуПшыленцкаму) з дыспенсамі на пралангацыю трохгадовай кадэнцыі там, дзе “in loco lignea fabrica muratas”. Яны тычыліся канвентаў: у Беліцы (1760 – 1764, гв. Пётр Чапкоўскі), Будславе (1767, гв. Канстанты Пенс), Дуброўне (1766, гв. Францішак Вуяшэвіч), Гродне (1766, гв. Тэадор Крапіўніцкі), Глуску (1760 – 1766, гв. Тэадор Зянковіч і гв. Францішак Харкевіч), Пінску-Кароліне (1763, гв. Эразм Кніскі), Магілёве (1763 – 1764, гв. Аўгуст Байкоўскі), Мазыры (1759 – 1767, гв. Фелікс Пласкавіцкі), Мсціславе (1767, гв. Гіяцынт Дамброўскі), Полацку (1765 – 1769, гв. Рафал Кулікоўскі), Слоніме (1759 – 1766, гв. Адрыян Ажэхоўскі), Тэльшах (з 1759, гв. Францішак Кошуць), Валожыне (1769, гв. Андрэй Ажэхоўскі) і ў Вільні (1766, гв. Вінцэнт Сапліца). Гл.: APB (Kraków), L – 12. S. 829 – 863.



Унутранае ўбранне касцёла св. Антонія з амбонам, каплічным алтаром Св. Францішка (1767, архітэктар Ян Азялевіч) і алтаром Пана Езуса (1756, архітэктар Людвік Яздоўскі)

называў сябе “Artis Architectoriae inVentor”. У лістападзе 1766 г. ён узяў на сябе абавязак перад айцом Лукашам Дамброўскім (які амаль без перапынку на працягу 16 гадоў загадваў канвентам[68]) вымураваць за суму ў 180 талераў бітых алтар у гонар св. Францішка ў завяршэнні паўночнага нефа касцёла (Дадатак 7)[69]. Лапідарная дамова не ўдакладняла форм наставы, затое была прапітана своеасаблівай ганарлівасцю “інвентара”, які “сам добраахвотна, а не з якога людскога прымусу”, згадзіўся кіраваць уласнымі рамеснікамі (“гэта значыць, мулярам, штукатарам, шліфоўшчыкам і памочнікам”) і з закупленых ім матэрыялаў (за выключэннем золата) выканаць згаданы твор з красавіка да верасня наступнага года. Робіцца ўражанне, што невядомы Азялевіч невядома адкуль прыбыў у Віцебск нядаўна і, жывучы на манаскім харчаванні, меў надзею атрымаць больш значны заказ.

Апроч чатырох згаданых алтароў касцёл упрыгожвалі яшчэ пяць мураваных настаў. У капліцах: св. Ганны (брацкая) і св. Казіміра, а таксама пры калонах: св. Івона, св. Язафата і св. Міхала Арханёла (кавальскага цэху). Пра іх аўтараў і фундатараў не захавалася ніякіх звестак. Мураваным “з мазаікай” і дэкараваным лепкай быў таксама амбон[70].

Рынкавыя крамы

Як інтэгральная частка забудовы рынку бернадзінскі комплекс паспытаў вынікі ўрбаністычнай рэгуліроўкі, якая пачалася непасрэдна з прыходам расіян і стала нагодай для шматлікіх канфліктаў, што тычыліся ўласнасці. Ужо ў 1773 г. бурмістр Ян Ігольнік шкадаваў, што 12 яго крамаў “у выніку цяперашняга забрання места Віцебска найяснейшай расійскай імператрыцай разам з іншымі зруйнаваны і пад Рынкавую плошчу без ніякай узнагароды ўзяты”[71]. Будаўніцтва двухпавярховых падобных адно да аднаго крылаў, якія размяшчаліся насупраць адзін аднаго як кулісы і былі прывязаны з поўначы да фасада касцёла Св. Антонія, а таксама да прэзбітэрыя Уваскрасенскай царквы, расцягнулася ў часе[72]. У 1776 г.

[69] АРВ, S-wit-1. S. 77 – 79: Кантракт з Янам Аляшэвічам на алтар св. Францішка (6.XI.1766).

[70] НГАБ, 1781 – 26 – 1395, арк. 58 – 58 адв. (акт візітацыі ад 15.X.1818); НГАБ, 1781 – 26 – 1411, арк. 52 – 52 адв. (акт візітацыі ад 22.X.1823); *Сементовский А.М.* Витебск. Статистический очерк. С. 193. Сцены прэзбітэрыя і капліц упрыгожвалі выявы, “затушаваныя” чорнымі фарбамі ў тэхніцы “en grisaille”. У гэтай тэхніцы былі адлюстраваны на сцяне, між іншым, 14 станцый Крыжовага шляху (верагодна, яны былі зафарбаваны падчас рамонту 1882 г.). Бернардзінцы вельмі ганарыліся 12-галосным арганам з “бубнам, званкамі і зоркай”. У паўднёвай вежы віселі тры званы. Згадка пра знаходжанне ў касцёле да 1939 г. палотнаў Сальвадора Розы (гл.: *Віцьбіч Ю.* Ня змоўклі віцебскія арганы // Наша вера. № 1. 1995. С. 79) адносіцца, безумоўна, да абразоў мастака Saverino della Rosa (1743 – 1821), які на пачатку XIX ст. быў прысланы з Вероны ў касцёлы віцебскіх і полацкіх езуітаў.

[71] ИЮМ. Т. 19. № 59. С. 223: Тастамент бурмістра Яна Ігольніка (11.VII.1773).



Касцёл Св. Антонія пасля 1944 г.

канвент судзіўся з цэхам мяснікоў з нагоды анексавання часткі манаскага грунту пад мясныя лаўкі, узведзеныя з паўночнага боку касцёла[73]. Праз тры гады канвент пратэставаў паўторна, бо купцы занялі іншыя пляцы "на ўзвядзенне для сябе мураваных крамаў <…>, і імі ўвесь касцёл засланяюць, не плацячы пры гэтым былой арэнды" (на што ратман магістрата Ян Рэбіндэр адказваў, між іншым, слушна, што інвестыцыя будзе выгадная ўсяму гораду)[74]. У 1787 г. ужо згаданы гвардыян Бабятыньскі, скардзячыся правінцыялу і губернатару на шматгадовага сіндыка кляштара, выкрыў ініцыятара гэтага будаўніцтва бурмістра Томаша Лорэнца[75], які "з'яўляецца амаль верхаводам нанясення шкоды кляштару і крыўджання яго – бо ён першы прыступіў да ўзвядзення мураваных крамаў на нашых кляштарных пляцах, на якіх драўляныя былі і штогод прыбытак прыносілі <…>, а таксама і іншых да муравання на тых пляцах за сабою пацягнуў"[76]. Вышэйзгаданыя рэляцыі дазваляюць сцвярджаць, што складанне кампазіцыі "віцебскага Капітолія" заняло першае дзесяцігоддзе пасля падзелу. У гэтым прымала ўдзел расійская адміністрацыя (і таксама можа тагачасны губернскі архітэктар Іяган Зігфрыдэн), а фундатарамі былі віцебскія купцы. Фронт прац у цэнтры горада быў у той час вельмі вялікі. Апроч крамаў ён уключаў таксама будынак ратушы і ўзвядзенне фасада бернардзінскага касцёла, непадалёк на ўзгорку ў фінальную фазу ўступіла будаўніцтва вялікай базыльянскай катэдры, а ўжо за мостам праз Віцьбу, насупраць калегіума езуітаў, месца драўляных крамаў займалі "дом паліцыі,

[72] Крамы ўпершыню былі ўлічаны на плане ўрбаністычнай рэгуліроўкі Віцебска, зацверджаным Кацярынай II 21.II.1778 г. Российский Военно-исторический архив (Масква, далей – РВИА), 846 – 16 (д. – WUA) – 21574, к. 3. Гл. рэпр.: Полное собрание законов Российской империи (собрание первое). Книга чертежей и рисунков (планы городов). С.-СПб., 1839. С. 239.

[73] ИЮМ. Т. 19. № 77. С. 278 – 279: спрэчка бернардзінцаў з цэхам мяснікоў пра лаўкі (1.XI.1776).

[74] APB, S-wit-1. S. 243: скарга бернардзінцаў (24.V.1779). У 1783 г. кляштар здаў свае крамы ў арэнду купцам Глінцы, Лявіцкаму і Папсую. Гл.: НГАБ, 1781 – 26 – 1407, арк. 6 адв.

[75] У час будаўніцтва ролю пасрэднікаў, а нават і сувырашальнікаў, адыгрывалі сіндыкі кляштара: у 1741 – 1744 гг. гэтую функцыю выконваў падстолі віцебскі Антоні Булгак, пасля яго – крайчы літоўскі Мікалай Антоні Рэвут; з 1755 г. амаль чвэрць стагоддзя сіндыкам быў бурмістр і купец Томаш Лорэнц.

[76] APB, L–12, k. 703: ліст айца Эрыка Бабятыньскага правінцыялу (31.III.1787).

ваяводскі і пошты", а таксама яго блізнят- ка – "дом каменданта" (пазней губернатара), якія фарміравалі заходняе крыло другой з галоўных віцебскіх плошчаў (зараз плошча Свабоды)[77].

* * *

З пачатку XIX ст. на гмахі бернардзінцаў, што стаялі ў сэрцы горада, зайздросна паглядалі праваслаўныя. Кожная змена губернатара напаўняла манахаў і пробашчаў хваляваннямі. У 1808 г. гвардыян Францішак Гейбовіч папярэджваў арцыбіскупа Сестранцэвіча і духоўныя ўлады: "Годныя веры паведамляюць з Пецярбурга і па Віцебску пляткараць, што дэзуніты з новым губернатарам ужо дамовіліся і звярнуліся ў Міністэрства ўнутраных спраў і Сінод, каб касцёл наш і кляштар аддаць ім, як былы базыльянскі"[78]. Напалеонаўская кампанія, а таксама кіраванне генерал-губернатара католіка князя Аляксандра Вюртэмбергскага (1811 – 1822) аддалілі пагрозу. Вярнулася яна пасля закрыцця кляштара, якое адбылося па моцы дэкрэта ад 19.VII.1832 г. Уласна кажучы, не вядома, як удалося ў той час пазбегнуць перадачы святыні праваслаўным. Можа быць, яшчэ памяталі, як год таму назад штодня наведвала яго княгіня Ловіч (Іаганна Грудзінская), якая аплаквала памерлага ў Віцебску вялікага князя Канстанціна. Спробам упадку касцёла ў палове XIX ст. перашкаджала прыхільнасць губернатара Андрэя Галіцына (1846 – 1853), але падрабязнасці гэтага невядомы[79].



Фасад касцёла Св. Антонія.
Акварэль 1946 г. Са збораў ЦРГКЛ

З 1832 г. касцёл Св. Антонія быў цэнтрам парафіі, да якой належалі філіялы Св. Троіцы з ператворанага былога фарнага касцёла і касцёла Св. Міхаіла Арханёла, пакінутага дамініканцамі. Калі апошнія былі ліквідаваны, адзіны каталіцкі бастыён на левым беразе Дзвіны абслугоўвалі шэсць штатных ксяндзоў, якія ўдзельнічалі таксама ў Таварыстве дабрачыннасці, што існавала ў былым кляштары мар'явітак[80]. Праз чвэрць стагоддзя пасля скасавання уніі расіяне з непакоем назіралі, як праваслаўны "цёмны беларускі народ" запаўняў па-бернардзінскі касцёл і маліўся не толькі перад славутым ласкамі абразом св. Антонія, але і выяваю

[77] *Квитницкая Е.Д.* Административные здания Белоруссии конца XVIII в. В кн.: Архитектурное наследство. Т. 20. М., 1972. С. 13 – 16; *Квитницкая Е.Д.* Приемы формирования... С. 147 – 149; *Boberski W.* Architektura ziem I zaboru rosyjskiego. [W:] Kultura i polityka. Wpływ polityki rusyfikacyjnej na kulturę zachodnich rubieży imperium rosyjskiego (1772 – 1915). Pod. red. Dariusza Kostatynowa i Piotra Paszkiewicza. Warszawa, 1994. S. 63 – 64.

[78] АРВ, L–12, k. 707 (дат. 30.VI.1808). З часу забойства арцыбіскупа Язафата Кунцэвіча (1623) гарадскія брамы былі шчыльна зачынены для праваслаўя. Не лічачы часу маскоўскай акупацыі (1654 – 1667), яно вярнулася ў горад толькі пасля падзелаў, каб у панаванне Кацярыны II здабыць адзіны прыстанак, удалечыні ад цэнтра, на левым беразе Дзвіны, дзе шэф расійскага гарнізона загадаў паставіць сціплую драўляную цэркаўку.

[79] Dziennik Warszawski. 1856. Nr. 13. S. 4. "Спозненая" карэспандэнцыя, датаваная 24.VIII.1855 г. і падпісаная "P.A.W. Białorusin": "З касцёлаў рымска-каталіцкага веравызнання на вуліцы Смаленскай варты ўвагі касцёл ксяндзоў бернардзінцаў, які стараннем князя Галіцына захаваны ад заняпаду".

блаславёнага Язафата. Прадухіліць гэта спрабаваў (з невялікім вынікам) поп суседняй Уваскрасенскай царквы, які ў 1863 г. у падзямеллі ўсходный вежы ўладкаваў "канкурэнтную" капліцу Св. Антонія Рымляніна. Тагачасныя дадзеныя, якія тычыліся стану ўладання царквы і касцёла, сур'ёзна скажалі канфесійныя рэаліі ў сталіцы губерні. Гэта ўсведамляў заклапочаны духоўным і фізічным лёсам царквы Аляксандр Семянтоўскі, якога здзіўлялі халодныя рэлігійныя адносіны праваслаўных жыхароў Віцебска. Ён сцвярджаў, што апроч Камянца-Падольскага (пасля 1710 г. зачыненага для праваслаўя) нідзе не спаткаў горада, у якім народ так рэдка адведваў цэрквы і так мала ахвяраваў на іх. Падтакваў яму адукаваны поп Успенскага сабора Міхаіл Красавіцкі, які са смуткам канстатаваў, што два тутэйшыя каталіцкія касцёлы ніколі не стаяць пустымі, а яўрэйскае святкаванне суботы рэгулярна паралізуе жыццё ўсяго горада[81].

Пад канец стагоддзя актыўнасць і ахвярнасць католікаў даказалі два рамонты касцёла Св. Антонія. У 1882 г. стараннем грамадскага камітэта і коштам у 3620 рублёў былі адрамантаваны яго муры (папраўлены тынк і пабелены сцены), а таксама элементы ўбранства (за выключэннем старой драўлянай падлогі і сапсаванага аргана). З нагоды рамонту былі выдалены шматлікія абразы і начынне, атрыманыя ў апошнія дзесяцігоддзі з зачыненых касцёлаў Віцебска і ваколіц[82]. Падобна на тое, што трапілі яны да больш бедных святынь, можа таксама за Дзвіною, да разбудаванага ў той час касцёла Св. Барбары. Апошні рамонт пачаўся ў 1898 г. і скончыўся праз тры гады[83]. Прадпрымальны ксёндз дэкан Андрушкевіч аднавіў тады алтары і абразы. З'явіліся новыя абразы, выкананыя мастаком Тынчынскім (Тэнчынскім?), які прыбыў з Варшавы[84].

Падрабязная дакументацыя па гісторыі пакляштарнага гмаху ў 1835 – 1867 гг., якая захавалася ў Пецярбургу, мне невядома[85]. На падставе іншых крыніц можна прасачыць галоўныя этапы. Пасля скасавання будынак быў перададзены арміі і прызначаны на шпіталь. У 1839 г. у сувязі з прыстасаваннем яго на патрэбы інвалідаў віцебскага гарнізона былі зроблены дэталёвыя памеры, якія закранулі таксама прылеглую святыню[86]. Праз пяць гадоў будынак быў перададзены ў вучэбнае ведамства і ў ім размясціўся перанесены з Забелаў, прыпісаны да Аляксандраўскай

[80] *Ks. Dyonizy Bączkowski i Ks. Jozafat Żyskar.* Nasze kościoły. Opis ilustrowany wszystkich kościołów i parafii znajdujących się na obszarach dawnej Polski i ziemiach przyległych. T. I. Cz. 3. Archidiecezja Mohylowska. Witebszczyzna. Warszawa – Petersburg, 1913. [Reprint: Warszawa, 2001]. S. 10 – 11.

[81] *Сементовский А.М.* Витебск. Статистический очерк. С. 143, 189 – 190; ён цытуе надрукаванае ў 1863 г. казанне папа Міхаіла І. Красавіцкага.

[82] *Aleksander Miniat.* Widoki kościołów witebskich // Tygodnik Powszechny. 1884. Nr. 33. S. 523 – 524.

[83] Российский государственный исторический архив (далей – РГИА), 1293 – 131 – 222: каштарыс і план рамонту касцёла Св. Антонія ў Віцебску (1898).

[84] *Абрамова И.* // Витебский курьер. XI/1901 (evitebsk.com); прозвішча варшаўскага мастака "Тынчинский" (Tynczyński, Tęczyński) у польскіх лексіконах мною не знойдзена.

[85] РГИА, 733 – 231 – 1 (1835 – 1849); 733 – 231 – 2 (1849 – 1867); 1286 – 6 – 263, арк. 295 (1835 – 1844); РГИА, 1287 – 31 – 563, арк. 14 (1842 – 1844); РГИА, 1286 – 7 – 707 (1852); РГИА, 1293 – 131 – 222 (1898). У фондах РГИА знаходзяцца таксама багатыя зборы візітацый першай паловы XIX ст.: РГИА, 822 – 12, сігн. 2590 (1803 і 1805 г.), 2591 (1810 г.), 2592 (1814 г.), 2593 (1816 г.), 2598 (1817 г.), 2656 (1818 г.), 2657 (1819 г.), 2779 (1820 г.), 2791 (1831 г.), 2813 (1839 г.); 826 – 2 – 144 (1840 г.).

[86] РГВИА, 349 – 8 – 1433, арк. 10–12; памеры былі шматразова апублікаваны ў нарысах і рэпрадукцыях, у тым ліку: *Квитницкая Е.Д.* Приемы формирования... С. 141; *Чарняўская Т.І.* Архітэктура Віцебска. З гісторыі планіроўкі і забудовы горада. Мінск, 1980. С. 30 – 32; *Габрусь Т.В.* Зруйнаваныя святыні. У кн.: Страчаная спадчына. Уклад. Т.В. Габрусь. Мінск, 1998. С. 95 – 96; *Слюнькова И.Н.* Монастыри восточной и западной традиций. Наследие архитектуры Беларуси. М., 2002. С. 242 – 244.





Забудова ўсходняга крыла рынку (суч. вул. Леніна, 33 і 35).
Паштоўка каля 1900 г. і фота Яўгена Калбовіча 2004 г.

гімназіі шляхецкі канвікт, заснаваны (1792) паводле фундацыі ваяводы Юзафа Гільзена і выканаўцаў яго волі братоў Шадурскіх[87]. У 1847 – 1852 гг. будынак быў моцна перабудаваны, атрымаўшы з таго часу як унутры, так і з фасада рытмічныя, вялікія, з паўкруглымі завяршэннямі вокны. Аўтар перабудовы невядомы. Праект архітэктара Freury (?) 1846 г., што захаваўся ў Вільні, не атрымаў адабрэння[88]. Пасля 1876 г., калі быў пабудаваны новы вялікі будынак гімназіі, гмах перайшоў ва ўладанне праваслаўнага духавенства (частку памяшканняў заняло ўпраўленне навучальнай акругі). Пад канец стагоддзя будынак быў зноў мадэрнізаваны, атрымаўшы новы, падзелены пілястрамі фасад. У гэты час ксяндзы касцёла Св. Антонія жылі ў наёмным будынку на вуліцы Смаленскай. У 1889 г. ім дазволілі пабудаваць дом пры самім касцёле[89].

---

[87] *Сапунов А.П.* Историческая записка 75-летия Витебской гимназии (1808 – 1883). Витебск, 1884. № 38. Пакінуўшы край, у 1781 – 1786 гг. Гільзен абдарыў сваімі землямі Юзафа і Ксаверыя Шадурскіх, паставіўшы ўмову перадачы паловы даходаў на адукацыйныя фундушы.

[88] Vilniaus Universiteto Mokslinës Bibliotekos Rankraštynas (Вільня, далей – VUBR), 78 – 359; чатыры малюнкі (накіды першага і другога паверхаў, разрэз і фасад), падпісаныя Freury або Greury, датаваны 19.V.1846 г., адвергнуты 22.XI.1847. Архітэктар прадугледжваў між іншым значнае паніжэнне даху і павелічэнне вокнаў. Уваход з боку вуліцы мусіў атрымаць прыступкі. Здаецца, у гэты самы час выкананы пазбаўлены даты накід па-бернардзінскіх гмахаў “для размяшчэння канвікта”, які захаваўся ў НГАБ, 3209 – 1 – 2120, арк. 9.

[89] *Aleksander Miniat.* Widoki kościołów witebskich. S. 524.



Лакалізацыя бернардзінскіх будынкаў у сучасным прасторавым кантэксце. Апрацаванне В. Баберскага, фота Я. Калбовіча, 2004 г.

* * *

Пасля бальшавіцкай рэвалюцыі святыню католікам пакінулі, але з-за арышту ксяндзоў яна звычайна бывала зачынена. Ужо ў 1922 г. у маскоўскую Бутырку трапіў пробашч Стэфан Трускоўскі, які супраціўляўся дэкрэту аб канфіскацыі каштоўнасцяў (прызначаных быццам бы для галадаючых Паволжжа). На хвалі ваяўнічага атэізму ў 1923 г. у Маскве быў наладжаны ўзорны працэс супраць магілёўскага арцыбіскупа Яна Цепляка (прыгавораны да расстрэлу за падбухторванне да бунту праз забабоны, ён у выніку быў абвешчаны савецкім шпіёнам[90]). У 1926 г. віцебскі дэкан кс. Леанард Бараноўскі першым з каталіцкіх духоўных асобаў трапіў у славуты лагер на Салавецкіх астравах. Калі праз год да яго далучыўся пробашч Баляслаў Сласканас, які ў Віцебску атрымаў званне біскупа, парафіяне Св. Антонія і Св. Барбары адважыліся грамадою стаць на яго абарону. У петыцыі ў прэзыдыум Цэнтральнага выканаўчага камітэта СССР яны сцвярджалі, што арыштаваны не мог ніякім чынам выступаць супраць камуністаў, таму што ўсе (падпісаныя на пяці далучаных старонках) на ўласныя вушы чулі, як падчас казанняў ён "цытаваў словы Святога пісьма, дзе гаварылася аб тым, што няма такой улады, якая не паходзіла б ад Бога". У наступнае дзесяцігоддзе пераследаванні ўзмацніліся, і на падобныя праявы святой наіўнасці цяжка было разлічваць. У 1933 г., ледзьве праз 10 дзён пастырскай службы, ДПУ арыштавала і саслала ў Архангельск пробашча абедзвюх віцебскіх парафій ксяндза Юзафа Барадзюлю. У час найвялікшага сталінскага тэрору ў лістападзе 1936 г. пасля доўгага знаходжання ў Салавецкім лагеры ў Віцебск прыбыў ксёндз Адольф Філіп. Вясною 1937 г. у касцёле Св. Антонія ён адправіў апошнюю ўрачыстую велікодную службу. Адразу пасля яе пабернардзінскі касцёл быў зачынены ўладамі[91]. Рэлігійнае жыццё ў горадзе цалкам перапынілася. На падставе рашэння гаркама (гарадскога камітэта) пачалося прыстасаванне будынка касцёла для гімнастычнай залы медыцынскага

[90] *x. Józef Kłos.* Grymas szatana // Wiadomości dla Duchowieństwa (Poznań). R. 10. 1923. Nr. 4. S. 60 – 63.

[91] Гл.: *Roman Dzwonkowski.* Kościół katolicki w ZSRR 1917 – 1939. Zarys historii. Lublin, 1997. S. 139, 221, 228 – 229, 287, 355, 399 – 400; id. Leksykon duchowieństwa polskiego represjonowanego w ZSRR 1939 – 1988. Lublin,2003. S. 132 – 134.

інстытута. Калі ў 1939 г. у выніку ўмяшання службы аховы помнікаў [!] перабудову ўдалося стрымаць, не было ўжо часткі алтароў, абразоў, арганаў і званоў. Хутка ў агалелым будынку падвесілі маятнік Фуко і адчынілі музей атэізму, у якім размясцілі "забабоны" са збораў ратушы.

У часы нямецкай акупацыі (ліпень 1941 – чэрвень 1944) касцёл зноў служыў католікам, якія, устанавіўшы фісгармонію, аднавілі рэгулярныя набажэнствы. У верасні 1941 г. праваслаўным былі перададзены шматлікія музейныя экспанаты, сярод якіх самымі каштоўнымі былі мошчы св. Ефрасінні, урачыста перанесеныя ў Пакроўскую царкву (былы касцёл трынітарыяў), а пазней (восенню 1943) – у Полацк[92]. Падчас савецкага наступлення вясной 1944 г. касцёл страціў вежы, верхавіны і дах, аднак муры і скляпенні заставаліся ў адносна добрым стане. Непасрэдна пасля вайны разабралі спалены кляштар. Святыню разбурылі каля 1958 г.[93]

Зараз на падмурках бернардзінскіх будынкаў знаходзіцца выкладзеная гранітнай пліткай прамавугольная плошча. Яе паўднёвую частку, на месцы кляштарнага агарода, займае (з 1987) фантан трох рэк (Дзвіны, Віцьбы і Лучосы), персаніфікаваных у адлітых з бронзы фігурах аголеных кабет, усталяваных над басейнамі. Частка пляца, якая рассцілаецца над падмуркамі касцёла з паўночнага боку, злучаецца з мостам (так званы мост 1000-годдзя Віцебска), перакінутым праз рэчышча Віцьбы да бетоннага будынка на Кстоўскай гары, у якім знаходзіцца Цэнтр культуры. Гэтая лінія вызначае больш-менш вось касцёла, фасад якога выходзіў на сярэдзіну шырыні сучаснай вуліцы Леніна (раней яна называлася Вялікай, а пазней – Смаленскай)[94].

* * *

Фасады бернардзінскіх будынкаў стваралі васьмідзесяцідвухмятровае ўсходняе крыло Рынкавай плошчы. Розніца ўзроўняў паміж яго найвышэйшым пунктам, які вызначаў нарожнік паўночнай вежы касцёла, і манаскімі крамамі ў нарожніку гаспадарчага дзядзінца, што знаходзіліся бліжэй да моста, даходзіла да 5 метраў[95]. На адрэзку фасада касцёла гэты спад быў найбольшы і перавышаў два метры. Ва ўсходнім накірунку, ужо за прэзбітэрыем, пляцоўка крута спадала ў рэчышча Віцьбы. Умовы мясцовасці, безумоўна, не спрыялі працам і вымагалі частковай нівеліроўкі пляцоўкі, якая, быць можа, была выканана заангажаваным на тое архітэктарам Фантанай.

Касцёл, які нязменна называлі трохнефавай базілікай, на самой справе быў аднанефавай святыняй. Базілікальны

[92] *Віцьбіч Ю.* Ня змоўклі віцебскія арганы. С. 78 – 79.

[93] Зрушаная выступленнем у лютым 1956 г. Мікіты Хрушчова на ХХ з'ездзе КПСС хваля антырэлігійнай прапаганды спавадавала знішчэнне былога касцёла езуітаў (13.IV.1957), фары (IV.1957) і старадаўняй Дабравешчанскай царквы (23.XII.1961). Пасля яе ў Віцебску засталіся кукса барочнай вежы ратушы, корпус кляштара базыльянаў, у якім размяшчаецца тэхнікум, а таксама толькі два апусцелыя касцёлы, што стаялі на менш каштоўнай архітэктурнай перыферыі: класічны трынітарскі касцёл (зараз праваслаўны сабор) і неараманскі касцёл Св. Барбары (зараз каталіцкая катэдра). Дата разбурэння касцёла бернардзінцаў дакладна невядома. Ён яшчэ ёсць на фотаздымку 1957 г., які друкуе Алена Квітніцкая. На здымку ратушы 1959 г. яго ўжо няма (http://evitebsk.com/w/images/b/b6/Ratusha-1959-ed.jpg).

[94] Пасля заканчэння ў 1973 г. пашырэння і спрамлення вуліцы Леніна ў яе ўсходняй частцы засталіся толькі два будынкі, якія стаяць каля моста праз Віцьбу (суч. № 33 і 35). Той, што стаіць бліжэй да ракі, паходзіць, быць можа, з канца XVIII ст. (гл. акварэлі Юзафа Пешкі і планы горада), у сярэдзіне XIX ст. быў першай сядзібай гатэля Хрысціяна Бразі. Другі, які раней прылягаў да былога кляштара бернардзінцаў, пабудаваны на пачатку ХХ ст., хутчэй за ўсё, па праекце гарадскога архітэктара Ціхана Кібардзіна.

[95] *Чантурыя Ю.У.* Гарады і час. У кн.: Страчаная спадчына. Уклад. Т.В. Габрусь. Мінск, 1998. С. 254 – 262.

трохарачны корпус меў шырокі (11,8 м) неф, які ўключаў і квадратныя капліцы[96]. Пара рызніц на іх падаўжэнні ахоплівала квадратны прэзбітэрый, крыху вузейшы за неф, выдзелены аркай і замкнуты апсідай з вокнамі на двух узроўнях, якая часткова выступала за прамавугольны абрыс галоўных муроў. Унутраная прастора вылучалася кампазіцыйнай сцісласцю і гарманічным выглядам у акадэмічна-класічнай рэдакцыі. Неф падзялялі чатыры масіўныя слупы, што мелі форму латарынгскага крыжа. Аблягаючыя іх пары тасканскіх пілястраў былі звязаны агульнымі цокалямі і ламанымі адрэзкамі выпуклых бэлек. Яны абягалі ўсю ўнутраную прастору, ствараючы апору для шырокіх гуртаў, якія крыжам падзялялі арачныя скляпенні. Капліцы, накрытыя калыскамі, перпендыкулярнымі восі касцёла, асвятляліся праз паўкруглыя вокны і злучаліся паміж сабою больш нізкімі пераходамі[97]. Вертыкальную камунікацыю забяспечвалі цыліндрычныя лесвіцы, якія размяшчаліся ў глыбі муроў па абодвух баках музычнай галерэі, што абапіралася на два слупы і выступала ўглыб нефа.

Апісаная арганізацыя прасторы, якая выводзіцца з мадэлі святыні кармелітаў босых (Вільня – 1633, Львоў – 1634, Глыбокае –1639, Варшава – 1643), пазней замацаваная і мадыфікаваная ў барочнай архітэктуры Рэчы Паспалітай ў працах аселых у Варшаве італьянскіх архітэктараў[98], знайшла ў асобе Юзафа Фантаны адданага энтузіяста. У 40-х гг. XVIII ст. архітэктар паўтарыў яе ў Стваловічах, у віцебскай кафедральнай царкве ў гонар св. Язафата (тут дакладна капіруючы праект Анорыя Лонгі 1613 г.) і нават у бялыніцкіх кармелітаў, дзе насуперак логіцы цэнтральнага плана падзяліў корпус падоўжанымі “латарынгскімі” слупамі. Варта заўважыць, што тып шырокай арачнай апоры, падтрыманай парамі пілястраў (з двух або чатырох бакоў), які на землях Вялікага Княства з’яўляўся спарадычна, у сакральнай архітэктуры Віцебска цешыўся папулярнасцю шмат гадоў[99].


Згаданая вышэй асацыяцыя віцебскага фасада з касцёлам Св. Крыжа ў Варшаве не была цалкам безпадстаўнай. Абодва двух’ярусныя фасады вылучала незвычайная шырыня (Віцебск – 27,2 м, Варшава – 40 м). У абодвух трох’ярусную сярэднюю частку фланкіравалі масіўныя чатырохгранныя вежы з маляўнічымі навершшамі. Улічваючы наяўнасць прыступак і лесвічных пляцовак перад уваходамі абедзвюх святынь (у Віцебску яны мусілі нівеліраваць перапад рэльефа), параўнанне, аднак, было чыста візуальнае, выкліканае перш за ўсё адчуваннем манументальнасці. Было яно ў гэтым выпадку ўзмоцнена лакалізацыяй будынка на вяршыні ўзгорка. Бачны звычайна ў скарачэнні перспектывы, ён раскрываўся паступова. Трох’ярусныя вежы быццам бы аддаляліся, экспануючы заглыбленую амаль на 3,5 метры сярэднюю частку фасада. Як у праектах для Бялынічаў

[96] Згодна з памерамі, якія былі выкананы ў 1946 г. у час экспедыцыі Маскоўскага політэхнічнага інстытута, асобныя параметры пабудовы былі наступныя: шырыня фасада 27,13 м; вежаў – 6,05 м; корпуса (знутры) – 23,3 м; партала – 2,42 м; аркад – 4,1 м; капліц – 3,3 м. Неф меў памеры 11,77 х 18 м; прэзбітэрый – 10,4 х 10,1 м; рызніца – 4,65 х 7,6 м. Слупы 2,85 х 1,64 м з пілястрамі шырынёй 96 см. Сярэдняя шырыня капліц складала 3,3 м. Мінск, УП “Белрэстаўрацыя”, суч. Цэнтр па рэгенерацыі гісторыка-культурных ландшафтаў тэрыторый (далей – ЦРГКЛ).

[97] Паўкруглыя тэрмальныя вокны асвятлялі пабудаваныя ў той жа час касцёлы ў Бялынічах (1742), Вістычах (1848) і Мядзелі (да 1754).

[98] Гл.: *Maria Brykowska.* Architektura karmelitów bosych w XVII – XVIII wieku. Warszawa, 1991; *Adam Miłobędzki.* Architektura polska XVII wieku. Warszawa, 1980. S. 386 – 389.

[99] У Віцебску падобныя слупы падзялялі ўнутраную прастору касцёлаў дамініканцаў і трынітарыяў, а таксама цэркваў Уваскрасенскай (Заручаўскай), Сямёнаўскай і Спаскай. На Віцебшчыне такой жа структурай вылучаецца святыня дамініканцаў у Смалянах каля Оршы. На захадзе княства асобныя прыклады знаходзім у цыстэрцыянцаў у Вістычах пад Брэстам і кармелітаў босых у Гродне. Прагглядаецца яна таксама ў інспіраваным планам святыні варшаўскіх візітак касцёле місіянераў у Краславе і парафіяльным касцёле ў Весях.




Усходняе крыло і план віцебскіх рынкаў у канцы XVIII ст.:
a) ратуша, b) крамы (мясныя лаўкі), c) касцёл Св. Антонія, d) кляштар бернардзінцаў,
e) брамка на гаспадарчы дзядзінец, f) бернардзінскія крамы, g) камяніца Ардынскіх,
h) "езуіцкі" мост, i) калегіум, j) фурта (школа езуітаў), k) касцёл Св. Юзафа,
l – m) губернатарскія будынкі, n) Уваскрасенская царква.
Паводле Чантурыя, 1998. Апрац. В. Баберскі

і віцебскай фары, кампазіцыйнай асновай яго ніжняга яруса стала трыумфальная арка. Яна мела тут форму серліяны (венецыянскага акна), падзеленай чатырма тасканскімі калонамі, якія на ¼ свайго аб'ёму былі заглыблены ў сцяну. Цэнтральную частку аркі вызначала неглыбокая ніша, узарваная архівольтамі <…>. Калоны, што размяшчаліся бліжэй да ўвахода, выступалі наперад, трымаючы аздобу ў выглядзе чвэрцяў круга, якая нясмела датыкалася да акна другога яруса, перад якім знаходзіліся "галерэя для капэлы з жалезнымі кратамі". Крайнія калоны суправаджала, узмацняючы эфект светлацені, закругленне сцяны – пэўны апазнавальны знак архітэктара[100].

Матыў прысценнага порціка, завяршэнне якога трапляе на вышэйшы ярус фасада, можна знайсці ў шмат якіх творах "малой" і манументальнай барочнай архітэктуры[101]. Кіруючыся гэтым пранікненнем планаў і счапленнем ярусаў, класічная дысцыпліна трымалася нават у найбольш "авангардных" творах варшаўскіх архітэктараў. Кампазіцыйнае натхненне для прызямлення бернардзінскага фасада Фантана мог атрымаць як ад графічных узораў і агледжаных падчас італьянскага падарожжа ў 1734 г. рымскіх будынкаў Марціна Лонгі (Santi Vincenzo e Anastasio, 1644) або Карла Фантаны (San Marcello na Corso, 1682)[102], так і (што выглядае больш

[100] Гл.: *Boberski W.* Późnobarokowa cerkiew… S. 136 – 139.

[101] Сярод іншых, кракаўская калегіята св. Ганны, звязаная з ёю пад гэтым пунктам гледжання царква базыльянаў у Бялай Падлясцы або брэсцкія касцёлы брыгітак і трынітарыяў.



План касцёла бернардзінцаў у Віцебску (1742 – 1749, архіт. Юзаф Фантана). Паводле памераў 1946 г. са збораў ЦРГКЛ. Апрац. В. Баберскі


праўдападобна) фасадаў касцёлаў у Карчэве (1728 – 1732) і Драгічыне (1734 – 1738), звязаных з яго настаўнікамі – Каралем Баем і старшым братам Якубам.

Класіцызаванае барока касцёла Св. Антонія ажыўлялі навершшы. Верхнія ярусы вежаў са счасанымі вугламі, якія абапіраліся на валютныя сплывы, аздаблялі філёнкі сляпых шчытоў для гадзіннікаў, яны лагодна ўздымалі ў прастору бляшаныя шлемы, досыць плоскія, што неслі меньшыя "каплічкі" аналагічнай формы. Валютныя сплывы ахоплівалі таксама шчыт, што знаходзіўся паміж вежамі, ён быў аздоблены нішай з абразом патрона касцёла. Фрагменты рванага карніза паўкругам накрывалі навершша шчыта і дзве пілястры, якія спускаліся ўніз. Частка завяршэння прэзбітэрыя таксама атрымала эфектную кульмінацыю. На аттыкавым цокалі ўзвышалася аркада, якая абапіралася скрыўленымі сценамі, што сплывалі да валют, над ёю ўзносілася вежачка сігнатуры[103].

Цытаваны вышэй ліст гвардыяна Бабятыньскага паказвае, што верхнія ярусы вежаў і шчыт фасада паўсталі толькі пасля I падзела. Няма ніякай упэўненасці, што і далей карысталіся праектамі Фантаны, затое варта заўважыць, што формы, падобныя бернардзінскім вежам, з'явіліся ў архітэктуры віцебскіх святынь, што былі скончаны або паўсталі ў 4-й чвэрці XVIII ст., у часы рускага панавання[104]. Сярод іх была базыльянская катэдра на Успенскай гары, запраектаваная Фантанай у 1745 г., аднак скончаная пасля доўгага перапынку праз 30 гадоў. У святле сучасных дадзеных не мае падстаў меркаванне Тамары Габрусь, якая прызнала "віцебскага" архітэктара папярэднікам

[102] Гл.: *Józef Skrabski.* Paolo Fontana, nadworny architect Sanguszków. Tarnów, 2007. S. 20, 24 (wg Castello, archiwum parafialne. Libro de Battesimi, matrimony e morti della Chiesa Parch. Di Castello comincenando dall 1695. S. 17 r). У студзені 1734 г. Юзаф, сын архітэктара Юзафа, што жыў у Варшаве, у Кастэла быў хросным Ружы, пляменніцы архітэктара Сангушак Паўла Антонія Фантаны. У лютым стаў хросным бацькам Марыяны, малодшай сястры Даменіка Мярліні. Не падлягае сумненню, што падарожжа васемнаццацігадовага варшавяніна на радзіму продкаў працягвалася даўжэй і ўключала таксама Рым. Яго знаходжанне ў Літве можна дакументальна пацвердзіць з пачатку 1738 г.

[103] У познебарочнай архітэктуры Вялікага Княства Літоўскага характар навершшаў над прэзбітэрыямі меў некалькі варыянтаў. Шчыты, насаджаныя на аркі апсід, аздаблялі ў Віцебску касцёл езуітаў і Рынкавую Уваскрасенскую царкву. Сустракаем іх у цэрквах Беразвечча і Веліжа, у касцёлах падвіленскай Кальварыі, Глыбокага, Івянца і Прыдруйска. Навершшы суправаджалі таксама прамыя і трохкутныя завяршэнні (фара св. Тройцы і Барысаглебская царква ў Віцебску, езуіты ў Вільні, Дынабургу, Мінску і Лучаі, базыльяне ў Талачыне, дамініканцы ў Вільні і Забелах, санктуарыум у Шыдлаве і фара "Вітаўта" ў Гродне). Калі прэзбітэрый быў ніжэйшы, шчытом акцэнтаваліся сцены корпуса нефа (віленскія касцёлы бенедыкцінак, місіянераў і кармелітаў у гонар св. Юрыя, касцёл піяраў у Лучаі, сабор Св. Сафіі ў Полацку).



Планы касцёлаў, праектаваных Юзафам Фантанай:
a) Стваловічы – 1740, b) Бялынічы – 1742, c) Віцебск, фарны касцёл Св. Тройцы – 1754,
d) Віцебск, базыльянская катэдра – 1745, e) Будслаў – 1767 (гіп.).
Апрац. В. Баберскі

“віленскага барока” і адметнейшым, побач з Янам Крыштафам Глаўбіцам, яго творцам[105]. У 40-х і 50-х гадах XVIII ст. ён, несумненна, належаў да найважнейшых на землях Вялікага Княства Літоўскага прадаўжальнікаў класіцыстычнай плыні барочнай архітэктуры, з вялікай вернасцю працягваючы атрыманыя ў спадчыну ўзоры, пачэрпнутыя з мастацтва Рыму і роднай Варшавы.

Чарговым пацверджаннем гэтага меркавання быў галоўны бернардзінскі рэтабулюм (1749 – 1753). Ён істотна адрозніваўся ад сучасных яму твораў малой архітэктуры “віленскага барока”. Гэта была салідная тэктанічная структура, вычарчаная з дапамогай цыркуля і лінейкі, пазбаўленая плаўных крывых, выпукласцяў, ажурнасці, выцягнутых са стукавага цеста профіляў і розных іншых завітушак, што былі візітнай карткай віленскіх алтароў. Структура, упісаная ў абрыс паловы эліпса, размяшчалася паміж вокнамі апсідыяльнага завяршэння прэзбітэрыя. Яе

[104] Форма шлема, узнесенага над шчытом гадзінніка, не ўваходзіць у рэпертуар формаў, распаўсюджаных у эпоху барока ў Вялікім Княстве Літоўскім. Па-за межамі Віцебска яна выступала спарадычна (Невель, Веліж, Вольна, Кальварыя пад Вільняй, Датнаў, Уладзіслава).

[105] *Габрусь Т.* Мураваныя харалы…, с. 219 – 222.







Фасады, праектаваныя Юзафам Фантанай:
a) Стваловічы, 1740 – 1746 (скончаны Янам Кшыштафам Глаўбіцам).
Фота Пятра Ямскага, b) Бялынічы, 1742 – 1749. Рэканстр. В. Баберскага,
c) Віцебск, базыльянская катэдра, 1745 – 1778. Рэпр. паводле Слюнькова, 2002,
d) Віцебск, фара Св. Тройцы, 1754 – 1762. Фота са збораў ЦРГКЛ



Фасад парафіяльнага касцёла ў Карчэве (фрагмент), 1728 – 1732.
Праект Carlo Antonio Bay (?). Фота В. Баберскага



Фасад касцёла бенедыкцінак у Драгічыне (фрагмент), 1734 – 1738.
Праект Якуба Фантаны. Фота В. Баберскага



Вежы віцебскіх святыняў: a) касцёл бернардзінцаў, каля 1775, b) базыльянская катэдра, 1775 – 1778, c) царква св. Пятра і св. Паўла, 1779 – 1787, d) царква базыльянак у гонар св. Духа, 1792 – 1793. Апрац. В. Баберскага

чатыры карынфскія калоны на дыяганальна пастаўленых цокалях неслі масіўныя бэлькі з мадульёнамі пад выдатным карнізам. Над ёю, на восях вонкавых калон, франтоны ў чвэрць круга выступалі перад завяршэннямі скляпенняў, пакрытыя па дыяганалі валютнымі абрамленнямі. Яны фланкіравалі глорыю, утвораную з аблокаў і промняў, якая была размешчана на вышыні акна ў сцяне апсіды. У сярэдзіне канструкцыі знаходзіўся абкружаны аўрай цудадзейнасці, намаляваны на дрэве, прыкрыты пазалочанай шатай і абвешаны па баках вотамі абраз патрона касцёла. Ён прадстаўляў стаячую постаць св. Антонія Падуанскага з дзіцяткам на руках. Знаходзіўся ён у ўпрыгожанай эдыкуле з дзвюх канеліраваных калон, якія падтрымлівалі франтон у форме паловы эліпса, перарваны пастаментам з крыжам. Архітэктанічная аправа выявы, якая ўзмацняла ўражанне глыбіні, быць можа, была той пазалочанай *фіглятурай*, пра якую згадвалася ў кантракце. З двух бакоў абраза, паміж калонамі, стаялі незвычайнай вышыні стукавыя статуі св. Хрысанта і св. Дар'і, малжонкаў-мучанікаў, якія пашыралі хрысціянства ў Рыме ў часы панавання цара Валенса, за што былі пахаваны жывымі. Цяжка назваць нагоду звароту менавіта да гэтых герояў агіяграфіі, якія рэдка згадваюцца ў мастацтве барока, але добра вядомы таксама ў традыцыі ўсходніх касцёлаў[106]. Фігуры вылучаліся зграбнымі прапорцыямі і тэатральнай жэстыкуляцыяй. Св. Дар'я ў вэлюме на галаве, апранутая ў доўгае адзенне з шырокімі, мякка заламанымі драпіроўкамі, скіроўвала далоні да сэрца. Яе муж быў прадстаўлены ва ўзбраенні, шлеме, увенчаным буйнымі пер'ямі, злёгку нахіляў галаву і правай рукою ўказваў на сэрца, у выцягнутай жа ўбок левай руцэ трымаў, відаць, харугву. Дзве пышныя стукавыя фігуры – Вера і Надзея – у свабодных позах сядзелі на сегментах разарванага франтона, прэзентуючы атрыбуты ўвасобленых цнот: крыж і якар.

Адзіны зафіксаваны ў іканаграфіі рэтабулюм "віцебскага" Фантаны пацвярджае яго вернасць рымска-варшаўскай мастацкай

[106] У пачатку XIX ст. візітатары касцёла знаходзілі толькі дзве рэліквіі, атрыманыя ў 1741 і 1743 гг. і змешчаныя ў срэбных рэлікварыях: св. Крыжа і св. Мучаніцы Верэкунды. Гл.: НГАБ, 1781 – 26 – 1411, с. 52 адв.

арыентацыі. Яго генезіс сягае да вядомых паводле гравюр прац Берніні, Бараміні і Карла Фантаны, а асабліва Себасціяна Цыпрыяні і Андрэя Поца, падхопленых над Віслай перад усім вучнем апошняга Карла Антоніа Баем (памёр у 1740)[107]. Бадай што самай блізкай варшаўскай аналогіяй канструкцыі бернардзінцаў быў (верагодней за ўсё, праектаваны Баем) галоўны алтар касцёла кармелітаў босых на Лешне, узведзены гетманам Юзафам Патоцкім у 1731 г.

Расцягнутая на ўсю шырыню прэзбітэрыя структура табернакля ў Віцебску, да канца не рэалізаваная, уяўляла сабой нізкую перагародку, якая аддзяляла неф ад манаскага хору і адначасова вылучала алтар у завяршэнні апсіды. У познебарочных касцёлах Вялікага Княства Літоўскага такая двухпланавая сцэнаграфія ўжывалася часта, можа быць, свядома прывязваючыся да правіла ізаляцыяі нефа ад *Sancta sanctorum*, якой прытрымліваліся ў царкоўных пабудовах суседзяў. Такую "ларэтанскую" аранжыроўку ўнутранай прасторы атрымаў, між іншым, санктуарый Марыі ў Бялынічах, узведзены Юзафам Фантанай для кармелітаў босых (фундаваны таксама ваяводам Марцыянам Агінскім)[108]. Найпрыгажэйшая перагародка – табернакль – упрыгожыла касцёл бернардзінцаў у Друі (1764 – 1767). Была яна, верагодна, працай архітэктара з роду Паракка і прадстаўляла тыповыя для "віленскага барока" формы.




Вежы касцёла Св. Антонія ў Віцебску. Фота каля 1944 г.

Да таго самага стылю варта аднесці каплічныя алтары, якія трапілі на фотаздымак і былі выкананы Людвікам Яздоўскім у 1756 – 1758 гг., а таксама алтар Св. Францішка, што стаяў у канцы паўночнай лініі капліц і быў працай таямнічага Яна Азялевіча 1767 г. Першыя ўяўлялі сабой простыя структуры з больш-менш роўнымі ярусамі. Ніжні ярус ахоплівала пара наўскос стаячых калон з вычварнымі капітэлямі. Фундатараў услаўлялі пышныя гербавыя картушы, змешчаныя на простым антабленменце над абразамі. Стукавая бірузовая дэкарацыя канцэнтравалася ў завяршэнні, якое прадстаўляла фігуры ў глорыях (адпаведна Марыі і Хрыста). Ніжэй на карнізе знаходзіліся ўкленчаныя анёлы і стаялі дзве вялікія вазы. Каплічны алтар св. Францішка меў адзін ярус. Паўкруглую закрытую нішу з абразом патрона фланкіравалі дыяганальныя калоны, можа быць, па дзве з кожнага боку[109]. Узняты арачны карніз над абразом нёс трапецыявідны шчыт, які стукавымі дэкарацыямі даходзіў да скляпення.

Пакінуўшы касцёл Св. Антонія, некалькі слоў належыць прысвяціць іншым

[107] Пра генезіс і польскую рэцэпцыю гл.: *Jakub Sito.* Wielkie warsztaty rzeźbiarskie Warszawy doby saskiej. Modele kariery – formacja artystyczna – organizacja produkcji. Warszawa, 2013. S. 88 – 100; id. Nagrobek kardynała Michała Stefana Radziejowskiego (1645 – 1705). [W:] Serce miasta. Kościół Świętego Krzyża w Warszawie. Red. Kazimierz Sztarbałło i Michał Wardzyński. Warszawa, 2010. S. 222 – 225; *Jerzy Kowalczyk.* Rola Rzymu w późnobarokowej architekturze polskiej // Rocznik Historii Stuki. XX. 1994. S. 235 – 242.

[108] *Boberski W.* Maryjne sanktuarium… S. 117 – 118.



Варшава, алтар касцёла кармелітаў босых на Лешне, 1731. Праект Карла Антоніа Бая (?). Фота з архіва В. Баберскага


будынкам канвента. Першапачаткова вышэйшы дах двухпавярховага кляштара ледзьве дасягаў хрыбтом карніза першага яруса фасада святыні. Прылягаў ён да яе з поўдня і ахопліваў невялікае квадратнае падвор'е, на якое выходзілі вокны калідораў. Фасад ён меў суровы, пазбаўлены дэкору, з вокнамі, якія да сярэдзіны XIX ст. мелі форму прамавугольніка. Амаль увесь яго цокальны паверх выконваў гаспадарчыя функцыі. Пасля частковай нівеліроўкі грунту з боку рынкавай плошчы тут размясціліся дзевяць крам і кляштарная брама з ганкам перад ёю, адкуль лесвіца вяла ў келлі, размешчаныя на вышэйшых паверхах. Пяціваконная трапезная, накрытая люстраным скляпеннем і аздобленая партрэтамі фундатараў, знаходзілася на першым паверсе ва ўпрыгожанай рызалітамі паўднёва-ўсходняй вуглавой частцы. Верхні паверх усходняга крыла займалі пакоі для навіцыяту, скарбніца і бібліятэка. З боку фасада высокая мураваная брама з маляўнічым навершшам і фланкіраваным калонамі арачным праездам звязвала кляштарны будынак з аднапавярховым павільёнам, у якім знаходзіліся яшчэ шэсць крам, што належалі кляштару. Брама вяла на трапецападобны гаспадарчы дзядзінец, з поўдня замкнуты злучанымі парканам будынкамі стайні і вазоўні, з усходу ж – бровара і лазні. Над мураванымі пабудовамі ўзвышаўся драўляны свіран з двухпавярховай аркаднай галерэяй, відаць, ужо не той, што згадваўся ў фундушы ваяводы Храпавіцкага, але, быць можа, ён паўтараў яго формы, ідэнтычныя формам лямуса, які захаваўся да нашага часу ў сядзібе гродзенскіх брыгітак (каля 1630 ?). З поўначы дзядзінец быў абмежаваны драўляным плотам, за якім на вышыні прэзбітэрыя касцёла быў разбіты агарод і знаходзілася бернардзінская лядоўня. Некалькі кляштарных пакояў знаходзіліся з паўночнага боку касцёла, у завулку, утвораным *ядкамі, мураванымі ў квадрат*.

* * *

Згаданы вышэй чарговы твор Юзафа Фантаны "віцебскага" атрымаў ролю, адыграную ў стварэнні лакальнай архітэктурнай традыцыі і гарадскога кравіду, якую абяссмерцілі малюнкі Пешкі[110], палотны Шагала, дрэварыты Юдовіна, якая ў расіянах выклікала пачуццё адчужанасці і здзіўлення. Польскія аўтары пісалі пра Віцебск няшмат і без такіх эмоцый. Некалькі энцыклапедычных артыкулаў і нататак

[109] Чатырохкалоннымі былі два іншыя каплічныя збудаванні: брацкі алтар св. Ганны, які замыкаў паўднёвую лінію, а таксама алтар св. Казіміра ў сярэдняй капліцы той жа лініі. Гл. ЦРГКД (гарызантальная праекцыя касцёла 1946 г.).

[110] Камплект з 12 акварэляў з выявамі Віцебска, што захоўваюцца ў Львове, намаляваныя Юзафам Пешкай на пачатку XIX ст., складаюцца ў найлепшы, пластычна аднародны і амаль што поўны партрэт "барочнага горада" на крэсах Рэчы Паспалітай. Відділ мистецтва Львівської наукової бібліотеки ім. В. Стефаника НАН України (далей – LNBAN-WM), сігн. 215536 – 215548.



Віцебск, касцёл бернардзінцаў: a) цокальны паверх фасада, b) брама на гаспадарчы дзядзінец, c) пралёт нефа, d) шчыт паміж вежамі, e) шчыт над апсідай. Апрац. В. Баберскага

у прэсе не ўраўнаважваюць вялікіх прац рускіх і беларускіх гісторыкаў і краязнаўцаў. У масавай свядомасці "караняжаў" не надта прыемнае ўяўленне пра горад, што знаходзіцца на далёкай адлегласці, укараніў грубаваты пан Заглоба, які правакаваў віцебскага ваяводу, гетмана Паўла Сапегу, кпінамі: *Якая галава кепская – мусіць быць з Вітэбска*[111].

На фоне нешматлікіх тэкстаў, наогул скампіляваных з кірылічных публікацый, яскрава вылучаецца артыкул, змешчаны ў 1856 г. на старонках "Dziennika Warszawskiego" ананімным *Беларусам*, якога да Віцьбы прывялі гандлёвыя справы[112]. З літаратурным талентам і праніклівым пачуццём назіральніка ён ухапіў істотныя рысы мясцовай архітэктуры, а такса-

[111] *Henryk Sienkiewicz.* Potop. T. 2. Rozdz. 6.

[112] Гэтым ананімам хутчэй за ўсё быў паэт Арцём Вярыга-Дарэўскі. Гл.: *Хмяльніцкая Л.* Невядомая карэспандэнцыя Арцёма Вярыгі-Дарэўскага? // Віцебскі сшытак. № 5. 2017. С. 114 – 116 – *рэд.*

ма змены, якія яна перацярпела падчас расійскага панавання[113]:

"Вялікая розніца паміж гэтымі двума беларускімі гарадамі – Магілёвам і Віцебскам. Магілёў нядаўна цалкам як Фенікс з попелу адроджаны, элегантны, вытанчаны, свежанькі, як цацка забудаваны, падобны на фельетоны французскіх часопісаў, якія шмат і прыгожа гавораць, не распавядаючы нічога; Віцебск наадварот патыхае старым жыццём, кожную хвіліну сустракаеш у ім тут і там старыя, нязграбныя камяніцы з высокімі дахамі, няма на іх архітэктурнай аздобы, адны толькі тоўстыя без меры слупы выступаюць са сцен, беручы прыклад з пілястраў, а на фасадах не аднаго з тых дамiскаў спаткаеш надпіс: "Года госпадняга 1654 або 1735 (раней, пазней) на хвалу Богу, да маёй і бліжніх маіх выгады, Якуб Вансовіч" (ці хто іншы).

Горад досыць разлеглы, але нерэгулярна і дрэнна забудаваны – камяніца на некалькі паверхаў стаіць тут побач з напалову паваленай драўлянай яўрэйскай халупай, кантраст паўсюль надзвычайны. Аднак тут і там можна спаткаць будынкі, больш вартыя ўвагі. Але як гэта здараецца звычайна ў губернскіх гарадах, панове архітэктары не прывыклі трымацца аднаго стылю, ордэр карынфскі, дарычны, іянічны і візантыйскі змяшаныя разам; сапраўдны архітэктурны хаос. Аднак калоны, відаць, былі больш за ўсё мілыя мясцоваму архітэктару, таму ў большай частцы самыя значныя будынкі ўпрыгожаны калонамі, хоць, кажучы праўду, гэтыя калоны ніяк не вызначаюцца добрымі прапорцыямі, суадносіны падножжаў, капітэляў, карнізаў і іншых частак цалкам страчаны, злеплены яны чыста па-беларуску, толькі на вока. […]

Святынь у Віцебску, як у горадзе губернскім, дастаткова. Некаторыя з іх вельмі прыгожыя, а высокія вежы званніц ужо здалёк уражваюць падарожнікаў, што прыбываюць у горад з боку Магілёва. Шмат з гэтых святыняў вызначаюцца прыгажосцю стылю, які, як я ўжо казаў, у іншых будынках Віцебска па меншай меры не ўражвае, аднак што найперш здзіўляе ў шмат якіх святынях, дык гэта мешаніна стыляў у розных іх частках: касцёл у гусце чыста італьянскім ці гатычным нясе купал з візантыйскім смакам, што сведчыць пра не вельмі вялікія архітэктурныя здольнасці мясцовага будаўніка, бо пры ўсталяванні купала ні на адной з гэтых святынь ён не змог дастасавацца да цэлага, да дамінуючага стылю, так што гэтыя купалы здаюцца непатрэбнымі дадаткамі, без якіх касцёлы маглі б абысціся…"

ДАДАТКІ

Дадатак 1.
Кантракт з архітэктарам Юзафам Фантанай на заканчэнне будоўлі касцёла бернардзінцаў у Віцебску, 10 лютага 1742 г. у Вільні. АРВ, S-wit-1, s. 43.

У імя Бога года тысяча семсот сорак другога дня 10 лютага паміж мною, Тэкляю з Лярскіх Агінскай, [жонкай] віцебскага ваяводы, фундаторкай віцебскага канвента, і паміж намі, Тадэвушам Агінскім, пісарам В[ялікага] К[няства] Літ[оўскага], старастай перавальскім, Казімірам Гуркай, пісарам земскім віцебскім, як апекунамі Я[сна] В[яльможнай] ягамосці пані [жонкі] віцебскага ваяводы, і паміж намі, ксяндзамі бернардзінцамі віцебскага канвента, і ягамосцем панам Юзафам Фантанай,

[113] *P. A. W. Białorusin.* Korespondencja (opóźniona) z Witebska d. 24 sierpnia 1855 // Dziennik Warszawski. 1856. Nr. 12. S. 4.

архітэктарам Я[го] К[аралеўскай] М[ілас]ці, паўстаў кантракт, які абодва бакі абавязваюцца выконваць наступным чынам:

Што ягамосць пан Юзаф Фантана абавязуецца і дэкларуе касцёл наш віцебскі з усім [неабходным] скончыць паводле ім самім падрыхтаванага праекта, запрасіўшы муляраў, цесляроў, сталяроў, слесараў, кавалёў, шкляроў і ўсіх да будаўніцтва патрэбных рамеснікаў; і што з усім, як то замкамі, вокнамі, дзвярыма, дахамі і іншымі рэчамі, якія патрэбны для заканчэння касцёла, сакрысціі і скарбца, ягамосць пан архітэктар дасканала, фундаментальна, добра, моцна і грунтоўна пабудаваць абяцае і дэкларуе, а яснавяльможнай фундатарцы толькі ключы пасля заканчэння перадасць.

А мы павінны ўсе матэрыялы прадставіць, як то цэглу, вапну, жвір, ваду, дрэва, дахоўку, жалеза, па ўказанні ягамосці пана архітэктара. Абавязуемся [несці] як усе кошты, на сябе прынятыя па грунтоўнаму і фундаментальнаму будаўніцтву віцебскага касцёла, так і [пакрыць] цану турбот ягамосці пана архітэктара, дэкларуем даць памянёнаму ягамосці тры тысячы талераў бітых, і гэтыя грошы падзяляем на часткі, што значыць пры [заключэнні] кантракта тысячу талераў бітых, а іншыя пазней, прапарцыянальна працам, будзем даваць і выплочваць.

Калі б аказалася, што пасля заканчэння будоўлі выявіліся б дрэнна закладзеныя ягамосцем падмуркі, на якія ўказвалі б расколіны, тады ягамосць пан архітэктар сваім коштам павінен будзе зрабіць рамонт. У выпадку ж невыканання або, барані Божа, падману ў якім-небудзь пункце, або нестрымання слова кантракта вышэйпамянёны ягамосць пан архітэктар дазваляе правесці вольнае расследаванне яго асобы і маёмасці.

Каб гэта мела большае значэнне і сілу, я, архітэктар, падпісваюся маёю уласнаю рукою. Пісана ў Вільні дня і месяца, як згадана вышэй. Ю. Фантана.

Дадатак 2.

Кантракт з Юзафам Фантанай на пабудову кляштара бернардзінцаў у Віцебску, 20 сакавіка 1753 г. APB, S-wit-1, s. 63.

Юзаф Фантана паведамляе гэтым сваім гарантыйным запісам вяльможнаму ягамосцю пану Мікалаю Рэвуту, харужаму Віцебскага ваяводства, генеральнаму сіндыку, таксама вялебнаму ягамосцю ксяндзу Лукашу Дамброўскаму, гвардыяну віцебскаму, і ўсяму канвенту ордэна св. Францішка Antiquae Observantiae наступным тое, што я, запрошаны на ўзвядзенне новага мураванага кляштара тых жа ягамосцяў ксяндзоў бернардзінцаў, якое мае адбыцца ў цяперашнім 1753 годзе, павінен гэты кляштар паводле прадстаўленага мною абрысу за кошт кляштара ўзвесці, дагледзець, каб як найлепш праца была скончана да апошняга пункта, на ўсё, што як-небудзь адносіцца да будоўлі, заўсёды даваць распараджэнні і наглядаць [за іх выкананнем], за якую працу мушу атрымаць, згаварыўшыся з памянёным вяльможным ягамосцем панам сіндыкам, а таксама ягамосцем ксяндзом гвардыянам і ўсім таварыствам таго канвента, суму ў дзвесце талераў бітых, і гэтую суму, тут і зараз у рукі мае атрымаўшы, гарантую ўзвядзенне таго кляштара на працягу двух гадоў ад сённяшняй даты; у выпадку аддалення ад гэтай будоўлі павінен буду за ўласны кошт прыставіць такога субалтэрна, які б гэтую будоўлю мог дасканала скончыць, якому я, ніжэй падпісаны, вінен у адпаведнасці з рашэннем аддадную мне зараз суму ў

дзвесце талераў бітых, што, з другога боку, будзе забяспечана на ўсялякай маёмасці і сумах маіх, і яе без судовага разбіральніцтва вольна арыштоўваць дазваляю, і тым даў мой гэты гарантыйны запіс з подпісам маёй рукі ў [прысутнасці] ягамосцяў паноў сведкаў, вусна запрошаных мною.

Пісаны ў Віцебску тысяча семсот пяцьдзясят трэцяга года месяца сакавіка дваццатага дня. Юзаф Фантані;

[засведчылі:] запрошаныя вусна ад ягамосці пана Юзафа Фантаны: Я. Лупя і Ян Ануфры з Гежодаў Гежадовіч.

Дадатак 3.

Кантракт з Юзафам Фантанай на галоўны алтар і табернакль у касцёле бернардзінцаў у Віцебску, 6 жніўня 1749 г. у Марцыянаве. LVIA, 1177 - 1 - 3389.

Северо-восточная часть парка имела, скорее всего, нерегулярный характер, подчиненный ландшафту местности. Здесь была романтическая интимная зона, основу которой формировали два пруда и прилегающие к ним группы деревьев, чередовавшихся с открытыми или полузакрытыми полянами. Пруд, ориентированный с северо-запада на юго-восток, как бы замыкал продольную перспективу основной части парка. Конец оси, образованный руслом р. Полынтупки, фиксировал остров. Наконец, четвертый пруд, расположенный на северо-востоке всего ансамбля, соприкасался уже с естественным природным ландшафтом-гаем. Таким образом, постепенная смена парковых ландшафтов (парадный регулярный парк, пейзажный, природный) создавала определенный ритм и сменяющийся зрительный ряд, что привело к разнообразию и неповторимости этого уникального памятника садово-паркового искусства.

С 1939 г. начался упадок ансамбля. В связи с включением Западной Белоруссии в состав БССР владелец имения Ю. Бишевский был вынужден уехать в Вильнюс, где и умер в 1944 г. Дворец и другие постройки

разрушены во время Великой Отечественной войны. В 1946 – 1948 гг. дворец перестроен под школу-интернат, при этом нарушена первоначальная планировка. Постепенно парк с прудами пришел в запустение и зарос, захламлен, многие деревья погибли. Нарушена его первоначальная планировка вследствие строительства чужеродных по архитектуре зданий и сооружений (жилой корпус школы-интерната, современные дома, сараи, гаражи, конторское здание и т. д.).

Тем не менее сохранившиеся элементы дворцово-паркового ансамбля создают возможность его воссоздания почти в первоначальном виде*.

1991 г.

Архивные и литературные источники:

1. Инвентарь имения Лынтупы 1591 г. (на польском языке) – Отдел рукописей Научной библиотеки Вильнюсского государственного университета. Ф. 4. Д. 39742а. Л. 2 – 4.

2. Статистическое описание имения Лынтупы 1847 г. – ЦГИА Литовской Республики. Ф. 394. Оп. 6. Д. 210. Л. 1 – 5 об.

3. *Антипов В.Г.* Парки Белоруссии. Мн., 1975. С. 89 – 91.

4. *Федорук А.Т.* Садово-парковое искусство Белоруссии. Мн., 1989. С. 97 – 98.

5. *Гошкевич И.И.* Виленская губерния. Полный список населенных мест со статистическими данными о каждом поселении. Вильна, 1905. С. 291 – 293.

6. *Якімовіч Ю.* Лынтупы і Старое Саколіна // Віцебскі рабочы. 17.07.1991.

7. *Rouba N.* Przewodnik po Litwie i Białorusi. Wilno, 1919. S. 117.

8. Polski słownik biograficzny. T. 3. Kraków, 1937. S. 87 – 90, 181.

9. *Baliński M., Lipiński T.* Starożytna Polska. T. 3. Warszawa, 1850. S. 245.

10. Słownik geograficzny Królewstwa Polskiego i innych krajów słowiańskich. T. 5. Warszawa, 1884. S. 851.

11. *Aftanazy R.* Materiały do dziejów rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej. T. IV a. Dawne województwo Wileńskie. Warszawa, 1987. S. 239 – 242.

---

* В переработанном виде этот материал был опубликован: *Якімовіч Ю.* Архітэктурны ансамбль у Лынтупах // Віцебскі рабочы. 1992. 25 і 27 сакавіка.

Юрый ЯКІМОВІЧ

ДАЙШОЎ ПРАЗ СТАГОДДЗІ

У пачатку [19]80-х гадоў пры падрыхтоўцы артыкулаў для “Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі” мне давялося шмат папрацаваць у архівах краіны. І вось аднойчы, праглядаючы дакументы нясвіжскай калекцыі Радзівілаў у Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве ў Мінску*, зусім выпадкова натрапіў на адзін старажытны рукапіс**. На папцы, у якой ён захоўваўся, быў надпіс: “Апісанне замка, горада Віцебска, фальваркаў і двароў”. Рукапіс быў складзены на польскай мове і даволі неразборліва (давялося некалькі дзён патраціць на яго расшыфроўку), а галоўнае – у ім не было пачатковага аркуша з датай складання гэтага дакумента. Параўноўваючы яго з апублікаванымі яшчэ А.П. Сапуновым матэрыяламі па Віцебску, паступова прыйшоў да вываду, што напісаны ён напярэдадні руска-польскай вайны (1654 – 1667 гг.).

Пачынаецца апісанне горада з яго найстаражытнейшай часткі – Верхняга замка, размешчанага ў сутоцы Дзвіны і Віцьбы. Раней яго назва адпавядала рэчаіснасці. Замак, або Замкавая гара, як гэта месца называлі ў старажытнасці, уяўляў сабой высокі пагорак (вышынёй з сучасны пяціпавярховы дом), які дамінаваў над усёй прылеглай мясцовасцю. Роўная пляцоўка наверсе гары (300 х 150 м) выкарыстана ў XIV стагоддзі для будаўніцтва мураванага замка князя Альгерда, які размясціўся на месцы былога віцебскага дзядзінца Х стагоддзя.

Чытаючы апісанне замка, не пазбаўляешся ад думкі пра жудасную карціну разбурэнняў, якія прынеслі яму (як і ўсяму гораду) шматлікія войны. Можна зразумець, што ў той час меркавалася замест разбураных каменных умацаванняў пабудаваць драўляныя сцены і вежы. Частка абарончых збудаванняў была ўжо пастаўлена, у тым ліку дазорная вежа над Дзвіной, сцены-гародні, завершаныя “ізбіцамі” для вядзення агню па непрыяцелю. Аднак такое будаўніцтва нагадвала хутчэй за ўсё “латанне дзірак”, а не новае планамернае ўзвядзенне замкавых умацаванняў. Гэта, відаць, тлумачылася спешнасцю правядзення аднаўленчых работ у прадчуванні новай ваеннай пагрозы.

На тэрыторыі Верхняга замка размяшчаўся жылы пасад, дзе было 47 двароў шляхты і мяшчан. Цікава, што жытлы шляхты названы ў інвентары “дамамі”, у той час як рамеснікі мелі “хаты” і нават “халупы”. Каля жылых збудаванняў стаялі клеці, свірны, пуні, стайні ваяводы, драўляны замкавы арсенал, дзе захоўвалі зброю, кулі і порах. Каля яго сяліліся замкавыя пушкары.

Ніжні замак размяшчаўся на поўдзень і ўсход ад Верхняга на берагах Дзвіны і Замкавага ручая. Сама яго назва сведчыць аб тым, што ён меў больш нізкі рэльеф, чым Замкавая гара. Месца гэта было заселена ўжо ў Х стагоддзі, а ў XIV узнік замак, які, у адрозненне ад мураванага Верхняга замка, быў цалкам драўляным. Інвентар паказвае тут жылы пасад з 96 мяшчанскімі і шляхецкімі дварамі, мураваную Благавешчанскую царкву з драўлянай званіцай каля яе, царкву Параскевы Пятніцы, рэфарматарскі храм, некалькі пунь і іншыя збудаванні.

З Ніжняга замка праз браму і драўляны мост, перакінуты цераз рэчку Віцьбу, траплялі ў трэці гарадскі раён, добра вядомы віцябчанам і зараз. Гэта Узгор’е, куды паступова перамяшчаўся цэнтр дзелавога жыцця Віцебска.

Засяляцца Узгор’е пачало з канца Х – пачатку XI стагоддзя, аднак да другой паловы XVI стагоддзя з’яўлялася звычайным слаба

---

* Зараз Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі – *рэд.*


** НГАБ, ф. 694, воп. 2, спр. 1228 – *рэд.*

ўмацаваным гарадскім пасадам. У 1597 г. горад атрымаў Магдэбургскае права, для будаўніцтва грамадскага комплексу было выбрана Узгор'е, бо Верхні і Ніжні замкі да таго часу ўжо не мелі такой вялікай свабоднай тэрыторыі. Відаць, да гэтага тут існавала ўжо гандлёвая плошча на беразе Віцьбы, таму яе і выкарысталі для далейшай забудовы.

Як выглядала першая драўляная ратуша ў Віцебску, мы не ведаем, бо ніякіх дакументальных крыніц па ёй не захавалася. 14 чэрвеня 1623 г. (па старому стылю) набатны звон ратушы заклікаў гараджан Віцебска на паўстанне. Яму адказалі званы цэркваў. Дакумент тых часоў так апісвае падзею: каля тысячы віцябчан уварваліся ў двор уніяцкага архіепіскапа Іасафата Кунцэвіча, які знаходзіўся каля Прачысценскай царквы, выцягнулі яго з дому і забілі, а потым скінулі яго цела "з гары Прачысценскай, якая досыць над ракой Дзвіною ёсць высокая і прыкрая, над якой і двор яго міласці стаіць…". Потым паклалі труп у човен, адвезлі на сярэдзіну ракі і, добра навязаўшы на шыю камянёў, утапілі. За такое святатацтва каралеўскім указам горад быў пазбаўлены самакіравання, ратуша разбурана, яе звон і званы з усіх цэркваў (акрамя Прачысценскай) пераліты "на памяткі з надпісам аб гэтым злачынстве". "А замест ратушы гасцінны дом, які перад тым быў, меці дазваляем", – так заканчваўся грозны каралеўскі загад.

Гэты гасцінны двор і апісвае інвентар. Гандлёвая плошча была па перыметры акружана крамамі, "паўкрамамі" і каморамі, якіх налічвалася 90. У двух процілеглых баках забудовы крамы і каморы ўтваралі своеасаблівыя гандлёвыя вуліцы. Крамы былі розныя: саляныя, мясныя, "рухлядныя" (гандлявалі球 рознымі гаспадарчымі таварамі) і іншыя. Паўкрамы ад крам адрозніваліся, відаць, тым, што займалі не ўвесь будынак, а толькі яго палову і мелі адзін, а не два ўваходы.

З плошчы вялікія вароты вялі да гасціннага двара, які таксама, як і гандлёвыя рады, уяўляў сабой замкнёны прамавугольны ў плане комплекс. Над варотамі размяшчалася надбудова тыпу мезаніна, над якой узвышалася вежа з гарадскім гадзіннікам. Злева ад варот знаходзілася важніца, дзе захоўваліся гарадскія эталоны вагі, якімі купцы перамервалі прывезенае на продаж збожжа. Каля важніцы збудавана сем



Ратуша і гасцінны двор на "Чарцяжы" Віцебска 1664 г.

камор для купецкіх тавараў. Процілеглую ад варот лінію забудовы складалі дзве “чорныя” (г. зн. курныя) хаты, у якіх прыезжыя “госці” (так называлі ў той час іншаземных купцоў) начавалі і праводзілі свой вольны час. Тут жа мясцілася збудаванне, дзе адбываліся пасяджэнні магдэбургскага суда. Астатнія часткі забудовы гасціннага двара займалі стайня і вялікая “гасцінная” камора.

Далейшы лёс гэтага комплексу нам невядомы. На “Чарцяжы” Віцебска 1664 г. мы бачым выяву драўлянай ратушы. З’явілася яна пасля 1641 г., калі гораду вярнулі Магдэбургскае права. Верагодна, пры ўзвядзенні ратушы выкарысталі будынкі гасціннага двара, прычым сам двор паспяхова працягваў функцыяніраваць. Такое меркаванне тлумачыцца дзвюма акалічнасцямі. Па-першае, другога гасціннага двара не было пабудавана, а такі буйны горад, як Віцебск, не мог абысціся без гэтага комплексу. Па-другое, функцыянальна гасцінны двор добра “сумяшчаўся” з ратушай. Таму, калі гораду вярнулі права на самакіраванне, новага ратушнага комплексу, відаць, не будавалі.

У адной з апошніх публікацый пра віцебскую ратушу XVII стагоддзя сцвярджаецца, што яе ніжні ярус быў мураваны*. Аднак такая думка ўспрымаецца не больш, як гіпотэза. На жаль, мы не маем пакуль што ніводнага больш-менш дакладнага апісання ратушы тых часоў. А выява будынка на “Чарцяжы” настолькі ўмоўная, што цяжка здагадацца, з якога матэрыялу ён быў узведзены. Калі не было магчымасці нават адрадзіць мураваныя замкавыя ўмацаванні, то наўрад ці маглі знайсціся сродкі на мураваную ратушу. Безумоўна, гэта пытанне патрабуе сур’ёзнага і ўсебаковага даследавання.

Праз увесь Узгорскі пасад праходзіла вялікая галоўная вуліца, якая вяла ад моста праз Віцьбу і гандлёвай плошчы да брамы ў сцяне, што стаяла на беразе Дзвіны. Ад яе ў розныя бакі адыходзілі “вулачкі” і завулкі (адзін з іх меў назву Іванскага). Тэрыторыю Узгор’я перасякаў ручай (дарэчы, не паказаны на “Чарцяжы”), названы ў інвентары Слізкім. У пасадзе знаходзіліся 332 двары, пераважна рамесніцкія (кавалі, пушкары, цесляры і інш.), драўляныя цэрквы.

Акрамя гэтых частак горада інвентар згадвае яшчэ чатыры пасады: Задунайскі, Заручаўскі, Слабадскі і Рускі. Задунайскі (або Задунаўскі) пасад размяшчаўся на ўсход ад Ніжняга замка, за ручаём Дунай. На яго тэрыторыі існавалі 61 мяшчанскі двор і гумнішча. У Заручаўскім пасадзе (за Замкавым, або Пілатавым, ручаём, які агінаў Ніжні замак з поўдня) размяшчалася 158 двароў і мураваная царква Св. Духа. У пасад вяла Заручаўская брама, каля якой стаяла царкоўная багадзельня (“шпітальная халупа”). Слабадскі і Рускі пасады ўтваралі раён, вядомы пад назвай Задзвінне. Яны ўключалі адпаведна 165 і 207 двароў, на беразе Дзвіны ў Рускім пасадзе стаяла драўляная царква Св. Пятра.

Вось такі выгляд меў горад Віцебск у першай палове XVII стагоддзя. Нягледзячы на вялікія і частыя разбурэнні, ён усё ж развіваўся як адзін з буйнейшых беларускіх гарадоў, важны эканамічны і рэлігійны цэнтр. Сфарміравалася складаная архітэктурная планіровачная структура, якая ўключала сем планіровачных утварэнняў (два замкі і пасады). Вялікую ролю ў ёй адыгрывалі абарончыя збудаванні. Аднак ужо вызначыўся і іншы перспектыўны кірунак развіцця грамадскага цэнтра, які перамясціўся на Узгор’е. Менавіта гэты раён у далейшым склаў аснову фарміравання архітэктурнага цэнтра горада ў XVIII – XIX стагоддзях.

Віцебскі рабочы. 1987. 24 снежня. С. 4.

* Гл.: *Чарняўскі І., Цішкін І.* Віцебская ратуша // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1987. № 2. С. 17 – 20 – *рэд.*

Юрый ЯКІМОВІЧ

ВІЦЕБСКІЯ ШКОЛЫ ДОЙЛІДСТВА


Пад школай дойлідства мы разумеем кола майстроў, аб’яднаных вакол пэўнага архітэктурна-мастацкага цэнтра, творчасці якіх уласцівы адметныя асаблівасці, невядомыя ў іншых аналагічных цэнтрах. Таму стварэнне архітэктурна-мастацкай школы сведчыць пра пэўную сталасць горада, яго высокае палітычнае і мастацкае значэнне сярод іншых гарадоў таго ж узроўню. Далёка не ўсім, нават і буйным гарадам, удалося сфарміраваць сваю асобную школу ў галіне архітэктуры і выяўленчага мастацтва. У XII ст. такія школы мелі толькі Полацк і Гародня. Іх помнікі добра даследаваны вучонымі, даўно ўвайшлі ў “залаты фонд” нашай культурнай спадчыны. Віцебск жа ў навуковых працах па гісторыі архітэктуры заўсёды стаяў недзе ў баку, то дапасоўваючыся да Полацкай школы, то адыходзячы ад яе. Але ніколі ніводзін з даследчыкаў не дапускаў нават думкі пра тое, што Віцебск таксама стварыў сваю самастойную школу, прычым не меней арыгінальную за Полацкую.

Адным з унікальных помнікаў гэтай школы з’яўлялася царква Дабравешчання Прасвятой Багародзіцы. Яе руіны і цяпер стаяць на беразе Дзвіны, на тэрыторыі колішняга Ніжняга замка*. Пабудавана яна ў XII ст., але мясцовы летапіс, складзены М. Панцырным, прыпісвае заснаванне храма кіеўскай княгіне Вользе ў X ст. Легенда гэтая, відаць, віцяблянам вельмі падабалася, таму і ўтрымлівалася на працягу некалькіх стагоддзяў.

Царква з’яўлялася саборнай, у ёй захоўваліся каралеўскія граматы і гарадскія кнігі. У XIV ст. храм быў у значнай меры папсаваны. Таму тагачасны віцебскі князь Альгерд аднавіў будынак, прычым, верагодна, толькі яго верхнюю частку разам са скляпеннямі і дахам. Гэтая перабудова гісторыкам XVI ст. М. Стрыйкоўскім успрынята як пабудова новага храму, таму ён у сваёй “Хроніцы” прыпісаў будаўніцтва царквы Альгерду.

Першапачаткова Дабравешчанская царква мела ўсе адзнакі візантыйскай архітэктуры. Можна нават вызначыць раёны, адкуль прыйшоў такі архітэктурны стыль у Віцебск. Відаць, гэта былі Грэцыя або Балгарыя, дзе ў першай палове XII ст. пашырылася будаўнічая тэхніка, аналагічная тэхніцы муроўкі Дабравешчанскай царквы.

Усе сцэны і слупы ўнутры храма ўпрыгожвалі дзівосныя фрэскі. Ім была ўласцівая свабодная жывапісная манера пісьма, празрыстая каларыстычная гама, правільныя прапорцыі малюнка. Такімі рысамі валодала ў канцы XI – пачатку XII ст. Кіеўская жывапісная школа, цесна звязаная з візантыйскім мастацтвам. Разам



Рэканструкцыя першапачатковага выгляду Дабравешчанскай царквы А.М. Паўлінава

* Дабравешчанская царква была адноўлена ў 1993 – 1998 гг. – *рэд.*



Дабравешчанская царква.
Выява з “Чарцяжа” Віцебска 1664 г.

з тым у фрэсках прасочвалася імкненне да яркіх колеравых спалучэнняў, што характарызавала новы напрамак у развіцці манументальнага жывапісу старажытнай Русі другой паловы XII – пачатку XIII ст. Відаць, разам з візантыйскімі майстрамі ў размалёўцы Дабравешчанскай царквы прымалі ўдзел і полацкія мастакі. Такая выснова зроблена ў выніку даследавання структуры фрэскавай грунтоўкі.

Дабравешчанская царква неаднаразова перабудоўвалася і паступова страціла свае візантыйскія архітэктурныя формы. Так, у 1619 г. яе перабудавалі пад уніяцкую царкву. На “Чарцяжы” Віцебска 1664 г. ёсць схематычная выява будынка, завершанага не ранейшымі паўцыліндрычнымі скляпеннямі, а звычайнымі двухсхільнымі дахамі, з купалам у цэнтры. Каля царквы стаяла драўляная двух’ярусная званіца, завершаная шатром і купалкам. Яна згарэла пры пажары 1698 г. Відаць, ад гэтага пажару пацярпеў і сам храм, бо ў 1714 г. віцебскі ваявода і войт Казімір Аляксандр Пацэй далучыў да парафіі мясцовыя рамесніцкія цэхі з тым, каб рамеснікі сваім коштам капітальна адрамантавалі святыню і набылі для яе новыя алтары. У 1759 г. Хрысціна Глушынская, жонка ваўкавыскага падстольніка, ахвяравала на рамонт храма 500 злотых. У выніку перабудовы храм набыў барочныя формы, яго галоўны фасад завяршылі дзве ярусныя вежы.


У 1831 г. царква вернута праваслаўным, а ў 1849 г. у ёй абсталявалася абшчына адзінаверцаў. У 1862 г. завяршылася чарговая капітальная перабудова помніка, у выніку якой на галоўным фасадзе замест вуглавых барочных вежаў XVIII ст. з’явілася званіца над прытворам, а над цэнтральнай часткай храма ўзвялі даволі груваскі драўляны купал на барабане.

Восем доўгіх стагоддзяў прастаяла Дабравешчанская царква на беразе Дзвіны. Перажыла яна шмат войнаў, у тым ліку і апошнюю – Вялікую Айчынную. Нават фашысты абмінулі яе, але не абмінулі сучасныя “атэісты”. 20 снежня 1961 г. Савет Міністраў БССР па прапанове Міністэрства культуры, Дзяржбуда і Акадэміі навук выключыў царкву са спісу ахоўваемых помнікаў гісторыі і культуры. І неўзабаве царква была знішчана.

Доўгі час Дабравешчанская царква лічылася адзіным помнікам такога тыпу на Беларусі. Але выявілася, што ў XII ст. у аналагічнай тэхніцы ў Віцебску пабудаваны яшчэ два храмы. Адзін з іх размяшчаўся на тэрыторыі Верхняга замка і вядомы ў гісторыі



Дабравешчанская царква.
Выява на акварэлі Ю. Пешкі. 1800-я гг.



Дабравешчанская царква.
Гравюра 1865 г.


як царква Св. Міхаіла. Рэшткі збудавання былі знойдзены ў 1894 – 1895 гг. вядомым віцебскім краязнаўцам і гісторыкам А.П. Са-пуновым, які раскапаў падмуркі, лесвіцу і падлогу, выкладзеную керамічнай пліткай. У 60-я – 80-я гг. XX стагоддзя знойдзены фрагменты муроўкі з плінфы і вапняковых блокаў, керамічныя пліткі падлогі, смальта, аконнае шкло, фрагменты купальнага пакрыцця. Даследчыкамі ўстаноўлена, што шкло прывезена з Германіі, а смальта – з Візантыі.

На аснове аналізу рэштак храма і іншых археалагічных знаходак можна ў агульных рысах рэканструяваць гэтае цікавае збудаванне. Безумоўна, царква Св. Міхаіла ўяўляла сабой традыцыйны для старажытнарускага дойлідства крыжова-купальны храм з адным цэнтральным купалам, накрытым лістамі са сплаву волава і свінца. Своеасаблівa была вырашана падлога царквы, якую пакрывалі жоўтыя і зялёныя пліткі разнастайных формаў, галоўным чынам прамавугольных і трохвугольных. Алтарная частка дэкаравана пазалочанай мазаікай. Інтэр’ер асвятлялі невялікія круглыя акенцы з зеленаватага шкла, якія афарбоўвалі струмені сонечнага святла і пэўным чынам вызначалі колер светлавых блікаў і рэфлексаў на сценах і падлозе.

Храм прастаяў на сваім месцы ўсяго каля двух стагоддзяў. Ён знішчаны ў часы пажара Віцебска 1335 г. або пры аблозе горада войскам князя Вітаўта ў 1396 г., калі гарматы скрушылі амаль дашчэнту многія пабудовы Верхняга замка. Пазней царкву адбудавалі, але ўжо не з цэглы і каменя, а з дрэва. Вядома, што ў ёй знаходзіліся партрэты князя Альгерда і яго жонкі Ульяны – адны з першых твораў партрэтнага мастацтва на Беларусі. У пачатку XVII ст. гэты храм згарэў, на яго месцы пабудавалі новую драўляную царкву, але і яна загінула пры пажары 1708 г., калі Пётр І загадаў свайму капітану Салаўёву выпаліць Віцебск.

Трэці храм аналагічнай пабудовы знаходзіўся на ўсход ад Міхайлаўскай царквы ў раёне сучаснай плошчы Свабоды. Гэта царква Параскевы Пятніцы, пабудаваная ў першай палове XII ст. Колькі часу яна прастаяла – невядома. У XVII ст. на гэтым месцы знаходзілася ўжо драўляная царква, якая ў 1640 г. перабудавана пад езуіцкі касцёл. Падмуркі муравaнай царквы знойдзены падчас археалагічных раскопак.

Такім чынам, у Віцебску ў XII ст. узведзены тры царквы аналагічнай архітэктуры, якія вызначылі дзве асноўныя кампазіцыйныя восі ўздоўж Дзвіны і Віцьбы. Падобныя адна на адну, яны



Царква Св. Міхаіла.
Выява з “Чарцяжа” Віцебска 1664 г.



Увядзенская царква.
Выява з "Чарцяжа" Віцебска 1664 г.

стварылі адзіны ансамбль, надаўшы ўсяму гораду абагульнены і арыгінальны вобраз. Такі прыём у старажытнарускім дойлідстве сустракаўся нячаста, на тэрыторыі Беларусі ён ужыты толькі ў Полацку і Гародні. Віцебск у гэтым сэнсе стаў трэцім горадам.

Чаму Віцебск не пайшоў услед за Полацкам, не пераняў яго архітэктурны стыль?

Тлумачыцца гэта чыста палітычнымі прычынамі. У 1101 г. памёр славуты полацкі князь Усяслаў Чарадзей, у выніку чаго ў Віцебску пачаў княжыць яго сын Святаслаў. Новы віцебскі князь імкнуўся да незалежнасці ад Полацка. Таму ён не мог будаваць так, як будавалі палачане, бо гэта б прынізіла значэнне Віцебска ў вачах сучаснікаў. Таму князь запрашае майстроў з Грэцыі або Балгарыі (Усяславічы былі пароднены з візантыйскім імператарам), якія ўзвялі храм Міхаіла. Потым узніклі Дабравешчанская і Пятніцкая цэрквы. У выніку гэтага будаўніцтва ў Віцебску склалася мясцовая арцель, якая карысталася вядомасцю і за межамі княства. Так, віцебскія майстры ў XII ст. змуравалі Барысаглебскую царкву ў Навагрудку, а ён у тыя часы ўсё больш набываў значэнне самага магутнага горада ва ўсёй Заходняй Русі, сталіцы будучага Вялікага Княства Літоўскага. Улічваючы гэта, можна з упэўненасцю сказаць, што ў Віцебску ў XII ст. склалася трэцяя на тэрыторыі Беларусі архітэктурная школа. Яна пакуль што ў навуцы невядомая, але выспеў час паставіць і станоўча вырашыць гэтае пытанне.

У XVI – першай палове XVII ст. у Віцебску фарміруецца другая архітэктурная школа, на гэты раз у галіне драўлянага будаўніцтва. Фарміраванню рысаў гэтай школы садзейнічала будаўніцтва віцебскіх замкаў (Верхняга, Ніжняга і Узгорскага) і асабліва забудова Ратушнай плошчы на Узгор'і. Замкавыя вежы ўяўлялі сабой высокія манументальныя збудаванні, нярэдка ярусной кампазіцыі. Таму і іншыя будынкі дойліды імкнуліся зрабіць такімі ж, надаць ім вертыкальны характар. У гэтым і выявіліся асноўныя рысы другой архітэктурнай школы Віцебска.

Галоўным кампазіцыйным цэнтрам Узгор'я з канца XVI ст., калі ў 1597 г. віцябляне атрымалі Магдэбургскае права, стала драўляная ратуша. Праўда, яе ў 1624 г. разабралі – так адпомсціў урад Рэчы Паспалітай за забойства біскупа Іязафата Кунцэвіча.

На "Чарцяжы" 1664 г. паказана новая віцебская ратуша – перабудаваны гасцінны двор. Яна была вырашана кампактным квадратным у плане двухпавярховым аб'ёмам, завершаным высокім шатровым дахам, гранёным двух'ярусным бельведэрам і купалком са шпілем і гербам. Вышынны аб'ём ратушы ўдала пераклікаўся з замкавымі вежамі, якія выдатна спалучаліся з выразным узгорыстым рэльефам Віцебска.

На поўнач ад гасціннага двара і ратушы стаяла драўляная Увядзенская царква, пабудаваная пасля 1618 г. Яна захоўвалася яшчэ ў канцы XVIII ст. у квартале, які непасрэдна прылягаў да ратушы з поўначы. Тут калісьці размяшчаліся старажытныя могілкі. Царква ўяўляла сабой традыцыйнае трохзрубавае збудаванне ярусна-восевай кампазіцыі. Яе цэнтральным элементам



Уваскрасенская (Рынкавая) царква.
Выява з “Чарцяжа” Віцебска 1664 г.

з’яўляўся сярэдні чацверыковы аб’ём, які складаўся з дзвюх частак: больш шырокай ніжняй і вузейшай верхняй, што падзяляліся паміж сабой прычолкамі. Над верхняй часткай узвышаўся шатровы дах, увянчаны купалам на светлавым барабане. Прыкладна такі ж характар меў і алтарны аб’ём, хаця ён не дасягаў такіх памераў, як папярэдні. З захаду стаяла высокая чацверыковая вежа-званіца з аналагічным дахавым завяршэннем. Яна ў верхняй частцы мела “ізбіцу” – спецыяльнае абарончае памяшканне з кансольна навісаючымі над ніжняй часткай зруба сценамі, з абламамі і байніцамі. Як паказана на “Чарцяжы” 1664 г., званіца стаяла не па восі храма, а прылягала да яго паўночна-заходняга кута. У выніку стварылася надзвычай выразная вертыкальна-ярусная кампазіцыя, у якой кожны аб’ём трактаваўся самастойнай вежай. Безумоўна, такія архітэктурныя формы прыйшлі з абарончага будаўніцтва.

Заканамерна ўзнікае пытанне: ці быў віцебскі архітэктурны стыль цалкам арыгінальны, ці сустракаліся недзе аналагічныя формы? Калі пагартаць старонкі гісторыі сусветнай архітэктуры, то можна прызнаць, што найбольш блізка да віцебскіх стаялі храмы карпацкіх бойкаў, якія лічацца надзвычай старажытнымі па паходжанні. Але такія формы не былі непасрэдна занесены ў Віцебск з Карпатаў – яны тут з’явіліся ў выніку самастойнага развіцця. Асіметрычная пастаноўка званіцы адносна асноўнага корпуса храма не сустракалася ў карпацкай архітэктуры. Відаць, віцебскія дойліды ўяўлялі сабе званіцу як нейкі самастойны аб’ём, які павінен быў існаваць аўтаномна ад храма. Верагодна, гэта звязана з тым, што званіцы выконвалі нейкія асобныя функцыі, не ўласцівыя ў цэлым культаваму збудаванню. Напрыклад, званіца магла выкарыстоўвацца ў якасці дазорнага і абарончага збудавання, у ёй маглі захоўвацца тыя рэчы, якія нельга было змяшчаць у храме.

Формы, адзначаныя ва Увядзенскай царкве, атрымалі яшчэ больш яскравае развіццё ў архітэктуры Уваскрасенскай (Рынкавай) царквы. Яе будаўніцтва прыпадае на другую палову XVI або пачатак XVII ст. Стаяла святыня на паўднёвы захад ад ратушы. У інвентары маёмасці Полацкай епархіі 1618 г. яна лічылася ўніяцкай.

Цэнтральны аб’ём Уваскрасенскай царквы вырашаны такім жа чынам, што і Увядзенскай, толькі з тым адрозненнем, што завяршэнне яе больш масіўнае, дах набыў выгіб, гнуткія лініі, як у тагачасных гатычных саборах. Алтарны зруб вырашаўся высокай манументальнай вежай. Званіца, у адрозненне ад Увядзенскай царквы, больш арганічна злучалася з асноўным аб’ёмам, хаця і не пастаўлена яшчэ строга па падоўжанай восі. У ёй цікава адзначыць размежаванне функцый ніжняга і верхніх ярусаў. Ніжні ярус з’яўляўся тамбурам або паперцю, праз яго ўваходзілі ў храм, прычым уваходныя дзверы зроблены не ў пярэдняй, а ў бакавой сцяне. Вышэйшыя ярусы не злучаліся з ніжнім знутры, на іх вяла адкрытая лесвіца ўздоўж дзвюх сумежных сцен будынка. У самым версе вежы размяшчалася званіца. У яе шатровым пакрыцці існавалі спецыяльныя “галаснікі” – праёмы, якія адчыняліся пры набажэнствах, калі гучалі царкоўныя званы. А вось два ярусы паміж званіцай і паперцю хутчэй за

ўсё з’яўляліся абарончымі, бо расчляняліся вузкімі праёмамі тыпу байніц.

На захад ад Уваскрасенскай стаяла Спаса-Праабражэнская царква. Яна згадваецца ў дакуменце 1552 г. як існуючая з нагоды надання ёй зямлі віцебскім мешчанінам Фёдарам Якаўлевічам. У пачатку XVII ст. царква разбурана, таму і не трапіла ў інвентар валоданняў Полацкай епархіі 1618 г. Але ў наступным 1619 г. кароль Жыгімонт III даў грамату, паводле якой ён “мещаном тамошним витебским кормником благословил направить церков опалую заложеня Преображения Господня и з пределом что у Николая за рекою Витьбою на посаде Узгорском у пирожном ряду и мет склады звыклые на праздник светого архистратига Михаила и светого Семиона на опатрене церковных справ и на выховане (ўтрыманне) священника при той церкви, дьякона и дьяков, не мней теж и убогих в шпиталю”. З гэтага дакумента бачна, што царква ў той час была ўніяцкай (“в едностью с церковью Рымской”), пры ёй заснавана брацтва. Пасля адраджэння храм набыў формы заходняй готыка-рэнесансавай архітэктуры.

На “Чарцяжы” 1664 г. прадстаўлены будынак падоўжана-восевай кампазіцыі, які складаўся з размешчаных на падоўжанай восі чацверыковых зрубаў званіцы, нефа і алтара. Высокія стройныя зрубы нефа і алтара накрыты двухсхільнымі дахамі, вокны размешчаны высока, амаль што пад карнізам. Паколькі алтарны зруб вузейшы за неф, то і дах над ім меў меншую вышыню. Вільчак даху над нефам у месцы прымыкання яго да даху над алтаром быў завершаны двух’ярусным купалам на высокім барабане. Званіца мела трох’ярусную кампазіцыю і складалася з двух ніжніх чацверыкоў і верхняга васьмерыка. Апошні расчляняўся высокімі арачнымі вокнамі і завяршаўся складаным купальным пакрыццём. Трэба адзначыць, што ў гэтым храме асіметрыя ў пастаноўцы званіцы, што назіралася ва Увядзенскай і Уваскрасенскай цэрквах, была пераадолена як архаічны прыём, у выніку



Спаса-Праабражэнская царква.
Выява з “Чарцяжа” Віцебска 1664 г.

чаго архітэктурныя формы храма сталі больш абагульненымі і адзінымі. Але, на наш погляд, пры гэтым Спаса-Праабражэнская царква страціла нейкую выразнасць, мясцовы каларыт, яе архітэктура стала больш схематычнай, наблізілася да аналагічных мураваных рэфармацкіх і каталіцкіх храмаў.

Такім чынам, Віцебск на працягу сваёй шматвяковай гісторыі з’яўляўся выдатным архітэктурна-мастацкім цэнтрам, адным з буйнейшых на Беларусі. Наяўнасцю не адной, а дзвюх архітэктурных школ не можа “пахваліцца” ніводзін з беларускіх гарадоў. Гэта падкрэслівае ўнікальнае значэнне Віцебска ў гісторыі беларускага дойлідства. На вялікі жаль, горад даўно страціў свае традыцыі і ператварыўся ў звычайны абласны цэнтр, са звычайнымі дамамі, вуліцамі і мікрараёнамі. То, мабыць, трэба ўспомніць былую славутасць і, пры магчымасці, адрадзіць яе?

Выбар (Віцебск). 1993. № 26. 11 – 17 жніўня. С. 4 – 5.

Фёдар ШКІРАНДА


ЗБОРНІК “Z OKOLIC DŹWINY” (“З ВАКОЛІЦ ДЗВІНЫ”) 1912 ГОДА І ЯГО АЎТАРЫ

Прадстаўнікі многіх нацыянальнасцей упісалі не адну яркую старонку ў гісторыю Прыдзвінскага краю. Былі сярод іх і палякі з мясцовай шляхты. Аб гэтым пераканаўча сведчыць выдадзены ў 1912 г. ў губернскім Віцебску калектыўны літаратурна-краязнаўчы зборнік пад назвай “Z okolic Dźwiny” (“З ваколіц Дзвіны”). Вялікага фармату і добра ілюстраваная кніга аб’ёмам 275 старонак была, па сутнасці, альманахам тых аўтараў, якія нарадзіліся або жылі на тэрыторыі Віцебскай губерні і пісалі на польскай мове. Як адзначана на вокладцы, альманах быў падрыхтаваны да друку праўленнем гарадскога каталіцкага дабрачыннага таварыства. Паколькі ў губернскай друкарні ў адпаведнасці з царскай палітыкай дэпаланізацыі Паўночна-Заходняга краю Расійскай імперыі забаранялася мець польскі лацінскі шрыфт, выданне ўбачыла свет у друкарні Юзафа Завадскага ў Вільні.

Царскім уладам не спадабаўся свабодалюбівы тон многіх матэрыялаў зборніка. Адразу пасля яго выхаду пачаліся канфіскацыі. У наш час “З ваколіц Дзвіны” – бібліяграфічная рэдкасць. Адзін экземпляр кнігі захоўваецца ў Нацыянальнай бібліятэцы Расійскай Федэрацыі (да 1992 г. – Публічная бібліятэка імя Салтыкова-Шчадрына) ў Санкт-Пецярбургу. Ні ў адной з беларускіх бібліятэк гэтага выдання няма. Таму не трэба здзіўляцца, што пра яго няма і аналітычных публікацый у навуковай літаратуры. Невялікі агляд зборніка зрабілі толькі Адам Мальдзіс у далёкім ужо 1964 г. на старонках “Літаратуры і мастацтва” і аўтар гэтага артыкула ў інтэрв’ю газеце “Витебские вести” у 2015 г.[1] У фондзе рэдкіх кніг навуковай бібліятэкі Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава ёсць ксеракопія гэтага выдання. Падараваў яе ўніверсітэцкай бібліятэцы прафесар Варшаўскага ўніверсітэта Аляксандр Баршчэўскі, які неаднаразова прыязджаў на краязнаўчыя чытанні, прысвечаныя творчасці Яна Баршчэўскага.

З прапановай выдаць кнігу выступіў вядомы ў Віцебску краязнавец і калекцыянер Вацлаў Пятровіч Федаровіч. Нарадзіўся ён у 1848 г. ў Магілёве, у 1872 г. закончыў юрыдычны факультэт Маскоўскага ўніверсітэта. З 1884 г. працаваў у Віцебску адвакатам у акруговым судзе. Быў намеснікам старшыні Віцебскай вучонай архіўнай камісіі, членам-карэспандэнтам таварыства краязнаўцаў у Варшаве. Па яго ініцыятыве было заснавана каталіцкае дабрачыннае таварыства ў Віцебску.

Вацлаў Федаровіч калекцыяніраваў старую зброю, археалагічныя, сфрагістычныя і этнаграфічныя матэрыялы. У



Вокладка альманаха “Z okolic Dźwiny” (“З ваколіц Дзвіны”). 1912 г.



Вацлаў Федаровіч

1904 г. у яго бібліятэцы было каля тысячы кніг па гісторыі і культуры Беларусі і Літвы, беларускія, польскія, літоўскія выданні XVII – XIX стст., старадрукі на рускай і іншых мовах, а таксама граматы і рукапісы XVI – XVIII стст.[2] У 1920 г. на базе яго калекцый быў створаны своеасаблівы музей старажытнасцей, які ў 1924 г. стаў часткай Віцебскага абласнога краязнаўчага музея.

Яшчэ ў 1909 г. В. Федаровіч звярнуўся да многіх асоб польскага паходжання, якія нарадзіліся або жылі на віцебскай зямлі, з просьбай прысланць для будучай кнігі свае матэрыялы. На гэты заклік адгукнулася больш за сорак чалавек. Сярод іх былі літаратары, кампазітары, мастакі, вучоныя, грамадскія дзеячы і простыя прадстаўнікі мясцовай шляхты – патрыёты сваёй малой радзімы.

Як адзначае К. Тарасаў[3], шляхту беларускіх рэгіёнаў, што размаўляла і пісала па-польску, нельга назваць "польскай" у поўным значэнні гэтага слова. Яна мела мясцовыя карані, ніколі не з'яўлялася акупацыйнай сілай у адносінах да народа, удзельнічала ва ўсіх падзеях мясцовай гісторыі, вякамі абараняла гэтую зямлю – сваю айчыну – ад знешняга ворага, трымалася мясцовых звычаяў, карысталася мясцовым фальклорам.

Убачыць выдадзеную кнігу В.П. Федаровічу не давялося. Ён памёр нечакана ў 1911 г. і быў пахаваны на могілках віцебскага каталіцкага касцёла святой Варвары. Многія падрабязнасці жыцця і дзейнасці В.П. Федаровіча ўдалося ўстанавіць толькі ў 2014 г. польскаму даследчыку Конраду Аеўскаму[4].

Укладальнікам і аўтарам прадмовы альманаха "З ваколіц Дзвіны" стаў віленскі гісторык, журналіст, калекцыянер і выдавец Ян Конрад Обст (Jan Konrad Obst, 1876 – 1954). І гэта зусім невыпадкова. У 1910 – 1911 гг. ён выдаваў у Пецярбургу на польскай мове гісторыка-краязнаўчы і этнаграфічны часопіс "Kwartalnik Litewski". Часопіс змяшчаў матэрыялы па гісторыі, краязнаўству, матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускага, польскага, літоўскага і латышскага народаў, біяграфічныя звесткі. У 1912 – 1913 гг. часопіс выдаваўся ў Вільні пад назвай "Litwa i Ruś". У перадваенны перыяд Я.-К. Обст быў сакратаром таварыства сяброў навукі ў Вільні. У 1912 – 1937 гг. выдаў некалькі брашур і кніг па гісторыі Віленшчыны. У 1940 г. былі нацыяналізаваны яго маёнтак, бібліятэка і ўсе калекцыі ў вёсцы Рубна (зараз называецца Кірцімай) побач з Вільняй. Памёр у 1954 г. і быў пахаваны на мясцовых могілках побач з маткай Марыяй Сакалоўскай і жонкай Розай Мілошавіч. Месца яго пахавання доўгі час знаходзілася ў занядбаным стане. Толькі ў 2008 г. намаганнямі мясцовай польскай грамадскасці на магілах Яна Конрада Обста і яго сям'і былі ўзведзены помнікі[5]. Пра многія падрабязнасці яго жыцця і



Ян Обст

творчасці можна даведацца з кніг літоўскай даследчыцы Ліліяны Нарковіч[6].

Пранікнёныя ўспаміны пра В.П. Федаровіча даслалі для зборніка паэт Мар'ян Шадурскі (1877 – ?)[7] і адвакат Станіслаў Лапацінскі (1851 – 1933).

Альманах складаецца з некалькіх раздзелаў: літаратурнага, нотнага, ілюстрацый, картаў і планаў. У літаратурным раздзеле надрукаваны не толькі мастацкія, але і навуковыя і мемуарныя тэксты. Складальнікі ўключылі ў выданне і некалькі прац аўтараў, якіх на той час ужо не было ў жывых.

У адрозненні ад сённяшняй практыкі ніякіх біяграфічных звестак пра аўтараў няма. Знайсці іх зараз даволі складана. Пра некаторых, праўда, ёсць невялікая інфармацыя ў расійскіх, польскіх, беларускіх, літоўскіх і латвійскіх энцыклапедыях і навуковых публікацыях, у інтэрнэце. У зборніку часам пададзены толькі год і месца напісання матэрыяла. Мастацкія творы мяжуюцца з навуковымі і мемуарнымі. Цікава прасачыць, кім жа былі аўтары гэтага выдання і як склаўся іх далейшы лёс.

Спынімся на некаторых паэтычных тэкстах. Вершы Янкі Купалы, які, дарэчы, пачынаў пісаць на польскай мове, супрацоўнічаў з польскай прэсай, а потым перайшоў на беларускую, чытала не толькі беларускамоўная, але і польскамоўная інтэлігенцыя таго часу. Таму невыпадкова ў зборніку надрукаваны ў перакладзе на польскую мову два яго вершы: "З песні аб нашай зямлі" і "А хто там ідзе". Устанавіць аўтара перакладаў, які схаваўся пад азначэннем "m.w.s.", сёння ўжо не ўяўляецца магчымым.

Мастацкая літаратура на працягу ўсяго XIX ст. на беларускіх землях існавала галоўным чынам на польскай мове. На ёй тады пісалі ўсе аўтары мясцовага паходжання. І чытацкую аўдыторыю яны мелі дастатковую, бо адукаванае гарадское і вясковае насельніцтва вучылася чытаць у першую чаргу па-польску. З-за жорсткіх цэнзурных перашкод, што ўводзіў царызм на шляху друкаванага беларускага слова, асветы і адукацыі, са шляхты беларускіх земляў у XIX ст. выйшлі лічаныя літаратары,



Ян Баршчэўскі

якія карысталіся роднай мовай. У польскай літаратуры нават утварылася так званая "беларуская школа" празаікаў і паэтаў, якія пісалі на тэмы і сюжэты з беларускага жыцця. У розных энцыклапедыях і даведніках яны называюцца то польска-беларускімі, то беларуска-польскімі пісьменнікамі (Ян Баршчэўскі, Янка Лучына, Рамуальд Падбярэзскі, Аляксандр Рыпінскі, Уладзіслаў Сыракомля, Ян Чачот і інш.).

Паколькі Ян Баршчэўскі (1790? – 1851) нарадзіўся ў вёсцы Мурагі Полацкага павета (зараз Расонскі раён), у зборніку надрукаваны тры яго вершы: "Паўночная зара", "Духі нябесныя", "Родная зямля". Як адзначаецца ў невялікай інфармацыйнай даведцы, падпісанай ініцыяламі "Wit. F.", сучаснікі называлі яго львом беларускай літаратуры. Мяркуем, што аўтарам нататкі мог быць Вітальд Федаровіч (Witold Fedorowicz), сын В.П. Федаровіча. Ён, як і бацька, захапляўся музейнай справай і меў добрую гуманітарную падрыхтоўку. Гэта была, дарэчы, першая публікацыя твораў Я. Баршчэўскага на радзіме, бо раней яны выдаваліся толькі ў Пецярбургу і Кіеве.


Сёння на Беларусі перакладаюцца і выдаюцца творы Я. Баршчэўскага, праводзяцца міжнародныя навуковыя канферэнцыі, здымаюцца мастацкія кінастужкі, ствараюцца тэатральныя спектаклі ў яго гонар. Грамадскасць Віцебшчыны патроху вяртае памяць аб гэтым выдатным пісьменніку, песняру

нашага краю. У ВДУ імя П.М. Машэрава адбылося некалькі міжнародных чытанняў, прысвечаных творчасці Я. Баршчэўскага. У 2004 г. універсітэцкае выдавецтва выдала лісты пісьменніка, якія ён адрасаваў у 1837 – 1844 гг. Юліі Шапялевіч-Корсак, сваёй сяброўцы і каханай, з сінхронным тэкстам на польскай і беларускай мовах. Лісты гэтыя былі ў калекцыі В.П. Федаровіча. Зараз яны захоўваюцца ў фондах Віцебскага абласнога краязнаўчага музея і ніколі не друкаваліся раней на мове арыгінала. Вершы і балады Я. Баршчэўскага пераклаў на беларускую мову віцебскі паэт Анатоль Канапелька[8]. У 1997 г. у вёсцы Мурагі Расонскага раёна, на радзіме пісьменніка, устаноўлены помнік. Аднак нельга сцвярджаць, што творчая спадчына Яна Баршчэўскага вывучана цалкам. Патрабуецца пэўны час, каб вучоныя больш дэталёва пранікліся ў вобразны лад, жанравы склад шматлікіх твораў пісьменніка, паўней вызначылі мастацкую спецыфіку яго апавяданняў, больш грунтоўна маглі ацаніць яго ўклад у беларускую фалькларыстыку.

У творчасці Янкі Лучыны (І.Л. Неслухоўскага) (1851 – 1898) адлюстравана станаўленне асноўных жанраў беларускай літаратуры XIX – XX стст.: лірычнай і эпічнай паэмы, драматургіі, публіцыстыкі, яе творчыя сувязі з традыцыямі польскай літаратуры[9].

Многія беларускія паэты XIX ст. акрамя беларускай мовы выкарыстоўвалі і польскую. Я. Лучына пісаў на рускай, беларускай і польскай мовах. Перакладаў на польскую мову вершы рускай паэткі з Ноўгарада Вольгі Чумінай (1858 – 1909). З 1887 да 1889 г. супрацоўнічаў з варшаўскім "Życiem", сябраваў з яго рэдактарам Зянонам Пшэсмыцкім. Друкаваўся на старонках "Przyjaciela Dziatek", "Przeglądu Literackiego", "Kraju", "Prawdy", "Kalendarza Powszechnego". Многія яго творы засталіся ў рукапісах і лістах да Аляксандра Валіцкага, літаратурнага крытыка і кнігавыдаўца[10], і Зянона Пшэсмыцкага.

Творы на рускай і беларускай мовах Я. Лучына пачаў друкаваць на старонках газеты "Минский листок" у 1886 г., у календарах, супрацоўнічаў з часопісам "Вестник



Станіслаў Гласко

Европы", газетай "Наша ніва". Пераклаў на беларускую мову вершы У. Сыракомлі, на рускую – А. Асныка, М. Канапніцкай, З. Пшэсмыцкага, Е. Вяжбіцкага, А. Ланге. Яго творы прасякнуты каларытам радзімы – Беларусі. Гэта бачна ў вершах, напісаных на рускай ("Родной Беларуси") і беларускай ("Роднай старонцы") мовах. У іх паэт выразна падкрэслівае, што яго айчынай, якой ён хоча служыць, з'яўляецца Беларусь, бедная краіна, якая не цешыць вока чароўнай прыгажосцю, зямля лясоў і балот, пясчаная, неўраджайная, але, як піша Я. Лучына, гэта маці-зямля. Вось гэты верш пад назвай "Сваёй зямлі" ў перакладзе на польскую "m.w.s." і быў надрукаваны ў зборніку "З ваколіц Дзвіны" (с. 186). Трэба адзначыць, што складальнікі чамусьці не паказалі яго ў змесце.

Станіслаў Гласко (Stanisław Hłasko, 1868 – 1940) прыслаў у альманах сваю паэму "Карнавал", прасякнутую матывамі барацьбы за свабоду народаў (с. 63 – 74). Ён быў юрыстам, публіцыстам і літаратарам. Нарадзіўся ў маёнтку Губіна Лепельскага павета. Вучыўся ў Віцебскай гімназіі[11]. Скончыў юрыдычны факультэт Пецярбургскага ўніверсітэта і філасофскі факультэт Кракаўскага ўніверсітэта. Пражываючы ў Варшаве, пісаў для "Athenaeuma", "Kuriera Niedzielnego", "Ogniwa", "Słowa", "Wędrowca". Дасылаў таксама артыкулы для кракаўскага "Przeglądu Polskiego" і пецярбургскага "Kraju". Вярнуўшыся ў Пецярбург, стаў сябрам

рэдакцыі гэтай газеты. Працаваў у сталіцы імперыі і як адвакат. У 1906 г. выдаў кнігу “Польскія партыі ў адносінах да Думы 1906 г.”

Пасля пачатку Першай сусветнай вайны С. Гласко зноў у Варшаве, ён прымае актыўны ўдзел у працы Лігі польскай дзяржаўнасці. У міжваенны перыяд, да выхаду на пенсію, займаў пасаду старшага саветніка Генеральнай пракуратуры Польскай Рэспублікі. Выбіраўся ў кіруючыя органы Таварыства літаратараў і журналістаў. Памёр 24.03.1940 г.

Толькі невялікая частка яго артыкулаў на палітычныя і сацыяльныя тэмы ўвайшла ў кнігу “Публіцыстычныя даследаванні” (Пецярбург, 1906. 232 с.). У прэсе да Першай сусветнай вайны часта можна было ўбачыць яго прозвішча ў якасці літаратурнага аглядальніка. Ён інфармаваў не толькі пра новыя польскія выданні, але і пра італьянскія, венгерскія і амерыканскія, пісаў рэпартажы з Умані і Віцебска. Акрамя зборніка вершаў “Паэзія” (Варшава, 1900. 139 с.) у 1906 г. С. Гласко выдаў “Геній без крылаў. Грамадскія навелы”, а ў 1917 г. – яшчэ адну паэтычную кнігу “Паэмы”. Займаўся таксама перакладамі з лацінскай мовы[12].

Ядвіга Скруткоўская (Jadwiga Skrutkowska) на падставе латышскіх паданняў напісала сваю казку “Праклён” (с. 180 – 183). Звестак пра яе пакуль адшукаць не ўдалося. Хутчэй за ўсё, паходзіла яна з Рэжыцы (зараз Рэзекнэ ў Латвіі), бо прозвішча Скруткоўскіх у канцы XIX ст. тут сустракаецца часта.

Зыгмунт Ярскі (Zygmunt Jarski) даслаў для зборніка пранікнёны “Урывак з запавету” (с. 100 – 101). Сваім нашчадкам і сябрам ён жадае, каб яны верылі ў светлую будучыню, каб нішто іх ніколі не палохала. “Будзьце заўсёды там, дзе ёсць хворая душа, будзьце як чыстыя крыніцы; да іх імкнецца кожны жадаючы напіцца, будзьце як сонечныя промні, якія ўсё абуджаюць да жыцця”, – заклікае ён. На жаль, знайсці падрабязныя звесткі пра аўтара пакуль што не ўдалося. У альманаху няма і яго партрэта, не пазначаны дата і месца напісання твора. Вядома толькі, што прозвішча Ярскіх у канцы XIX ст. сустракаецца ў Дзвінскім, Рэжыцкім і Люцынскім паветах.

Барон Мар’ян Мантойфель (Marjan Manteuffel) з вядомага латгальскага роду змясціў апавяданне “У кузні амура” (с. 87 – 90). Яго герой пытаецца ў бога кахання, чаму чалавек часта пакутуе, чаму не высыхае мора слёз і вяртаецца смутак. Амур адказвае, што ёсць сардэчныя раны, якія лечыць час, ёсць такія, якія лечыць новае каханне. Але бываюць і такія раны, для якіх няма лякарства. У другой частцы апавядання мы даведваемся, што такія раны ў чалавека пакідае вайна і да чаго яна яго даводзіць.

Гелена Дыноўская (Helena Dynowska) даслала эмацыянальную вершаваную “Казку” пра арла-сірату (с. 192 – 195). Пазначана, што напісана яна была 7 сакавіка 1909 г. у маёнтку Істаль. Г. Дыноўская з Сакалоўскіх нарадзілася недалёка ад Люцына (зараз Лудза ў Латвіі) ў радавым маёнтку Істальсно (часам назва яго пісалася скарочана як Істаль). Была маткай вядомай польскай пісьменніцы Ванды Дыноўскай (1888 – 1971). У 1918 г. Г. Дыноўская прадала частку маёнтка Альберту Лінеўскаму і пераехала ў Польшчу[13].

Пісьменніца, журналістка, настаўніца Ванда Гізберт-Студніцкая (Wanda Gizbert-Studnicka, 1876 – 1924) нарадзілася ў Дзвінску. Вучылася ў Львоўскім універсітэце (гісторыя і польская літаратура). Дапамагала брату Уладзіславу Студніцкаму выдаваць газету “Naród a Państwo” ў Варшаве, а потым у Пецярбургу пад назвай “Votum Separatum”. Тут захварэла на сэрца. Прымала ўдзел у руху за незалежнасць Польшчы. У 1918 г. вярнулася ў Польшчу, працягвала працаваць настаўніцай і пісаць кнігі. Мела ўсебаковы пісьменніцкі талент. Поспехам карысталіся яе кнігі “Польскія дзеці”, “Край дзяцінства”, “Умеем кахаць”, “Польскія замалёўкі”, “Адкуль узяліся палякі на Русі”. Напісала некалькі папулярных кніг па гісторыі Польшчы. Перыядычна друкавалася ў віленскім часопісе “Słowo”[14]. Для зборніка (с. 190 – 191) напісала эсэ “Некалькі заўваг аб ідэі Бога ў «Імправізацыі»” (маецца на ўвазе твор А. Міцкевіча).

Паэтэса, навелістка і перакладчыца Станіслава Шадурская (Stanisława Szadurska, 1880 – 1918), якая нарадзілася ў Рэжыцкім павеце, надрукавала ў альманаху паэму

"Ліліт" і верш "Дарога маёй зямлі" (с. 129 – 143). Пачынаючы з 1906 г. у многіх польскіх часопісах таго часу ("Kurier Litewski", "Dziennik Wileński", "Krytyka", "Bluszcz", "Sfinks") друкаваліся яе вершы, навелы, дарожныя нарысы пра паездкі ў Кіеў, Кракаў, Венецыю, Вену, літаратурныя агляды і рэцэнзіі. У 1912 г. С. Шадурская ўзначальвала аддзел паэзіі ў "Echu Literacko-Artystycznym". Асобнымі выданнямі выйшлі зборнікі яе лірычных вершаў "Хвалі" (1906), "У поўдзень" (1909), паэма "Каін" (1907), том навел "Тыя, якія кахалі" (1914), аповесць "Не да жыцця" (1916). Часам яна пісала пад псеўданімам S. Stamar[15].

Казіміра Іллаковіч (Kazimiera Iłłakowiczówna, 1888 – 1983), якая пазней стала вядомай польскай паэтэсай[16], прыслала напісаную ў Жэневе ў 1908 г. сентыментальную "Песню пра лес". У ёй яна ўспамінае свае дзіцячыя гады, якія прайшлі ў Латгаліі (на той час Віцебская губерня), Уладзіслава Сыракомлю, які апяваў гэты край. Ёсць тут і яе невялікія вершы "Восень", "Смутак", "Гэта я", "На змярканні" (с. 118 – 124).

Паэт Мар'ян Шадурскі (Marjan Szadurski, 1877 – ?), аўтар трох вершаў (с. 173 – 175), быў прадстаўніком вядомага дваранскага роду з Асвеі. Яго бацькі Уладзіслаў і Стэфанія Шадурскія ў XIX ст. былі шырока вядомы сваёй дабрачыннай дзейнасцю сярод мясцовага насельніцтва[17].

Эдвард Слонскі (Edward Słoński, 1872 – 1926) нарадзіўся ў фальварку Запасішкі на Віцебшчыне. Скончыў Казанскі ўніверсітэт, па адукацыі быў зубным урачом. Адначасова пісаў вершы і прозу. Выпусціў шмат паэтычных зборнікаў і кніг для дзяцей. Першы ў Польшчы напісаў паэму пра авіяцыю. У 1924 – 1925 гг. быў сябрам праўлення Саюза літаратараў Польшчы. Працаваў журналістам і выдаўцом[18]. Асаблівай папулярнасцю да гэтага часу карыстаецца яго верш "Тая, што не загінула", напісаны ў 1914 г. адразу пасля пачатку Першай сусветнай вайны, калі палякі вымушаны былі змагацца ў радах трох армій: рускай, германскай і аўстрыйскай. Неўзабаве да верша была напісана музыка, і ён стаў песняй[19]. У вершы Э. Слонскага "Я



Мар'ян Шадурскі

ведаю гэты край", змешчаным у зборніку, адчуваецца сыноўская любоў да родных мясцін, дзе "плешчыцца старая Дзвіна і бацька рэк, стары Нёман, цячэ" (с. 108 – 109).

Надрукаваны ў альманаху і вершы сям'і Корсакаў – Пятра (1810 – 1855), Браніслава (1850 – 1914) і Багдана (1875 – 1961) – з маёнтка Анінск Себежскага павета. Усе трое не былі прафесійнымі літаратарамі, але, як многія дваране, захапляліся паэзіяй. Пётр Корсак быў себежскім павятовым маршалкам, а яго ўнук Багдан Корсак – юрыстам, які ў незалежнай Польшчы стаў суддзёй Вярхоўнага суда[20].

Віленскі журналіст, калекцыянер і выдавец Ян Обст акрамя прадмовы з'яўляецца аўтарам эмацыянальнай "Легенды" пра размову дзвюх крынічных русалак: Волгі і Дзвіны, а таксама артыкула "Лячэбныя сродкі нашага люду". Гэта, напэўна, невялікая частка з аднайменнай яго кнігі, якая выйшла ў Пецярбургу ў 1910 г.

Як мы ўжо адзначалі, у зборніку маецца шэраг навуковых публікацый. Вядучае месца сярод іх належыць Леону (Льву) Іосіфавічу Петражыцкаму (Leon Pietrażycki, 1867 – 1931). Нарадзіўся ён у радавым маёнтку Калантаева каля Віцебска. Пасля заканчэння з сярэбраным медалём Віцебскай гімназіі паступіў на юрыдычны факультэт Кіеўскага ўніверсітэта, дзе адразу заўважылі высокі ўзровень яго падрыхтоўкі. Яшчэ студэнтам ён пераклаў з латыні на рускую мову "Пандэкты" –



Леон (Леў) Петражыцкі

працы старажытнарымскіх юрыстаў па пытаннях прыватнага права. Атрымаўшы ўрадавую стыпендыю, Л. Петражыцкі працягнуў юрыдычную адукацыю ў Берліне, Гейдэльбергу і Парыжы.

Пасля вяртання ў Расію Л. Петражыцкі апублікаваў шэраг юрыдычных і сацыялагічных прац, за якія ў 1897 г. атрымаў вучонае званне дацэнта. У 1898 г. ён становіцца прафесарам і загадчыкам кафедры энцыклапедыі і філасофіі права Пецярбургскага ўніверсітэта, якую ўзначальваў на працягу дваццаці гадоў.

Л. Петражыцкі стаў стваральнікам новай дысцыпліны – працоўнага права і грамадзянскай палітыкі. Займаўся псіхалагічнымі і сацыялагічнымі аспектамі права, што стварыла яму рэпутацыю на Захадзе. На выбарах у І Дзяржаўную Думу Леў Іосіфавіч быў абраны дэпутатам ад Пецярбурга. У гэтым першым парламенце Расійскай імперыі ён удзельнічаў у працы трох камісій: прававой, аграрнай і абароны дэпутацкага імунітэту. З думскай трыбуны выступаў як абаронца жанчын, патрабуючы для іх раўнапраўя, а таксама пасіўнага і актыўнага выбарчага права. Чытаў лекцыі на Бястужаўскіх жаночых курсах. Для публікацыі ў зборніку "З ваколіц Дзвіны" даслаў матэрыялы свайго даклада "Прынцыпы развіцця права і прававое становішча жанчыны" (с. 125 – 128), з якім ён выступаў на першым з'ездзе жанчын Пецярбурга.

У 1918 г. Л. Петражыцкі пакінуў Расію. Яго запрашалі на працу вядучыя еўрапейскія ўніверсітэты. Ён прыняў запрашэнне Варшаўскага ўніверсітэта і ў 1919 г. узначаліў спецыяльна для яго створаную на юрыдычным факультэце першую ў Польшчы кафедру сацыялогіі права, на якой працаваў да дня сваёй смерці 15 мая 1931 г.[21] Падрабязныя артыкулы, прысвечаныя яго дзейнасці і працам, можна знайсці ў многіх беларускіх і расійскіх энцыклапедыях і даведніках[22].

Публікацыя гісторыка, архівіста і крыніцазнаўца Рычарда Мяніцкага (Ryszard Mienicki, 1886 – 1956) прысвечана аднаму з аспектаў гісторыі Рэчы Паспалітай XVII ст. (с. 144 – 153). Як сведчаць польскія і беларускія крыніцы, дзяцінства і юнацтва Р. Мяніцкі правёў у радавым фальварку Селігоры на Лепельшчыне. У 1904 г., пасля заканчэння гімназіі ў Рызе, ён паступіў на гістарычны факультэт Пецярбургскага ўніверсітэта. З 1906 па 1910 г. вывучаў гісторыю ў Кракаўскім універсітэце. У 1910 г. абараніў там кандыдацкую дысертацыю на тэму "Іеранім Радзеёўскі – падканцлер каронны", напісаную на падставе архіўных крыніц. Некаторы час жыў у Віцебску (1910 – 1911). Потым была праца ў архівах Варшавы.

У 1918 г. Р. Мяніцкі пераехаў у Вільню. У 1921 – 1939 гг. працаваў у Дзяржаўным архіве Вільні (супрацоўнікам, намеснікам дырэктара, дырэктарам) і адначасова вёў заняткі па архівазнаўству і гісторыі Рэчы Паспалітай у Віленскім універсітэце. У 1923 г. ва ўзросце 37 гадоў абараніў доктарскую дысертацыю, распрацаваў курс лекцый па архівазнаўству для ўстаноў вышэйшай адукацыі. У 1938 г. Р. Мяніцкаму было прысвоена званне прафесара.

Асноўныя працы Р. Мяніцкага прысвечаны архівам Вялікага Княства Літоўскага. Сярод яго шматлікіх артыкулаў і манаграфій, напісаных у віленскі перыяд, адна была прысвечана Архіву старажытных актаў у Віцебску (Цэнтральны архіў старажытных актавых кніг Віцебскай і Магілёўскай губерняў, 1862 – 1902). У 1931 г. ён апублікаваў тры дакументы XV ст. па гісторыі Полаччыны,

а пазней планаваў выдаць манаграфію, прысвечаную Полацкаму ваяводству. Пасля Другой сусветнай вайны пераехаў у Польшчу і ўзначальваў кафедру архівістыкі і дапаможных гістарычных дысцыплін гуманітарнага факультэта Торуньскага ўніверсітэта імя Мікалая Каперніка. Памёр 29 студзеня 1956 г.

Частка найбольш каштоўных дакументаў з радавога архіва, якую Р. Мяніцкі захоўваў у сейфе ў сваім кабінеце ў будынку Дзяржаўнага архіва ў Вільні, ацалела. Зараз гэтыя дакументы захоўваюцца ў Літоўскім гістарычным архіве ў фондзе 599 і складаюць 318 спраў за 1493 – 1939 гг. Як сведчаць польскія вучоныя з Торуні В. Харанжычэўскі і Р. Дэген, якія вывучалі гэты фонд, тут захаваліся дакументы па гісторыі Стараселля, Кубліч, Ворані, Выдрэі, Дварца, Крупніцы, Мосара, Сар’і, Начы і іншых маёнткаў Віцебскай губерні. Ёсць тут і радавыя архівы Дабашынскіх, Бжастоўскіх, Візгірдаў, Місевічаў[23].

Доктар медыцыны, прафесар, афтальмолаг Казімір Наішэўскі (Kazimierz Noiszewski, 1859 – 1930) даслаў для зборніка артыкул “Узнікненне і размеркаванне зрокавых уяўленняў” (с. 162 – 172). У 1883 г. ён з адзнакай скончыў медыцынскі факультэт Маскоўскага ўніверсітэта. Потым на працягу двух гадоў стажыраваўся як урач-афтальмолаг у клініках Кракава, Парыжа і Вены. З 1886 г. працаваў у Дзвінску, дзе адкрыў сваю клініку на 30 ложкаў. Дзякуючы навуковым публікацыям у замежных часопісах і гэтай клініцы, К. Наішэўскі стаў вядомым афтальмолагам не толькі ў Расіі, але і ў Еўропе. У 1900 г. абараніў доктарскую дысертацыю ў Ваенна-медыцынскай акадэміі ў Пецярбургу. З 1908 па 1918 г. выкладаў тут фізіялогію і паталогію вока на пасадзе прыват-дацэнта кафедры афтальмалогіі.

Трыццаць гадоў К. Наішэўскі жыў у Дзвінску, дзе ў 1913 г. узначаліў гарадскую думу. А ў Пецярбургу бываў рэгулярна толькі ў сувязі з працай выкладчыка Ваенна-медыцынскай акадэміі. Пастаянна пасяліўся ў сталіцы імперыі толькі падчас Першай сусветнай вайны. У 1916 г. непрацяглы час працаваў у Дзвінску і Віцебску.



Аляксандр Асяндоўскі


У канцы 1918 г. К. Наішэўскі пераехаў у Польшчу. Працаваў там у Міністэрстве аховы здароўя. У 1919 г. уваходзіў у склад камісіі па адраджэнні Віленскага ўніверсітэта і ўзначаліў потым у ім кафедру вочных хвароб. У 1921 г. атрымаў пасаду прафесара Варшаўскага ўніверсітэта, стварыў там кафедру афтальмалогіі і стаў яе загадчыкам. К. Наішэўскі з’яўляецца адным з заснавальнікаў Польскага навуковага таварыства афтальмолагаў (1921 г.) У 1923 г. заснаваў першы польскі афтальмалагічны часопіс “Вочныя хваробы” і быў яго галоўным рэдактарам да сваёй смерці ў 1930 г. Быў ганаровым сябрам многіх таварыстваў урачоў, у прыватнасці, французскага таварыства афтальмолагаў. З’яўляецца аўтарам 180 навуковых прац на рускай, нямецкай, французскай і польскай мовах, якія ахопліваюць розныя вобласці афтальмалогіі і неўралогіі[24].

Паходзіў з Віцебшчыны і доктар медыцыны Аляксандр Асяндоўскі (Aleksander Ossendowski, 1860 – 1927). Ён скончыў Пецярбургскі ўніверсітэт і з залатым медалём Ваенна-медыцынскую акадэмію. Быў ардынатарам клінікі ўнутраных хвароб прафесара С. Боткіна. Дзевятнаццаць гадоў праслужыў земскім урачом Пецярбургскага павета[25]. Таму невыпадкова

ён падрыхтаваў для віцебскага выдання артыкул “Арганізацыя ўрачэбнай дапамогі ў Віцебскім земстве”. У артыкуле ён дае канкрэтныя парады, як лепш арганізаваць сістэму аховы здароўя ў існаваўшых тады адзінаццаці паветах Віцебскай губерні пасля таго, як увойдзе ў сілу “Палажэнне аб земскіх установах у заходніх губернях” ад 14 сакавіка 1911 г.

Гістарычны нарыс барона Густава Мантойфеля (Gustaw Manteuffel, 1832 – 1916), скончаны 18 снежня 1908 г. у Рызе, прысвечаны Інфлянцкім княству і ваяводству ў XVII – XIX стст. (с. 1 – 41) (латышскае Прыдзвінне, якое ўключала заходнія землі Віцебшчыны). Аўтар прыводзіць цікавыя звесткі пра такіх сваіх вядомых землякоў, як Эмілія Плятэр, князь Міхал Борх, рэдактар часопіса “Rubon” Казімір Буйніцкі і яго аўтары: Адам Плятэр з Краславы, Юзаф Плятэр, Ігнат Храпавіцкі з Каханавіч, Юзаф Геральд-Выжыцкі з Росіцы, Аляксандр Гроза. Як зазначае ў сваім нарысе Г. Мантойфель, пасля ўтварэння ў 1802 г. Віцебскай губерні губернскімі маршалкамі з Інфлянт з 1805 па 1863 г. выбіраліся Юзаф Борх, Юзаф Шадурскі, Рамуальд Багамолец, Мар’ян Карніцкі, Ігнат Шадурскі, Караль Борх, Мікалай Грабніцкі, Міхал Борх, Ян Ліпскі (с. 37).


Выпускнік Дэрпцкага (Тартускага) ўніверсітэта Г. Мантойфель вядомы як гісторык, этнограф, фальклярыст, краязнавец і выдавец. Ён займаўся даследаваннем латгальскага фальклору і народных традыцый. З 1862 па 1871 г. выдаваў на латгальскай мове каляндар для сялян. У свой час вядомасць атрымалі яго гістарычныя працы “Краслава” (1901), “Даведнік пра Рыгу і яе ваколіцы” (1906), “З гісторыі Дэрпта і Дэрпцкага ўніверсітэта” (1911). Працы Г. Мантойфеля высока цаніліся ў навуковых колах і ў 80-я г. XIX ст. публікаваліся ў праслаўленым Ягелонскім універсітэце ў Кракаве. Ён з’яўляецца аўтарам трохсот прац пра Латгалію, якія выдаваліся і былі напісаны на нямецкай і польскай мовах[26].



Густаў Мантойфель

Публіцыст, гісторык і сацыёлаг Баляслаў Ліманоўскі (Bolesław Limanowski, 1835 – 1935) нарадзіўся каля Дзвінска ў шляхецкай сям’і. Вучыўся ў Маскве, Дэрпце, Парыжы і Львове, дзе ў 1875 г. атрымаў ступень доктара філасофіі. Дэбютаваў “Лістамі з Інфлянт” (1860), надрукаванымі ў Парыжы. У 1892 г. быў старшынёй арганізацыйнага з’езда Польскай сацыялістычнай партыі. З гэтай партыяй потым быў звязаны ўвесь час. У 1907 г. пераехаў у Галіцыю. Быў прыхільнікам незалежнасці польскай дзяржавы. У 1922 – 1935 гг. сенатар ад Польскай сацыялістычнай партыі. Пасля 1926 г. выступіў супраць парушэння дэмакратычных правоў санацыйным урадам Польшчы. Памёр 1 лютага 1935 г. у Варшаве[27]. У зборніку надрукаваны ўрывак з рукапісу яго працы пра польскага сацыяліста-ўтапіста Станіслава Ворцэля “Чым з’яўляецца радзіма (с. 91 – 92). У 1957 – 1961 гг. у Варшаве выйшлі ўспаміны Б. Ліманоўскага ў трох тамах.

Інфармацыйны артыкул пра Б. Ліманоўскага напісаў Уладзіслаў Студніцкі-Гізберт (Władysław Studnicki-Gizbert, 1867 – 1953) з Дзвінска, вядомы ў той час палітык і публіцыст. За палітычную дзейнасць ён быў сасланы ў Сібір. У час Першай сусветнай вайны і ў 1930-я гг. быў прыхільнікам супрацоўніцтва з Германіяй. У 1916 г. заснаваў клуб польскіх дзяржаўнікаў. У 1917 г. увайшоў у склад часовага дзяржаўнага савета. З 1945 г. жыў у эміграцыі ў Англіі. У



Баляслаў Ліманоўскі

2000 – 2009 гг. у Торуні выдадзена чатыры тамы выбраных прац У. Студніцкага-Гізберта[28].

Гісторык і архівіст Вацлаў Студніцкі-Гізберт (Wacław Studnicki-Gizbert, 1874 – 1962) на падставе Дынабургскага гарадского архіва за 1794 г. прыводзіць цікавыя лічбы і спіс шляхты ўсяго павета (с. 187 – 189). Нарадзіўся ён у Дзвінску. З 1906 г. жыў у Вільні, працаваў у газеце “Dziennik Wileński”. З 1910 г. разам з Фердынандам Рушчыцам рэдагаваў часопіс “Tygodnik Wileński”. У 1919 – 1939 гг. быў дырэктарам Дзяржаўнага архіва ў Вільні. У яго дамашняй бібліятэцы было шмат кніг, прысвечаных розным бакам жыцця Вільні і Віленшчыны. Другую сусветную вайну пераЖыў у Вільні. З 1944 г. жыў у Германіі, потым у ЗША. Заснаваў там саюз сяброў Вільні, быў сябрам Польскага навуковага інстытута ў Амерыцы. З яго выбраных твораў можна назваць наступныя: “Вільня: даведнік пра горад і яго ваколіцы з планам горада і дадаткамі” (1910), “Вільня: даведнік пра горад і ваколіцы” (1919), “Вільня” (1936), “Фердынанд Рушчыц: жыццё і дзейнасць” (1939), “Міцкевіч і яго краіна” (Чыкага, 1955)[29].

Дэпутат першай Дзяржаўнай Думы (1906) ад агульнага складу выбаршчыкаў Віцебскага губернскага выбарчага сходу Багдан Браніслававіч Шахно (Bohdan Szachno, 1868 – 1955) родам з Дзвінскага павета (маёнтак Юзэфова, зараз Наўенэ). Ён прысвяціў сваю публікацыю падрабязнай гісторыі Дынабургскага замка (с. 42 – 45). Скончыў юрыдычны факультэт Дэрпцкага ўніверсітэта са ступенню кандыдата навук. З 1903 г. з’яўляўся земскім гласным Дзвінскага павета, з 1904 г. – ганаровым сябрам Віцебскага таварыства сельскіх гаспадароў. Карыстаўся вялікім аўтарытэтам у галіне аграноміі. Неаднаразова атрымліваў вышэйшыя ўзнагароды на сельскагаспадарчых выставах. У 1919 – 1939 гг. жыў у Вільні. Да 1939 г. – віцэ-старшыня Віленскага кола філістраў, віцэ-прэзідэнт Віленскага земскага банка. Падчас вайны напісаў у Вільні ўспаміны пра Дэрпт. Пасля вайны жыў у Лодзі (Польшча)[30].

Віленскі біскуп Эдвард фон Роп (Edward Ropp, 1851 – 1939) у сваёй публікацыі ў зборніку, датаванай 30 лістапада 1909 г., звяртае ўвагу на тое, што ў перыяд узмацнення барацьбы царскіх улад з каталіцкім касцёлам вельмі важнай з’яўляецца духоўная самаадукацыя грамадзян. Вялікую ролю ў гэтым, на яго думку, могуць адыграць кнігі, не толькі свецкія, але і царкоўныя рознага зместу і напісаныя на розных мовах (с. 85 – 86).

Нарадзіўся Эдвард Роп у маёнтку Ліксна Дзвінскага павета. Па бацьку паходзіў з прыбалтыйскага нямецкага баронскага роду, па маці – з роду Плятэраў. Скончыў Пецярбургскі ўніверсітэт. Спрыяў увядзенню літоўскай і беларускай моў у царкоўнае жыццё. Восенню 1905 г. загадаў



Багдан Шахно



Эдвард фон Роп

выкладаць у межах дыяцэзіі каталіцкі Закон Божы для дзяцей беларусаў па-беларуску. Ініцыятар і заснавальнік Канстытуцыйна-каталіцкай партыі Літвы і Беларусі (1906). Дэпутат першай Дзяржаўнай Думы (1906). У кастрычніку 1907 г. загадам міністра ўнутраных спраў адхілены ад кіравання дыяцэзіяй, каля 10 гадоў пражыў у маёнтку Нішча Віцебскай губерні пад наглядам паліцыі. З 1919 г. жыў у Польшчы. Да 1931 г. фармальна лічыўся арцыбіскупам магілёўскім[31].

Ёсць у кнізе і мемуары. Станіслава Студніцкая-Гізберт (Stanisława Studnicka-Gizbert, 1865 – 1944) даслала свае ўспаміны пра дзіцячыя гады ў Дынабургу (с. 177 – 179). Яна была настаўніцай і літаратарам, пераклала некалькі кніг з англійскай мовы, якія былі выдадзены ў Варшаве і Вільні. Напісала падручнік па нямецкай мове і кнігу вершаў для дзяцей[32].

Густаў Рэвут (Gustaw Reutt, 1842 – 1902) дзеліцца ў альманаху сваімі ўспамінамі пра ўдзел у паўстанні 1863 – 1864 гг. (с. 198 – 209). Ён – адзіны аўтар, пра якога ў зборніку змешчаны біяграфічныя звесткі. З іх мы даведваемся, што нарадзіўся Г. Рэвут у Мосары Віцебскай губерні. З адзнакай скончыў Віцебскую гімназію. Вучыўся на матэматычным факультэце Маскоўскага ўніверсітэта. Падчас паўстання быў паранены. Пасля выздараўлення ў 1865 г. паступіў у ваеннае вучылішча ў г. Метц (Францыя). У 1868 г. вярнуўся на радзіму. Працаваў інжынерам у Кракаве, потым у Львове. Пасля цяжкай хваробы памёр 8 лютага 1902 г. у Львове[33].

М. Газдава (M. Gozdawa) прысвяціў свае ўспаміны настаўніцы Вандзе Рэвут, якая нарадзілася на Віцебшчыне. Пасля смерці маці яна дваццаць гадоў настаўнічала ў Львове і памерла там падчас заняткаў (с. 219 – 220). Устанавіць асобу аўтара ўспамінаў дапамог даведнік польскіх псеўданімаў, выдадзены ў Вільні ў 1922 г.[34] Аказваецца, пад гэтым псеўданімам пісаў свае матэрыялы Ян Марэк Гіжыцкі (Jan Marek Giżycki, 1844 – 1925). Нарадзіўся ён на Валыні ў мястэчку Міхноўка Старыканстанцінаўскага павета ў сям'і збяднелых нашчадкаў магнацкага роду Газдава. Пасля заканчэння гімназіі паступіў на юрыдычны факультэт Новарасійскага ўніверсітэта (Адэса), але праз год пераехаў у Дэрпт (Тарту) і стаў вывучаць параўнальнае мовазнаўства. У 1870 г. атрымаў ступень кандыдата філалагічных навук і быў накіраваны на працу ў мясцовую гімназію. Пасля сямі гадоў працы ў Дэрпце пераехаў у Мітаву (Елгаву), дзе працягваў настаўнічаць. У 1895 г. выйшаў у адстаўку і перасяліўся з сям'ёй у Кракаў. Часта бываў на Валыні, у Львове, даследаваў сямейныя архівы мясцовай шляхты[35]. Вось адкуль ён ведаў пра віцебскую настаўніцу Ванду Рэвут.

Ян Марэк Гіжыцкі быў хіба адзіным даследчыкам, які прысвяціў свае веды і сілы аналізу гісторыі манастыроў і манастырскіх школ, якія былі калісьці на былых землях Вялікага Княства Літоўскага. З яго прац, прысвечаных Віцебшчыне, можна назваць "Нататкі пра акадэмію і школы езуітаў у Полацку", "Успаміны пра віцебскіх піяраў"[36], "Польскія школы ў Полацкім ваяводстве ў XVIII ст.". Найбольшую цікавасць з пункту гледжання краязнаўства Віцебшчыны выклікае праца Я.М. Гіжыцкага "Матэрыялы па гісторыі Полацкай акадэміі і залежных ад яе школ" (Кракаў, 1905). Даследчык меў актыўную перапіску з вядомым віцебскім гісторыкам А.П. Сапуновым, у якой паведамляў шмат інфармацыі з польскіх і нямецкіх крыніц пра Дзвіну, а яго прасіў

прыслаць дадзеныя пра базыльянаў з Ушач. Дванаццаць яго лістоў да А.П. Сапунова захоўваюцца ў фондах Віцебскага абласнога краязнаўчага музея[37].

Ва ўрыўку з нарыса "Абарваны крык" (с. 97 – 99) пісьменнік, падарожнік, аўтар навуковых кніг па хіміі і геаграфіі Антоній Асяндоўскі (Antoni Ossendowski, 1878 – 1945) расказвае пра сваё падарожжа ў Шанхай. Нарадзіўся ён у Люцыне (зараз Лудза) ў сям'і ўрача. Вывучаў геаграфію ў Пецярбургскім універсітэце, хімію і фізіку – у Сарбоне (Парыж). Прымаў удзел у навуковых экспедыцыях на Каўказ, Алтай, Енісей і Байкал. Працаваў дацэнтам у вышэйшых расійскіх навучальных установах, друкаваў свае артыкулы ў розных пецярбургскіх газетах. Падчас Грамадзянскай вайны быў дарадцам арміі адмірала А. Калчака, пасля яе ліквідацыі перабраўся ў Манголію.

У 1922 г. прыехаў у Польшчу, выкладаў эканамічную і палітычную геаграфію ў варшаўскіх вучэльнях, пісаў кнігі. Яго польскім дэбютам стала кніга "Праз край людзей, звяроў і багоў" (1923). З 1935 г. быў старшынёй таварыства літаратараў і журналістаў, рэдактарам "Wiadomości Warszawskich" (1937) і іншых выданняў. Апублікаваў некалькі дзясяткаў навел, апавяданняў і аповесцей. Творы А. Асяндоўскага перакладзены на 28 моў. У 1920-я гг. у Лондане і Нью-Ёрку яго кнігі ў перакладзе на англійскую мову выходзілі раней, чым у Польшчы. Акрамя фантастычных і прыгодніцкіх твораў пісаў кнігі для моладзі, аўтар пацыфісцкай аповесці "Пяць хвілін да апоўначы" (1928), геаграфічных кніг з выдавецкай серыі "Цуды Польшчы"[38].

Гісторык, краязнавец, грамадскі дзеяч, уладальнік маёнтка Бачэйкава Лепельскага павета Уладзіслаў Цеханавецкі (Władysław Ciechanowiecki, 1860 – 1910) у жніўні 1909 г. прааналізаваў для зборніка рукапісную кнігу мемуараў Полацкага маршалка Ірэнія Васілеўскага (1812 – 1872) "Historia Domestica" (с. 210 – 218). А прадаставіў яму гэтую кнігу ўнук аўтара доктар Станіслаў Васілеўскі. Тут ёсць многа цікавых фактаў з гісторыі Віцебска, яго грамадскага і канфесійнага жыцця[39].



Уладзіслаў Цеханавецкі

Уладзіслаў Паўлавіч Цеханавецкі атрымаў дамашнюю адукацыю ў Францыі. Добраахвотнікам паступіў на вайсковую службу. Дзесяць гадоў (1880 – 1890) служыў у 18-м Клясціцкім гусарскім палку. Падчас службы захапіўся гісторыяй, напісаў гісторыю свайго палка. Пасля выхаду ў адстаўку асеў у радавым маёнтку Бачэйкава. Заняўся гаспадарскай, грамадскай дзейнасцю, пісьменніцкай і навуковай працай. Карыстаўся павагай і аўтарытэтам сярод мясцовага насельніцтва. Напісаў гісторыю маёнтка Бачэйкава, якая была выдадзена ў 1905 г. у Віцебску. Быў знаўцам мастацтва, калекцыяніраваў старое польскае шкло, мініяцюры і фарфор. Яго нашчадкі жывуць зараз у Англіі[40].

Надрукаваны у альманаху і ўрывак з успамінаў пісьменніка, публіцыста і краязнаўца Казіміра Андрэевіча Буйніцкага (Kazimierz Bujnicki, 1788 – 1878) (с. 46 – 58) пра многія падрабязнасці паўстання 1863 г. у Дагдзе, Краславе і Дынабургу. Нарадзіўся аўтар у Дагдзе. Друкаваўся ў перыядычных выданнях "Tygodnik Petersburski", "Athenaeum", быў сябрам Віленскай археалагічнай камісіі і ганаровым куратарам школ Віленскай губерні. У 1842 – 1849 гг. выдаваў часопіс "Rubon". Садзейнічаў адкрыццю Віленскага музея старажытнасцей, якому перадаў сваю калекцыю знаходак з Падзвіння і матэрыялы апісання Заходняй

Дзвіны. Шмат вандраваў па Падзвінні, апісаў значную колькасць населеных пунктаў краю. Пастаянна займаўся самаадукацыяй, свабодна валодаў англійскай, французскай, нямецкай, лацінскай, рускай, польскай і латышскай мовамі. Ведаў ён і латгальскую мову. Неаднаразова выбіраўся маршалкам Дынабургскага і Рэжыцкага паветаў. Выдаў шэраг кніг, у тым ліку "Вандроўкі па малых дарогах" (т. 1 – 2, 1841), "Сястра Гертруда" (1842), "Камедыі" (1851), "Новая вандроўка па малых дарогах" (т. 1 – 2, 1852), "Старая паненка" (1855). Пераклаў у вершаванай форме "Псалмы Давіда" (1878)[41].

Граф Яўген Плятэр (Eugen Broel-Plater, 1826 – 1916) прысвяціў свае ўспаміны паўстанню 1863 – 1864 гг. у Дынабургскім павеце, ролі ў ім свайго брата Леона Плятэра, які быў расстраляны ў Дынабургу 27 мая 1863 г. у 27-гадовым узросце (с. 102 – 107). Тут ёсць шмат цікавых падрабязнасцей пра гэта паўстанне на Віцебшчыне. Яўген Плятэр быў сынам буйнога памешчыка, агранома і пісьменніка Юзафа Казіміра Плятэра (1796 – 1852) і Антаніны Перасвет-Солтан. Вядомы як пісьменнік і мемуарыст. Пахаваны ў крыпце Краслаўскага рымска-каталіцкага касцёла св. Людвіка[42].

Адвакат Станіслаў Лапацінскі (Stanisław Łopaciński, 1851 – 1933) з Сар'і Дрысенскага павета ў сваім невялікім палемічным эсэ (с. 59 – 62) спрабуе абвергнуць словы пана Заглобы з вядомага твора Генрыка Сенкевіча "Патоп": "Глова кепска, відаць, з Вітэбска". Для пацвярджэння таго, што жыхарам нашай губерні няма падстаў саромецца, ён прыводзіць некалькі канкрэтных прыкладаў. Ужо ў XVIII ст. у Віцебску былі заснаваныя піярамі школы, якія існавалі да 1830 г., і навучанне ў іх было бясплатным.

У першай палове XIX ст. у многіх рэгіёнах Расійскай імперыі пачалі стварацца сельскагаспадарчыя таварыствы, якія ўдзялялі шмат увагі павышэнню культуры земляробства. У нашым рэгіёне яшчэ ў 1825 г. было створана Беларускае вольна-эканамічнае таварыства, якое праіснавала, праўда, нядоўга. У 1877 г. унукі заснавальнікаў гэтага аб'яднання вырашылі стварыць Віцебскае сельскагаспадарчае



Станіслаў Лапацінскі

таварыства і адкрыць сельскагаспадарчую школу. Губернскія ўлады, хоць і не адразу, падтрымалі гэту ініцыятыву, і таварыства набыло маёнтак у Лужасна, дзе ў 1909 г. і была адкрыта сельскагаспадарчая школа на 90 чалавек з трохгадовым тэрмінам навучання. Сёння традыцыі гэтай школы працягвае Лужаснянскі сельскагаспадарчы каледж.

"Шмат у нас і маляўнічых месц, – зазначае С. Лапацінскі. – Калі б яны былі за мяжой, то людзі ездзілі б паглядзець на іх і высылалі б адтуль паштоўкі з іх краявідамі". А тым, хто хоча пераканацца ў гэтым, аўтар раіць пабываць у Краславе, на Асвейскіх, Лепельскіх і Расонскіх азёрах.

Станіслаў Лапацінскі паходзіў са знатнага шляхецкага роду Лапацінскіх гербу Любіч. У 1872 г. ён скончыў юрыдычны факультэт Варшаўскага ўніверсітэта са ступенню кандыдата права. Спачатку быў памочнікам адваката В.Д. Спасовіча ў Пецярбургу. Праз пяць гадоў стаў адвакатам Пецярбургскай судовай акругі. Некаторы час працаваў адвакатам у Бярдзічаве і Кіеве. У 1884 г. пасля смерці бацькі пакінуў адвакацкую практыку і пераехаў у маёнтак Сар'я, дзе заняўся сельскай гаспадаркай і грамадскай дзейнасцю.

З 1901 па 1905 г. С. Лапацінскі быў старшынёй губернскага сельскагаспадарчага таварыства, з 1903 па 1911 г. – гласным Дрысенскага павятовага земскага сходу і

сябрам павятовай земскай управы. У 1906 – 1916 гг. – ганаровым міравым суддзёй Дрысенскага павета. У 1906 – 1910 гг. стаў сябрам Дзяржаўнага савета Расійскай імперыі ад Віцебскай губерні. У 1913 г. – сябрам савета па справах мясцовай гаспадаркі пры Міністэрстве ўнутраных спраў. Выступаў за пашырэнне правоў нацыянальных меншасцей на ўскраінах Расійскай імперыі. Пасля аднаўлення суверэнітэту Польшчы 11 лістапада 1918 г. С. Лапацінскі жыў у Вільні ва ўласным палацы і дапамагаў наладжваць судовую сістэму рэспублікі. Быў суддзёй Віленскага акруговага суда, потым апеляцыйнага суда. Памёр 23 лістапада 1933 г.[43]

У Сар'і ў 1852 – 1857 гг. бацька Станіслава Ігнат Лапацінскі пабудаваў велічны неагатычны касцёл у якасці радавой пахавальні. Аўтарам праекта касцёла і караўнікам будаўнічых работ быў архітэктар Густаў Шахт. Сар'янскаму храму ўжо больш за 150 гадоў. Ён унесены ў дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь як помнік сакральнага дойлідства рэспубліканскай значнасці. Гэта адзін з самых выразных узораў неаготыкі на Беларусі. Сёння гэта праваслаўная царква. Як і калісьці, яна імкліва ўзносіць у неба свае вежы і шпілі, выклікаючы захапленне смелай задумкай архітэктара і віртуозным майстэрствам мясцовых муршчыкаў[44].



Былы касцёл у Сар'і.
Фота з альманаха “Z okolic Dźwiny”

Юзаф Гласко (Józef Hłasko, 1856 – 1934) – дзеяч народніцкага і польскага грамадска-палітычнага руху, журналіст. Нарадзіўся ў маёнтку Пераселянцы Полацкага павета. З 1876 г. вучыўся ў Медыка-хірургічнай акадэміі ў Пецярбургу. У 1878 – 1879 гг. за ўдзел у студэнцкіх выступленнях і паездкі да рэвалюцыянераў быў арыштаваны. У 1881 г. арыштаваны і высланы на пяць гадоў у Енісейск. У 1888 – 1893 гг. у Варшаве, супрацоўнік штотыднёвіка “Głos”. Далучыўся да нацыянальных дэмакратаў (эндэкаў). У 1894 г. асуджаны па справе “Лігі нарадовай”, высланы на пяць гадоў у Валагодскую губерню. З 1897 г. у Смаленску, Пераселянцах, Львове. З 1906 г. у Вільні рэдагаваў часопіс “Dziennik Wileński”. З 1915 г. у Пецярбургу выдаваў разам з лідарамі эндэцыі штотыднёвік “Sprawa polska”, пазней у Маскве заснаваў штотыднёвік “Gazeta polska”. З 1918 г. у Варшаве[45]. У зборніку “З ваколіц Дзвіны” Юзаф Гласко дзеліцца сваімі ўспамінамі пра экскурсію ў Познань і чэшскую Прагу летам 1908 г. (с. 110 – 117).

Наступны аўтар – Фларыян Гласко (Florian Hłasko, 1865 – 1921), нарадзіўся ў Губіне Лепельскага павета. У 1886 г. скончыў Віцебскую гімназію і пачаў навучанне на матэматычна-прыродазнаўчым аддзяленні ў Пецярбургскім універсітэце. Там у 1891 г. атрымаў ступень магістра і перайшоў у Ваенна-медыцынскую акадэмію, якую скончыў у 1895 г. Стажыраваўся ў Празе і Парыжы. Сем гадоў служыў урачом Ціхаакіянскай эскадры. У 1902 г. вярнуўся ў Пецярбург, абараніў у акадэміі дысертацыю і працягваў працу начальнікам марскога лазарэта і галоўным урачом крэпасці Порт-Артур. Удзельнічаў у руска-японскай вайне, перажыў асаду Порт-Артура. Тры месяцы знаходзіўся ў японскім палоне. Пасля вызвалення дабраўся морам



Стэфанія Уляноўская

да Пецярбурга. З ліпеня 1905 г. працягваў службу на Балтыйскім флоце. Быў урачом у Кранштаце, штогод хадзіў з курсантамі ў Атлантыку і Міжземнае мора на караблі "Багатыр". Падчас аднаго з вучэбных рэйсаў 28 снежня 1908 г. доктар стаў сведкай землетрасення і выбуху вулкана Этна на Сіцыліі, калі за 25 секунд загінулі 150 тысяч жыхароў Месіны. Ф. Гласко ўдзельнічаў у ратаванні ахвяр, няспынна рабіў аперацыі некалькі дзён. За гэта італьянскія ўлады ўзнагародзілі яго камандорскім крыжам ордэна святых Маўрыкія і Лазара і сярэбраным медалём.

З 1911 па 1916 г. Ф. Гласко служыў на расійскім ваенна-марскім флоце на розных кіруючых пасадах і даслужыўся да ступені генерал-маёра. Быў узнагароджаны ордэнамі св. Станіслава III класа (1904), св. Ганны III класа з мячамі (1904), св. Станіслава IV класа (1915), мячамі да ордэна св. Ганны (1916). З 1918 г. служыў на флоце незалежнай Польшчы. Займаўся арганізацыяй першай марской школы ў Тчэве. З'яўляецца аўтарам кнігі "Па марах – да Польшчы: з дзённіка марака" (Варшава, 1922). Для віцебскага зборніка даслаў свае нататкі "З дзённіка марака" пра вайну з Кітаем (1900) і Японіяй (1904), а таксама пра землетрасенне ў Месіне на Сіцыліі (1908) (с. 78 – 81)[46].

Успаміны Стэфаніі Уляноўскай "Гісторыя дзевяці з паловай душ" (с. 82 – 84) прысвечаны прыгонніцкай мінуўшчыне, калі сялян прайгравалі ў карты, разлучалі з сем'ямі, а дзяцей лічылі за палову душы. Пісьменніца са шчырым спачуваннем расказала пра трагедыю сялянкі Ганулі і яе сына.

Стэфанія Уляноўская (Stefania Ulanowska, 1839 – каля 1912) вядома як пісьменніца, фальклярыстка, этнограф. Да 1891 г. жыла ў вёсцы Віляны Рэжыцкага павета (зараз Рэзекненскі раён Латвіі). Вывучала мясцовыя звычаі, народныя песні, паданні, легенды. Яе калекцыя казак на мясцовых дыялектах дае ўнікальную базу не толькі для фальклярыстаў, але і для моўных даследаванняў. Яе праца ў трох частках "Латышы польскіх Інфлянтаў" (1891, 1892, 1895) выклікае цікавасць у сучасных маладых даследчыкаў. Так, напрыклад, Тэрэза Рончка ў артыкуле "Некалькі слоў пра Стэфанію Уляноўскую і яе спадчыну ў сувязі з рэпрынтам «Латышы польскіх Інфлянтаў»" цытуе шмат яе твораў, у тым ліку і артыкул "Гісторыя дзевяці з паловай душ" са зборніка "З ваколіц Дзвіны". Анджэй Ратай з Беластока прысвяціў С. Уляноўскай сваю манаграфію, якая выйшла ў 2016 г.[47] З мастацкіх твораў С. Уляноўскай можна назваць зборнік вершаў "Вясенняя сімволіка" (1884), камедыю "Абы не старая дзева" (1886), "Аповесці і навелы" (т. 1 – 1888; т. 2 – 1890). Разам з Альфрэдам Шчэпанскім (1840 – 1909) С. Уляноўская напісала драму ў пяці актах "На радзіме" (1889), якая атрымала ўзнагароду на конкурсе ў Варшаве.

Упершыню на тэрыторыі Беларусі ў зборніку "З ваколіц Дзвіны" быў надрукаваны невялікі ўрывак з дыярыуша (дзённіка) дзяржаўнага дзеяча, актыўнага ўдзельніка палітычнага жыцця Рэчы Паспалітай Яна Антонія Храпавіцкага (1612 – 1685), які нарадзіўся ў вёсцы Падбярэззе пад Віцебскам. У 1669 – 1685 гг. ён быў віцебскім ваяводай і апісвае ў дыярыушы цырымонію свайго ўезду ў горад (афіцыйнага ўступлення на пасаду), як яго сустракалі гараджане і як ён святкаваў гэтую падзею. Праўда, складальнікі пераблыталі дату: пададзена 5 лютага 1761 г. замест 5 лютага 1671 г. Ёсць у зборніку і партрэт ваяводы, і рэпрадукцыя карціны А. Валеўскага, на якой

адлюстравана цырымонія ўезду (с. 175 – 176).

Ян Антоні Храпавіцкі (Jan Antoni Chrapowicki) вучыўся ў калегіуме Навадворскага ў Кракаве, потым працягваў навучанне ў Лондане і Падуі. У красавіку 1639 г. быў абраны дэпутатам на сейм ад Віцебскага ваяводства. Прымаў удзел у працы 24-х сеймаў. Выбіраўся маршалкам сеймаў (1665 і 1668 гг.), уваходзіў у розныя сеймавыя камісіі. У верасні 1669 г. Ян Антоні Храпавіцкі атрымаў пасаду ваяводы віцебскага. У 1676 г. пабудаваў у Віцебску манастыр бернардзінцаў разам з касцёлам св. Антонія Падуанскага. 3 лістапада 1685 г. памёр у сваім палацы ў Лукішках пад Віцебскам (некаторыя інтэрнэт-рэсурсы і друкаваныя крыніцы годам яго смерці падаюць 1686). Пакінуў дзённік за 1656 – 1685 гг., у якім ёсць звесткі пра палітычнае жыццё Рэчы Паспалітай, сеймы, паўсядзённае жыццё шляхты, яе звычаі і норавы[48].

У нотным раздзеле зборніка прадстаўлены ўрывак з музычнай камедыі “Тарас на Парнасе” – танец “Лявоніха”. Яго аўтарам з’яўляецца Юзаф Шадурскі (Józef Szadurski, 1845 – ?) з Асвеі. Своеасаблівая аўтарская версія традыцыйнага беларускага танца ўяўляе сабой новы крок у трактоўцы народных танцаў. На жаль, нікому з навукоўцаў пакуль не ўдалося ўстанавіць, які лёс напаткаў рукапіс гэтай аперэты і яе аўтара[49].

Наступны музычны твор – “Журба” – напісаў Мар’ян Храпавіцкі (Marjan Antoni Andrzej Chrapowicki, 1864 – 1930). Нарадзіўся ён у Каханавічах Дрысенскага павета, памёр 2 чэрвеня 1930 г. у Польшчы. Быў сынам Ігната Храпавіцкага – паэта, фалькларыста і грамадскага дзеяча[50].

Надрукаваны ў зборніку таксама ноты вальса і серэнады княгіні Ядвігі Хлюдзінскай. Яна паходзіць з заможнага шляхецкага роду лескавічскіх Хлюдзінскіх, была дачкой аднаго з уладальнікаў Лескавічаў Алаіза Хлюдзінскага і Марыі Солтан. Нарадзілася ў 1860 г. Выйшла замуж за італьянскага князя Фердынанда Альфонса de Liquori di Presicce. Жыла з ім у Венецыі, у 1895 г. нарадзіла дачку Марыю Асунту. Паколькі муж аказаўся сямейным тыранам, збегла ад яго з Венецыі ў свой маёнтак на Беларусі. З 1918 г. жыла з дачкой у Варшаве на вуліцы Мазавецкай. Памерла 26 ліпеня 1938 г. Яе дачка Марыя Асунта выйшла замуж за вядомага польскага мастака Антонія Уняхоўскага. У 1929 г. у іх нарадзілася дачка Крысціна, унучка Ядвігі – будучая пісьменніца. У 2004 г. у Варшаве ў выдавецтве “Czytelnik” выйшла кніга К. Уняхоўскай “Венецыянскі апокрыф”, у якой падрабязна апісваецца гісторыя жыцця яе бабулі і маці[51].



Канстанцін Змігродзкі

Ёсць у зборніку і невялікія інфармацыйныя нататкі пра мастакоў Прыдзвіння, а таксама рэпрадукцыі іх прац. Адным з самых актыўных і living...

Інфармацыя пра К.А. Змігродзкага ёсць у многіх беларускіх энцыклапедыях і кнігах



К. Змігродзкі. Голад. Скульптура.
Фота з альманаха “Z okolic Dźwiny”

па мастацтвазнаўству. Таму мы пералічым толькі асноўныя моманты з яго багатай біяграфіі. Нарадзіўся мастак у Рызе 2 сакавіка 1876 г. З ранняга дзяцінства выявіў вялікія здольнасці ў разьбе па дрэве. Пасля заканчэння Рыжскай гімназіі Канстанцін паступае ў мастацкае вучылішча барона Штыгліца ў Пецярбургу. Потым працягвае вучобу ў Кракаўскай акадэміі мастацтваў. Вучань знакамітага прафесара К. Ляшчкі, ён за тры гады вучобы зрабіў шэраг удалых прац – “Дзявяты вал”, “Казка”, “Станчык” і іншыя, якія прынеслі аўтару шырокую папулярнасць.

Скончыўшы акадэмію, Канстанцін Антонавіч некаторы час жыў у Парыжы, дзе наведваў майстэрні вядомых скульптараў Радэна і Бушэ. Пасля вяртання ў Пецярбург К. Змігродзкі адкрывае прыватную студыю, але справы ў ёй пайшлі дрэнна. У 1906 г. ён пераязджае ў Віцебск і займае пасаду настаўніка малявання і чарчэння ў камерцыйным вучылішчы Грэкава. Арганізуе пры сваёй майстэрні мастацкую школу.

Жывучы ў Віцебску, К. Змігродзкі займаўся краязнаўствам. Ён быў найбольш актыўным сябрам Віцебскай вучонай архіўнай камісіі (ВВАК), захавальнікам яе музея, куды перадаў калекцыю ўзораў кафлі. У 1911 г. падрыхтаваў “Каталог манет і медалёў Віцебскай вучонай архіўнай камісіі”, а праз год – “Каталог музея і архіва ВВАК”, вокладку якога сам аформіў. На адным з пасяджэнняў камісіі К. Змігродзкі выступіў з публічнай лекцыяй “Польскі ваенны флот”, тэкст якой у 1911 г. быў выдадзены асобнай брашурай.

Ва ўсіх беларускіх крыніцах сцвярджаецца, што мастак працаваў у Віцебску да 1914 г. У адным з польскіх перыядычных выданняў (“Wiadomości numizmatyczno-archeologiczne” за 1913 г.) у раздзеле “Хроніка” ёсць паведамленне аб тым, што ў жніўні 1913 г. К. Змігродзкі зацверджаны дырэктарам Польскага нацыянальнага музея ў Раперсвілі (Швейцарыя). Таму мы лічым, што мастак мог працаваць у Віцебску толькі да жніўня 1913 г.

У Раперсвілі К. Змігродзкі захапляецца новым для сябе відам мастацтва – медальерным. У 1917 – 1926 гг. ён вырабляе некалькі дзясяткаў медалёў у гонар Т. Касцюшкі, Я. Дамброўскага, Г. Сенкевіча, У. Рэйманта, У. Плятэра, 50-годдзя музея, у якім працаваў. К. Змігродзкі рабіў таксама медалі, прысвечаныя медыцынскім з’ездам, кангрэсам, сімпозіумам. У 1927 г. разам з музеем мастак вяртаецца ў Польшчу і працягвае працаваць у музеях[52].

Прадстаўлены ў зборніку інфармацыйная нататка і тры рэпрадукцыі прац яшчэ аднаго скульптара і кераміста – Вацлава Бубноўскага (1865 – 1945). Ён атрымаў вядомасць як майстар вытанчанай салоннай скульптуры, што ў свой час упрыгожвала асабнякі і палацы. Нарадзіўся Вацлаў Бубноўскі (Wacław Bębnowski) ў маёнтку Дубянец Полацкага павета (зараз Расонскі раён). У розных публікацыях сустракаюцца розныя варыянты яго прозвішча: Вацлаў Аляксандравіч Бубноўскі (бел.), Вацлаў Бэмбноўскі (бел.), Вацлаў Бямбноўскі (бел.), Вацлав Бебновский (рус.). Вучобу пачаў у Маскоўскім вучылішчы жывапісу, скульптуры і дойлідства. У 1888 г. з’ехаў у Кракаў у акадэмію мастацтва. З 1893 г. – у акадэміі мастацтваў у Мюнхене,



Баляслаў Тамашэвіч. Аўтапартрэт

потым стажыраваўся ў Парыжы ў акадэміі Каларосі.

У 1898 г. В. Бубноўскі на некаторы час пасяліўся ў Варшаве, дзе працаваў галоўным чынам над афармленнем касцёлаў. Вярнуўшыся на пачатку ХХ ст. у родныя мясціны, ён удзельнічаў у афармленні цэркваў і касцёлаў у Віцебску і Сянно. Тут ім было створана некалькі скульптур, у тым ліку скульптура Аляксандра Неўскага для Сенненскага сабора, а таксама некалькі арнаментальна-дэкаратыўных скульптур для цэркваў у Сенненскім павеце. Францысканскі касцёл у Сянно, які дзейнічаў да 1937 г., упрыгожвалі насценныя роспісы, зробленыя В. Бубноўскім.

У 1903 г. скульптар перабіраецца ў вёску Служава, што знаходзіцца на поўначы Польшчы ў Куяўскім ваяводстве, і працуе над аздабленнем касцёлаў. У 1905 г. В. Бубноўскі набывае зямельны надзел з садам і дом у Аляксандраве Куяўскім. У гэтым доме ён будзе жыць да канца свайго жыцця. Тут ён адкрыў сваю скульптурна-керамічную майстэрню і пачаў выпуск дэкаратыўных ваз і статуэтак у стылі мадэрн, бюстаў, фігурак звяроў, скульптур на літаратурныя тэмы для продажу. Яны разыходзіліся далёка, трапляючы нават у Берлін і Лондан. Мастак распрацоўвае ўласны спосаб паціравання керамікі і шырока карыстаецца ім. Ён выконвае шэраг партрэтаў у рэалістычнай манеры. У 1922 – 1930 гг. В. Бубноўскі працуе настаўнікам малявання ў Аляксандраўскай гуманітарнай гімназіі і ў сваёй майстэрні да пачатку Другой сусветнай вайны. Памёр мастак 26 мая 1945 г. і пахаваны на мясцовых парафіяльных могілках. Сёння самая шматлікая і разнастайная калекцыя яго прац знаходзіцца ў музеі Куяўскай і Добжынскай зямлі ў Влацлавеку, у прыватных калекцыянераў і сям’і мастака. У 2009 г. вышэй названы музей выдаў каталог прац В. Бубноўскага, у якім прадстаўлена 139 скульптурных форм, 40 карцін і малюнкаў, 55 шырокафарматных фотаздымкаў. Ёсць яго творы ў Нацыянальных музеях у Варшаве і Познані[53].

Жывапісец і ілюстратар Баляслаў Тамашэвіч (Bolesław Tomaszewicz, 1863 – 1918) нарадзіўся ў маёнтку Колунь (зараз Калупэ) Дзвінскага павета ў беднай сям’і. Дзяцінства і юнацтва будучага жывапісца прайшлі ў маёнтку Арэндоль ля Дзвінска. Нягледзячы на цяжкасці, ён усё ж скончыў Дзвінскае рэальнае вучылішча і ў 1883 г. паступіў вольным слухачом у Пецярбургскую акадэмію мастацтваў[54].

У пачатку 1890-х гг., ужо маючы званне мастака, ён вярнуўся ў маёнтак Арэндоль, стаў землеўласнікам і працягваў займацца мастацтвам. У складзе археалагічнай камісіі падарожнічаў па Беларусі і Украіне, неаднаразова бываў у Віцебску. Рабіў замалёўкі народнага побыту і адзення беларусаў. Малюнкі і акварэлі Б. Тамашэвіча змяшчаліся ў расійскіх і польскіх ілюстраваных часопісах, што выдаваліся ў Вільні і Пецярбургу. У часопісе “Край” ён, дарэчы, працаваў некаторы час у аддзеле ілюстрацый. Прымаў удзел у шматлікіх мастацкіх конкурсах. У 1896 г. пабываў у Крэве, у выніку чаго з’явілася серыя малюнкаў з адлюстраваннем замка і самога мястэчка. Якраз у гэты час рыхтавалася да выхаду кніга Чэслава Янкоўскага “Ашмянскі павет”. Малюнкі Б. Тамашэвіча былі ўзяты ў якасці ілюстрацый да кнігі.

Аднолькава паспяхова Б. Тамашэвіч працаваў у жанры пейзажа, пісаў партрэты і побытавыя кампазіцыі. Вялікае месца ў творах мастака займае адлюстраванне быту так званага “сярэдняга саслоўя” –



Б. Тамашэвіч. Выміраючы тып.
Рэпрадукцыя з альманаха “Z okolic Dźwiny”

заможных сялян, багатых рамеснікаў і гандляроў. Сярод яго вядомых твораў, якія называюцца ў энцыклапедыях і іншых крыніцах, “Сустрэча”, “Паляванне на качак”, “На канікулах”, “Не пушчу”, “Пасля абедні”, “Свавольнікі”, “Беларуска ў нацыянальным касцюме”[55]. У зборніку “З ваколіц Дзвіны” Б. Тамашэвіч аформіў тытульную вокладку, зрабіў партрэты віленскага біскупа Эдварда фон Ропа і кампазітара Ігнація Падэрэўскага. Ёсць тут кароткая нататка пра яго творчасць і аўтапартрэт 1909 г.

Цікавым графікам, майстрам станковага партрэта і гістарычных кампазіцый быў Тадэвуш (па расійскаму пашпарту Фадзей) Дмахоўскі (Tadeusz Dmochowski, 1856 – 1930). Нарадзіўся ён у Пінскім павеце Мінскай губерні. За ўдзел у паўстанні 1863 г. яго бацька быў сасланы ў Сібір. Неўзабаве памерла маці. Хлопец выхоўваўся ў бабулі ў Дзвінску. Пачатковую мастацкую адукацыю атрымаў у Варшаўскай малявальнай школе. Затым у 1873 – 1877 гг. вучыўся ў Пецярбургскай акадэміі мастацтваў. У Пецярбургу Т. Дмахоўскі выявіў вялікія здольнасці ў гістарычным і пейзажным жывапісе. З 1880 г. працягваў вучобу ў Кракаве, дзе блізка пазнаёміўся з колам Матэйкі і Герымскага, працаваў у тэхніцы вітража. Для касцёла св. Марыі ў Кракаве выканаў дзве вялікія кампазіцыі. Займаўся Т. Дмахоўскі і педагагічнай дзейнасцю. У 1907 г. выкла-даў арнаментыку ў Вышэйшай школе заахвочвання мастацтваў у Пецярбургу. Некаторы час працаваў выкладчыкам жывапісу і гісторыі мастацтваў у гімназіях Віцебска і іншых беларускіх гарадоў. З 1920 г. – выкладчык факультэта мастацтваў Віленскага ўніверсітэта.

Як піша ў нарысе пра мастака Ян Обст, Т. Дмахоўскі дасканала ведаў не толькі мастацтва, яго гісторыю, але практычна ўсе гуманітарныя навукі. Яго эрудыцыя была дзівоснай, прынцыпы непарушныя, а сэрца перапоўнена любоўю да роднага краю.

Пад уплывам Я. Матэйкі Т. Дмахоўскі захапіўся геральдыкай. Яму належыць серыя малюнкаў гербаў Полацка, Віцебска, Веліжа і іншых гарадоў для “Гербоўніка літоўскага”, якія публікаваліся ў пачатку XX ст. у віленскіх часопісах “Kwartalnik Litewski”, “Litwa i Ruś”. У зборніку “З ваколіц Дзвіны” мы можам бачыць зробленыя ім малюнкі гербаў і пячатак Віцебска, Полацка, Веліжа і некалькі рэпрадукцый іншых яго твораў.


Графічных твораў Т. Дмахоўскага захавалася няшмат. Акрамя малюнкаў гербаў у бібліятэцы Акадэміі навук Літвы знаходзяцца літаграфскія партрэты беларуска-літоўскіх князёў. Іх кампазіцыйная будова і малюнак дазваляюць меркаваць, што яны з’яўляюцца падрыхтоўчым матэрыялам для вялікіх гістарычных палотнаў. Па завершанасці і мастацкай выразнасці гэта, аднак, цалкам скончаныя мастацкія творы[56].

Гаворачы пра ілюстрацыі ў зборніку, неабходна адзначыць, што акрамя прац мастакоў тут былі змешчаны фотаздымкі амаль усіх яго аўтараў і некаторых іх герояў, былога Дынабургскага замка, манет крыжакоў, касцёлаў у Дагдзе і Сар’і. У раздзеле “Карты і планы” знаходзяцца шэсць планаў гарадскіх фартыфікацый часоў Стэфана Баторыя, план асады Полацка ў 1579 г., а таксама карта Полацкага ваяводства XVI ст.

Усё вышэй сказанае сведчыць аб тым, што надрукаваны больш за сотню гадоў таму на польскай мове зборнік “З ваколіц Дзвіны” раскрывае многія забытыя або



Т. Дмахоўскі. Герб Віцебска



Т. Дмахоўскі. Герб Полацка

малавядомыя старонкі нашай гісторыі і ўяўляе безумоўную цікавасць не толькі для прафесійных гісторыкаў і мастацтвазнаўцаў, але і шматлікіх краязнаўцаў Прыдзвінскага краю і прыгранічных раёнаў Латвіі. Усе аўтары зборніка хоць і ідэнтыфікавалі сябе з польскай нацыянальнасцю, пісалі пра гісторыю сваёй малой радзімы, дзяліліся сваімі мастацкімі і навуковымі напрацоўкамі. Гэтым самым яны ўносілі свой уклад у навуку і мастацкую культуру суверэнных зараз краін: Беларусі, Расіі, Польшчы, Літвы і Латвіі[57]. Таму няма нічога дзіўнага ў тым, што імёны многіх з іх можна сёння знайсці ў беларускіх, расійскіх, польскіх , літоўскіх і латвійскіх энцыклапедыях і навуковых публікацыях.

Літаратура і крыніцы:

1. *Мальдзіс А.* Галасы мінулага // Літаратура і мастацтва.1964. № 63. 7 жніўня. С. 4; *Матеюн А.* Листая страницы старого сборника: Интервью с исследователем сборника "Z okolic Dźwiny" Ф.И. Шкирандо // Витебские вести. 2015. № 99. 29 августа. С. 11.

2. *Параделов М.Я.* Адресная книга русских библиофилов и собирателей гравюр, литографий, лубков и прочих произведений печати. М., 1904. С. 124, 147.

3. *Тарасаў К.* Памяць пра легенды: Постаці беларускай мінуўшчыны. Мн., 1994. С. 219.

4. *Ajewski K.* Wacław Fedorowicz – zapomniany kolekcjoner z Witebska // Muzealnictwo. 2014. Nr. 55. S. 118 – 130.

5. Эл. рэсурс: Соколовские герба Корбут // www.forum.vgd.ru/1985/68844. Час доступу 12.03.2018.

6. *Narkowicz L.* Życie i spuścizna Jana Obsta.Wilno, 2001; *Narkowicz L.* Jan Konrad Obst – publicysta, wydawca, historyk (1876 – 1954). Bydgoszcz, 2004.

7. Федаровіч Вацлаў Пятровіч // *Півавар М.В.* Даследчыкі Полацка-Віцебскай даўніны XVI ст. – 1944 г.: Даведнік. Віцебск, 2006. С. 126 – 127; Асветнікі зямлі беларускай: X – пачатак XX ст.: Энцыклапедычны даведнік. Мінск, 2006. С. 446; Пусть память останется…: Сборник некрологов о жителях и уроженцах Витебска / сост. и вступ. статья А.М. Подлипского. Витебск, 2015. С. 14 – 16.

8. *Баршчэўскі Я.* Лісты. Пер. М. Хаўстовіч // *Баршчэўскі Я.* Выбраныя творы. Мн., 1998. С. 405 – 432; *Баршчэўскі Я.* Лісты да Юліі: Вершы, балады // У перакладзе А. Канапелькі. Віцебск, 2003. 34 с.; *Баршчэўскі Я.* Лісты да Юліі: Пісьмы, вершы, балады / Укладанне, пераклад з польскай мовы В.У. Таранеўскага. Літаратурная апрацоўка вершаў і балад А.М. Канапелькі. Віцебск, 2004. 111 с.; *Нікалаеў М.В.* Беларускі Пецярбург. СПб., 2009. С. 107 – 111.

9. *Мархель У.І.* Лучына Янка // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: У 5 т. Т. 3. Мн., 1986. С. 308 – 309; Беларускія пісьменнікі: Біябібліяграфічны слоўнік у 6 тамах. Т. 4. Мн., 1994. С. 113 – 114; Энциклопедия Республики Беларусь. Т. 4. Мн., 2007. С. 571.

10. *Шкирандо Ф.* Далеко уходят корни…(о творческой дружбе и переписке Я. Лучины с О. Чюминой) // Новгородская правда. 1984. № 110. 13 мая. С. 3; *Ziemkiewicz T.* Jan Niesłuchowski (Janka Łuczyna) i jego związki z Polską // W kręgu literatury białoruskiej. Olsztyn, 1994. S. 19; *Лыч Л., Навіцкі У.* Гісторыя культуры Беларусі. 2-е выд. дап. Мн., 1997, С. 192; Papiery różne ze zbiorów Aleksandra Walickiego z lat 1869 – 1892 // Biblioteka Narodowa w Warszawie, rękopis nr. 2981, k. 3 – 11.

11. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў. Ф. 733. Воп. 165. Спр. 201.

12. Эл. рэсурс: www.ipsb.nina.gov.pl/a/biografia/stanislaw-hlasko. Час доступу 12.04.2018; Polski Słownik Biograficzny. T. 9. S. 549.

13. Эл. рэсурс: www.forum.vgd.ru/post/1985/6888/p2353189/htm. Час доступу 17.04.2018.

14. Wanda Gizbert-Studnicka (nekrolog) // Nowiny Bialostockie. 30 marca 1924 r. Nr. 6; эл. рэсурс: www.mojecmentarze.blogpost.com.by/2016/03/wanda-studnicka-gizbert.html. Час доступу 18.04.2018.

15. Polski Słownik Biogragiczny. Z. 190. T. 46/3. Warszawa, 2010. S. 387; эл. рэсурс: www.eduteka.pl/doc/szadurska-stanislawa-pseud-s-stamar. Час доступу 19.06.2014; www.ryga.msz.gov.pl/pl/wspolpraca_dwustronna/kultura/literatura. Час доступу 19.06.2014.

16. Падрабязней пра К. Іллаковіч гл.: Віцебскі сшытак. 2017. № 5. С. 147 – 179.

17. Эл. рэсурс: www.sejm-wielki.pl/b/sw.3759. Час доступу 24.03.2018.

18. Encyklopedia Polski. T. 3. Kraków, 1996. S. 621.

19. *Слонский Э.* Та, что не погибла. Пер. А. Базилевского // Новая Польша. 2014. № 7 – 8. С. 64 – 65.

20. *Boniecki A.* Herbarz Polski. T. XI. Warszawa, 1907. S. 187; эл. рэсурс: www.baza.vgdru.com/1/16786. Час доступу 14.03.2018; *Aftanazy R.* Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej. T. 1. Województwa mińskie, połockie, witebskie. Warszawa - Kraków, 1991. S. 199 – 200.

21. *Дзевановский М.К.* Польский профессор из Петербурга // Новая Польша. 2004. № 10. С. 33 – 35; *Motyka K.* Uznany lecz nie znany. 50-lecie śmierci Leona Pietrażyckiego //Kultura. 1981. 24 maja. S. 6.

22. *Петражицкий Л.И.* // Социологическая энциклопедия / Под общ. ред. А.Н. Данилова. Мн., 2003. С. 529; Социология: Энциклопедия. Мн., 2003. С. 721; Асветнікі зямлі беларускай: X – пачатак XX ст. С. 327 – 328; Большая энциклопедия: В 62 томах. Т. 36. М., 2006. С. 309; *Нікалаеў М.В.* Беларускі Пецярбург. С. 186; Большая Российская энциклопедия. Т. 26. М., 2014. С. 90 і інш.

23. *Gieysztor A.* Dziejopisarstwo w Wilnie międzywojennym // Lithuania. 1994. Nr. 4. S. 59; *Tomczak A.* Mienicki Ryszard // Polski Słownik Biograficzny . T. 20. S. 801; *Каханоўскі Г.* Мяніцкі Р.В. // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі ў 6 тамах. Т. 5. Мн., 1999. С. 249; Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Т. 11. Мн., 2000. С. 73; *Півавар М.В.* Даследчыкі Полацка-Віцебскай даўніны XVI ст. – 1944 г. С. 88 – 89; *Хоронжичевский В.* Рышард Меницкий – исследователь белорусских архивов // *Хоронжичевский В., Деген Р.* Историческое наследие Беларуси: выявление, сохранение и изучение: материалы международной конференции (17 – 18 мая 2012 г.). В 2 ч. Ч. 2. Мн., 2013. С. 161 – 173.

24. *Melanowski W.H.* Profesor dr. med. Kazimierz Noiszewski //Medycyna Warszawska. R. 4. 1930. S. 471 – 473; *Ostrowska T.* Noiszewski Kazimierz // Polski Słownik Biograficzny. T. 23. S. 171 – 172; Незабытые могилы. Российское зарубежье: Некрологи 1917 – 1997: В 6 томах / Сост. В.Н. Чуваков и др. Т. 5. М., 2004. С. 165; *Волков В.В. и др.* К.И. Ноишевский и его вклад в офтальмоневрологию // Офтальмологические ведомости. 2009. Т. 2. № 3. С. 81 – 86.

25. Ś. p. Dr. Aleksander Ossendowski // Nowiny Lekarskie. 40 (1). 1928. S. 32.

26. *Літвіновіч А.* Мантойфель Г. // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі ў 6 тамах. Т. 5. Мн., 1999. С. 70; Manteuffel Hustaw // Polski Słownik Biograficzny . T. 19. S. 491 – 493; Мантойфель Густаў // *Півавар М.В.* Даследчыкі Полацка-Віцебскай даўніны XVI ст. – 1944 г. С. 80 – 81; эл. рэсурс: www.wiki-org.ru/Мантейфель_Густав_фон. Час доступу 27.04.2018.

27. *Garlicki A.* Historia 1815 – 1939. Polska i świat. Warszawa, 1998. S. 160 – 162.

28. Władysław Studnicki // Encyklopedia Polski. T. 3. Kraków, 1996. S. 650; Polski Słownik Biograficzny. T. 45. S. 125.

29. Wacław Studnicki // Polski Słownik Biograficzny. T. 45. S. 121 – 125; эл. рэсурс: https://pl.wikipedia.org/wiki/wiki/Waclaw_Studnicki. Час доступу 28.04.2018.

30. *Биович М.М.* Члены Государственной Думы (портреты и биографии). Первый созыв. М., 1906. С. 28; эл. рэсурс: https://ru.wikipedia.org/wiki/Шахно_Богдан_Брониславович. Час доступу 30.04.2018; www.grani.lv/daugavpils/54944-udiwitelnoe-ryadom.html. Час доступу 25.03.2018.

31. *Смалянчук А.Ф.* Роп (Ropp) Эдвард фон // Рэлігія і царква на Беларусі: Энцыклапедычны даведнік. Мн., 2001. С. 278.

